*Родная газета на роднай мове*

# ЗВЯЗДА

Б Е Л А Р У С К А Я   Г А З Е Т А

9 ЛІСТАПАДА 2007 г.
ПЯТНІЦА
№ 213 (26078)

Кошт 440 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

## Мінскі метрапалітэн «расце» хутчэй за іншыя ў СНД



Фота Вольгі ЛАСКІ.

*Дзяжурная па прыёме і адпраўцы цягнікоў на станцыі метро «Уручча» **Алена РАБЦАВА** сустракае за змену каля 600 саставаў і тысячы светлых усмешак задаволеных жыхароў усходняй мінскай ускраіны.*

**Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Генадзь Нявыглас адзначае дынамічнае развіццё эканомікі Беларусі. Аб гэтым ён сказаў 7 лістапада на цырымоніі адкрыцця новых станцый мінскага метрапалітэна «Уручча» і «Барысаўскі тракт».**

Цяпер агульная працягласць ліній метро складае 33 км з 25 станцыямі. Будаўніцтва метро ў Мінску было пачата 30 гадоў таму — 4 лістапада 1977 года. «У сярэднім штогод будавалася больш за адзін кіламетр. Такія тэмпы работ — самыя высокія сярод краін СНД, дзе будуюцца аналагічныя лініі метрапалітэна. Гэта красамоўнае сведчанне і вынік дынамічнага развіцця эканомікі краіны», — падкрэсліў Генадзь Нявыглас. У 2008 годзе пачнецца распрацоўка праекта будаўніцтва трэцяй лініі мінскага метро, якая злучыць Курасоўшчыну з Зялёным Лугам праз новы гарадскі раён Мінск-Сіці.

Плануецца таксама прадоўжыць першую лінію метро ў паўднёва-заходнім напрамку ад станцыі «Інстытут культуры» праз Грушаўку і Міхалова да Пятроўшчыны, а затым і да Малінаўкі. Арыенціровачны тэрмін завяршэння будаўніцтва — 2011 год. У перспектыве Мінскі метрапалітэн будзе складацца з чатырох ліній агульнай працягласцю 77 км з 58 станцыямі.

Удзельная вага метрапалітэна ў перавозках пасажыраў гарадскімі відамі транспарту складае больш за 35 працэнтаў. Сярэднетэхнічная скорасць руху электрапаяздоў на лініях Мінскага метрапалітэна складае 49,8 км/гадз і з'яўляецца найбольш высокай сярод метрапалітэнаў краін СНД.

**БЕЛТА.**

## У Беларусі адзін з самых нізкіх узроўняў інфляцыі

У Беларусі ў студзені—верасні гэтага года зафіксаваны адзін з самых нізкіх узроўняў інфляцыі ў СНД. На першым месцы па гэтаму паказчыку знаходзілася Арменія, дзе зафіксавана дэфляцыя ў памеры 0,2 працэнта. Беларусь з узроўнем інфляцыі 5,4 працэнта заняла другое месца. Далей ідуць Грузія — 6,2 працэнта, Расія — 7,5 працэнта, Казахстан і Украіна — па 8,6 працэнта, Малдова — 9 працэнтаў, Кыргызстан — 10,3 працэнта і Азербайджан — 11 працэнтаў. **БЕЛТА.**

## Вучоныя Беларусі і Расіі ўпершыню ў СНД ужывілі ген чалавека ў ДНК коз і атрымалі трансгенных казлянят

Аб гэтым паведаміў у размове з карэспандэнтам БЕЛТА навуковы кіраўнік беларускай часткі сумеснай беларуска-расійскай праграмы «БелРасТрансген», загадчык лабараторыі аднаўлення і геннай інжынерыі сельскагаспадарчых жывёл Навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па жывёлагадоўлі Аляксандр Будзевіч. Гэта істотны прарыў у сусветнай геннай інжынерыі.

**Увага: «Прамыя лініі»!**

### ТРАДЫЦЫІ І СУЧАСНАСЦЬ

Забытае... Новае... Вечнае... Колькі сакрэтаў захоўвае ў сабе мінулае! Як дзіўна ўплятаюцца ў сучаснасць сімвалы нашых продкаў. Далёка не кожнаму дадзена разгадаць, што нясуць у сабе гэтыя пасланні... Але ў хуткім часе ў чытачоў «Звязды» з'явіцца такая магчымасць. На ўсе вашы пытанні, якія датычацца ролі і месца народных традыцый у сённяшнім жыцці, а таксама некаторых аспектаў народнай медыцыны, адкажуць падчас «Прамой лініі» нашы пастаянныя аўтары **загадчык кафедры этналогіі і фальклору Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў кандыдат філалагічных навук Іван Іванавіч КРУК і старшы выкладчык гэтай жа кафедры Аксана Веніямінаўна КАТОВІЧ.**

Як лепш справіць вяселле? Якія правілы існуюць у дачыненні да правядзення хрэсьбін? Як не парушыць рэгламентацыю пахавання і памінання? Як правільна арганізаваць улазіны? Як адзначыць свята ў адпаведнасці з народным календаром? На гэтыя і іншыя пытанні вы зможаце атрымаць адказы, калі патэлефануеце на нашу «Прамую лінію» **21 лістапада з 12.00 да 14.00 па нумарах: 292 38 92, 292 38 21. (Кантактны тэлефон для папярэдніх званкоў — 292 21 03.)**

### РАЗАМ «РАЗРУЛІМ» ПРАБЛЕМЫ НА СТАЛІЧНЫХ ВУЛІЦАХ

Для айчынных аўтааматараў ужо пачаўся зімовы перыяд. Дні сталі карацейшымі, ночы цямнейшымі, дарогі слізкімі і непрадказальнымі. Пешаходам зіма таксама падрыхтавала шмат дадатковых праблем. Так што ўдзельнікам дарожнага руху трэба праявіць асаблівую асцярожнасць і абачлівасць. А сталічным кіроўцам транспартных сродкаў і пешаходам небходна быць яшчэ больш пільнымі. Бо мінскі аўтапарк самы вялікі ў краіне, а інтэнсіўнасць руху па магістралях галоўнага горада краіны значна большая, чым у правінцыі. Зрэшты, бяспеку на сталічных вуліцах нельга забяспечыць не вырашыўшы іншых, тыповых для мегаполіса праблем: недахоп паркавачных месцаў, стаянак і гаражоў, заторы на дарогах, нізкі ўзровень культуры кіроўцаў і г.д. «Разруліць» ці хоць бы абазначыць некаторыя з памянёных праблем чытачы «Звязды» змогуць **13 лістапада.** У гэты дзень, **з 15 да 16 гадзін** адбудзецца «Прамая лінія» з начальнікам упраўлення Дзяржаўтаінспекцыі ГУУС Мінгарвыканкама **Васілём Васільевічам БУЛЬБЯНКОВЫМ.** Кантактныя тэлефоны ў Мінску: **292 38 92, 292 38 21.** Папярэдне пытанні можна задаваць па тэлефоне **287 18 72.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА

# «МЫ ВЫЙГРАЕМ ГЭТЫ РАЎНД...»

*Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка павіншаваў калектыў адкрытага акцыянернага таварыства «Амкадор» з 80-годдзем з дня заснавання прадпрыемства.*

*Сёння ААТ «Амкадор» выпрабляе каля 90 мадэляў машын і абсталявання практычна для ўсіх галін эканомікі, пастаянна стварае і ўдасканальвае іх мадыфікацыі. Кіраўнік дзяржавы выказаў упэўненасць, што эфектыўнае выкарыстанне прадпрыемствам існуючага патэнцыялу, назапашанага вопыту і сучасных тэхналогій будзе садзейнічаць нарошчванню вытворчасці канкурэнтаздольных машын, пашырэнню ўзаемавыгадных сувязяў з партнёрамі з блізкага і далёкага замежжа, умацаванню становішча нашай краіны на міжнародных рынках.*

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

Так сказаў падчас прэс-канферэнцыі, наладжанай з нагоды 80-годдзя ААТ «Амкадор» (дакладней, 80-годдзе адзначыў яго галаўны завод «Ударнік»), старшыня Савета дырэктараў таварыства Аляксандр Шакуцін. Пры гэтым мелася на ўвазе канкурэнтная барацьба, якую адчувае «Амкадор» з боку іншых вытворцаў тэхнікі, аналагічнай той, што выпрабляецца на яго прадпрыемствах.

«Амкадор» асабліва прадстаўляць не трэба. Гэта марка добра вядомая не толькі ў нашай краіне. Больш чым у 30 краін экспартуецца яго тэхніка, у прыватнасці ў Лівію, Індыю, Непал, Ірак і іншыя краіны. Яна хутка з'явіцца ў Венесуэле; актыўна намацваюцца шляхі ў Парагвай, Балівію і Аргенціну, Малайзію і В'етнам, краіны Афрыкі. Збіраюцца таксама на «Амкадоры» «ўвайсці» ў Еўропу. Прычым варта зазначыць: дзве мадэлі амкадораўскіх машын ужо сертыфікаваны ў Еўропе.

Нагадаем, «Амкадор» выпускае шырокую гаму тэхнікі для розных галін народнай гаспадаркі: дарожныя машыны, пагрузчыкі, аэрадромапрыбіральныя машыны і інш. Усяго ў яго асартыментным шэрагу налічваецца звыш 80 мадэляў і мадыфікацый рознай тэхнікі. А было, нагадаў Аляксандр Шакуцін, калі «Амкадор» стаяў на мяжы банкрутства. У гэтым годзе на ім плануюць выпусціць прадукцыі на суму каля 200 мільёнаў долараў, а к 2010 году намячаюць выйсці на аб'ёмы ў паўмільярда долараў, або павялічыць іх у 2,2 раза, мець за гэту пяцігодку 50 наваствораных машын.

А яшчэ ў планах «Амкадора» — праз 2—3 гады выйсці поўнасцю на сусветны ўзровень па якасных параметрах тэхнікі. Хоць ужо цяпер яна практычна не ўступае замежным аналагам. На прадпрыемстве прыводзяць наступны прыклад: не так даўно ў Калінінградзе было наладжана свайго роду спаборніцтва паміж 6-тонным пагрузчыкам «Камацу» і амкадораўскім 5-тоннікам. Нягледзячы на розніцу ў грузападымальнасці, толькі на адну секунду «адсталі»... На вышэйназваную задачу тут цяпер, па сутнасці, і працуюць. На «Амкадор» прыходзяць найноўшыя тэхналогіі, сучаснае дарагое абсталяванне. Каб лепш уявіць, да чаго імкнецца «Амкадор» і што ён ужо мае ў сваім актыве, прывядзём яшчэ наступны цікавы прыклад: у адным з абноўленых металаапрацоўчых цэхаў «Ударніка» побач з яго суперсучаснымі станкамі стаіць звычайны пыласос. Апошні не дзеля экзотыкі, а для выкарыстання па прамым прызначэнні. Адпаведна, чысціня ў цэху — неверагодная. Нагадаем, гэта ў «бруднай» металаапрацоўчай вытворчасці.

На «Амкадоры» многае зрабілі і робяць, каб дабіцца выключнай якасці сваёй тэхнікі, прычым рашуча адмаўляюцца ад тых партнёраў, якія шлюць недабраякасныя дэталі і камплектуючыя. Напрыклад, так паступілі з тымі, хто пастаўляў шасцерні, — адпаведна, наладзілі сваю ўласную вытворчасць. Увогуле, на «Амкадоры» больш за 60 працэнтаў камплектуючых да сваёй тэхнікі выпрабляюць менавіта самі. Тут пры гэтым вызначылі: кабіны для яго тэхнікі, масты, каробкі перамены перадач і гідраэлементы павінны быць абавязкова амкадораўскімі і абавязкова адпавядаць па сваіх якасных параметрах сусветнаму ўзроўню... «Наша задача — стварэнне вытворчасці сусветнага ўзроўню», — так і заявіў падчас прэс-канферэнцыі Аляксандр Шакуцін. Гэта адзін з прыярытэтаў, якія вызначылі на «Амкадоры». Варта дадаць: сярод гэтых прыярытэтаў і задача па стварэнні высокапрафесійнага калектыву, чаго патрабуюць тыя ж сучасныя тэхналогіі.

Сярод прыярытэтных задач «Амкадора» стаіць і задача, якую можна агучыць так: быць бліжэй да спажыўца. Гэта азначае паўсюднае наладжванне (там, дзе эксплуатуецца тэхніка «Амкадора») тэхнічных цэнтраў па сэрвісе, гарантыйным і постгарантыйным рамонце тэхнікі, складоў запасных частак і г.д.

А цяпер прадставім апошнія і перспектыўныя распрацоўкі «Амкадора». Гэта шматфункцыянальныя машыны з гамай (да 40 відаў) хутказменных рабочых органаў, гэта таксама лесанарыхтоўчыя машыны хорвестары і форвардары, цягачы тралёвачныя і здрабняльнікі шчэпкі, міні-пагрузчык з бакавым паваротам, прызначаны для работы ў абмежаванай прасторы... На прадпрыемстве ствараюцца пагрузчык-экскаватар, пагрузчык з 12-метровай тэлескапічнай стралой (такі ж пагрузчык, але з 7-метровай стралой ужо ёсць) і іншыя перспектыўныя віды сучаснай тэхнікі. Тут ставяць перад сабой задачу штогод ствараць не менш за 8—10 відаў новай тэхнікі. Падкрэслім пры гэтым: амаль уся амкадораўская тэхніка базіруецца на ўласным шасі; на яе стварэнне тут працуюць каля 200 чалавек.

І ў заключэнне яшчэ адно пытанне, якое нельга абысці. Галоўное прадпрыемства «Амкадора» — завод «Ударнік» — знаходзіцца практычна ў цэнтры горада. Ці пагражае яму перанос, наконт чаго часам можна пачуць?

— Гэта было б вар'яцтвам. Гэта былі б неапраўданыя незлічоныя затраты. Гэта азначала б, што мы страцілі б тое прадпрыемства, якое цяпер маем. Галоўнае ж у гэтай справе, каб усё ў парадку было з экалогіяй... Я — беларус, нарадзіўся тут, і для мяне ўсё гэта зусім не абыякава, — адказаў на адпаведнае пытанне Аляксандр Шакуцін.

**Іван БАРАНОЎСКІ.**

## У Беларусі базавая велічыня з 1 снежня складзе Br35 тыс.

**Урад Беларусі ўстанавіў базавую велічыню ў памеры Br35 тыс. Такое рашэнне змяшчаецца ў пастанове Савета Міністраў № 1446 ад 2 лістапада гэтага года. Яно ўступае ў сілу з першага чысла месяца, які ідзе за месяцам афіцыйнага апублікавання.**

Як паведамілі карэспандэнту БЕЛТА у Апараце Саўміна, згодна з гэтай пастановай у 1,13 раза павялічваюцца назначаныя ў адпаведнасці з заканадаўствам дапамогі па беспрацоўю і стыпендыі грамадзянам, якія праходзяць прафесійнае навучанне па накіраванню органаў дзяржаўнай службы занятасці. Да Br9 тыс. 870 узрастае памер штомесячнай грашовай кампенсацыі гэтым катэгорыям грамадзян.

Выключэнне па вышэй названых дзвюх пазіцыях складаюць дзяржаўныя служачыя, звольненыя ў сувязі з ліквідацыяй дзяржаўнага органа або скарачэннем штатаў.

Нагадаем, з 1 сакавіка мінулага года памер базавай велічыні складае Br31 тыс.

## РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### НАЧНОЕ ТАБУ НА СПІРТНОЕ

**Зусім верагодна, што ў Беларусі ўвогуле будзе забаронены продаж спіртных напояў у начны час.**

Як паведаміў журналістам начальнік упраўлення прафілактыкі МУС краіны Мікалай Дрозд, на разгляд парламента ўнесены адмысловы законапраект. Ён прадугледжвае шэраг дапаўненняў і змяненняў у Адміністрацыйны кодэкс. У прыватнасці, калі ініцыятыва Міністэрства ўнутраных спраў будзе адобрана дэпутатамі і Прэзідэнтам, то, напрыклад, спіртныя напоі любой якасці і кошту будзе забаронена прадаваць у крамах у перыяд з 22 да 9 гадзін. Зараз табу на продаж спіртнога ў начны час датычыць толькі танных алкагольных вырабаў, рэалізацыя дарагіх напояў не забаронена.

Апроч таго, МУС прапануе ўвесці адміністрацыйную адказнасць за ўжыванне алкагольных напояў на рабочым месцы, а таксама за знаходжанне на працы ў нецвярозым стане.

Прадстаўнік МУС патлумачыў, што чарговае наступленне на п'янства абумоўлена не толькі імкненнем палепшыць крымінагенную сітуацыю. Алкагалізацыя ідзе такімі імклівымі тэмпамі, што нясе ўсё больш рэальную пагрозу жыццю і здароўю аматараў спіртнога. Паводле слоў Мікалая Дразда, за апошнія 5 гадоў 14 тысяч нашых суграмадзян памерлі ў выніку атручвання няякаснымі спіртнымі напоямі. У палоне алкагалізму зараз знаходзяцца дзесяткі тысяч беларусаў. Напрыклад, у пераліку на абсалютны алкаголь продаж спіртных напояў у нашай краіне складае 10,59 літра на душу насельніцтва. Гэта ўжо на 2,59 літра больш за вызначаны Сусветнай арганізацыяй аховы здароўя крытычны парог, за якім пачынаюцца працэсы дэградацыі асобы.

**Мікола ДЗЯБЁЛА.**

### ТЭНДАРНЫЯ АФЕРЫ АФІЦЭРА

**Да 7 гадоў пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці асуджаны былы начальнік службы артылерыйскага ўзбраення Галоўнага ўпраўлення камандуючага ўнутранымі войскамі МУС Беларусі.**

Паводле звестак Беларускай вайсковай пракуратуры, летам і восенню мінулага года падпалкоўнік (цяпер ужо былы) за хабар у памеры 250 долараў і 130 тысяч расійскіх рублёў здзейсніў некалькі тэндарных афер. У прыватнасці, як высветліла следства, напачатку, каб адмяніць тэндарны гандаль, ён унёс ілжывыя звесткі ў адмысловыя дакументы. Потым падпалкоўнік увогуле выключыў са спіса шэраг прэтэндэнтаў на ўдзел у тэндары. У выніку выгадныя заказы на пастаўку спецыяльнай маёмасці для патрэб унутраных войскаў агульным коштам больш за паўмільярда рублёў атрымаў менавіта той дырэктар фірмы, які задобрыў афіцэра хабарам.

Але гэта не ўсе грахі вайскоўца. Ён яшчэ прызнаны вінаватым у крадзяжы і незаконным захоўванні боепрыпасаў. Паводле звестак вайсковай пракуратуры, у лістападзе мінулага года афіцэр, які, дарэчы, уваходзіў у склад спартыўнай каманды па кулявой стральбе, украў падчас трэніровак 16 патронаў да пісталета Макарава. Боепрыпасы знайшлі ў ягоным службовым сейфе.

**Мікола ДЗЯБЁЛА.**

### ТАЛАКА ДЗЕЛЯ ПРЫГОЖЫХ ЗУБОЎ

**У Глускім раёне прайшоў суботнік на карысць зубапратэзнай стаматалогіі.**

Паводле інфармацыі з Глускага райвыканкама, удалося зарабіць каля 18 мільёнаў рублёў. Напрыклад, на аднаго працаўніка арганізацыі пералічваюць 10 тысяч рублёў. Зробленыя грошы будуць выдаткаваны на закуп новага абсталявання для зубапратэзнай лабараторыі. Глусчане расказваюць, што там цяпер выкарыстоўваюцца старыя методыкі, хоць спецыялісты ў райцэнтры ёсць і яны хочуць працаваць так, каб задаволіць патрэбы сваіх пацыентаў. Але апошнім часам паслугамі мясцовай зубапратэзнай стаматалогіі найбольш карыстаюцца састарэлыя людзі, а моладзь ездзіць па «галівудскую» ўсмешку ў суседнія Бабруйск і Любань. Таму ў суботніку жыхары Глусчыны бралі ўдзел без аніякіх пярэчанняў, бо ўсе яны будуць карыстацца агульным дабром.

**Ілона ІВАНОВА.**

В извещении о проведении открытого аукциона по продаже зданий, расположенных: г. Слуцк, ул. Богдановича, 13 в/г, опубликованном в газете «Звязда» от 27.10.2007 г., **вместо слов «аукцион состоится 27.11.2007 г. в 15.00» читать «аукцион состоится 28.11.2007 г. в 12.00».**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### СААКАШВІЛІ ПЕРАНОСІЦЬ ВЫБАРЫ ПРЭЗІДЭНТА З ВОСЕНІ НА 5 СТУДЗЕНЯ 2008 ГОДА



**Прэзідэнт Грузіі Міхаіл Саакашвілі выступіў учора вечарам з тэлезваротам да насельніцтва краіны — першым пасля разгону мітынгу і ўвядзення надзвычайнага становішча ў краіне. Саакашвілі паведаміў аб пераносе прэзідэнцкіх выбараў на 5 студзеня 2008 года.**

«Я добраахвотна ўжо другі раз іду на скарачэнне свайго прэзідэнцкага тэрміну і раблю гэта таму, што лічу Грузію дэмакратычнай краінай», — заявіў Саакашвілі. Паводле яго слоў, ён «дае шанц апазіцыі даказаць сваю сілу». Адначасова з прэзідэнцкімі выбарамі Саакашвілі прапанаваў правесці плебісцыт аб тэрміне парламенцкіх выбараў.

Нагадаем, у ноч з серады на чацвер прэзідэнт Грузіі Міхаіл Саакашвілі падпісаў указ аб увядзенні на 15 сутак Надзвычайнага становішча. У адпаведнасці з ім у краіне ўведзены абмежаванні на правядзенне вулічных акцый, забастовак і распаўсюджванне інфармацыі па тэлебачанні і радыё. Выключэнне зроблена для Грамадскага тэлебачання Грузіі. Каменданцкая гадзіна не ўводзіцца. На працягу 48 гадзін указ прэзідэнта павінен зацвердзіць лаяльны Саакашвілі парламент Грузіі, пры гэтым указ дзейнічае з моманту падпісання.

Заяве ўладаў папярэднічала цэлая хваля здарэнняў у сталіцы Грузіі: спецназ МУС двойчы ў сераду жорстка — з выкарыстаннем слёзацечнага газу, вадамётаў і гумавых куляў — разагнаў мітынг апазіцыі, які доўжыўся шосты дзень. Вынік МУС абнародавала толькі ўчора: у сераду былі затрыманыя 32 чалавекі, па медыцынскую дапамогу звярнуліся 589 чалавек. Сярод пацярпелых — да 30 супрацоўнікаў праваахоўных органаў.

### РАСІЯ ЗАМАРОЗІЛА ДОВСЕ

**Дзяржаўная Дума РФ падтрымала ўнесены прэзідэнтам Расіі законапраект аб увядзенні мараторыя на ўдзел Расіі ў Дагаворы аб звычайных узброеных сілах у Еўропе.**

Мараторый, які ўступіць у сілу ў ноч з 12 на 13 снежня, не азначае беспаваротнага выхаду Расіі з дагавора, але замарожвае яго дзеянні на тэрыторыі РФ, здымаючы абмежаванні на размяшчэнне і рух войскаў па еўрапейскай тэрыторыі краіны і адмяняючы інспекцыйныя візіты заходніх ваенных назіральнікаў.

Паводле слоў начальніка Генеральнага штаба Узброеных сілаў Расіі Юрыя Балуеўскага, устаноўленыя ДОВСЕ абмежаванні з'яўляюцца дыскрымінацыйнымі і падрываюць абараназдольнасць краіны. У той жа час дагавор не перашкаджае прасоўванню НАТА на ўсход, рэканфігурацыі амерыканскай ваеннай прысутнасці ў Еўропе.

### ФІН УЧЫНІЎ БОЙНЮ Ў ШКОЛЕ

**18-гадовы злачынца, які ўчыніў стральбу ў школе фінскага горада Туусула, памёр у ноч на чацвер.**

У сераду вечарам былы вучань школы пранік на яе тэрыторыю і адкрыў стральбу з пісталета, забіўшы пяцярых юнакоў, дзвюх дзяўчат і выкладчыцу. Яшчэ адзін навучэнец быў паранены, дзесяткі атрымалі розныя траўмы. Пасля расстрэлу людзей злачынца намагаўся скончыць жыццё самагубствам — стрэліў сабе ў галаву. Нягледзячы на цяжкае раненне, ён пражыў яшчэ некалькі гадзін.

### ДЗЯЎЧЫНЦЫ З ЧАТЫРМА РУКАМІ І НАГАМІ ЗРАБІЛІ АПЕРАЦЫЮ

**Двухгадовая індыянка Лакшмі Татма, якая нарадзілася з чатырма рукамі, чатырма нагамі і дадатковай парай нырак, была паспяхова праапераравана ў Бангалоры.**

Аперацыя, у якой бралі ўдзел 36 урачоў, доўжылася 27 гадзін. Ні на адным з этапаў аперацыі праблем не ўзнікла. Лакшмі, названую так у гонар багіні шчасця, багацця і прыгажосці, жыхары яе роднай вёскі лічаць рэінкарнацыяй бажаства.

## Алею ў гандлёвую сетку налета паставяць больш на 40 працэнтаў

**Адпаведнае рашэнне змешчана ў пастанове Савета Міністраў № 1409 «Аб некаторых пытаннях паставак асобных тавараў у 2008 годзе», паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў Міністэрстве эканомікі.**

Усяго ў пералік тавараў для пастаўкі ў гандлёвую сетку ў 2008 годзе ўключана 41 таварная пазіцыя, з іх 12 — па харчовых таварах і 29 — па нехарчовых. Так, гандлёвыя арганізацыі Беларусі ў наступным годзе павінны павялічыць у параўнанні з аб'ёмамі, устаноўленымі на 2007 год, закупкі мукі на 5,9 працэнта да 90 тыс. тон, сажалкавай рыбы — на 33,3 працэнта, мучных кандытарскіх вырабаў — на 15,8 працэнта.

З нехарчовых тавараў у 2,3 раза вырастуць аб'ёмы мінімальных паставак пральных машын, на 7,9 працэнта — бытавых халадзільнікаў і маразільнікаў. Павялічацца таксама пастаўкі гандлёвым арганізацыям абутку, трыкатажных вырабаў і некаторых іншых тавараў.

Аб'ёмы паставак прадукцыі ў гандлёвую сетку рэспублікі вызначаюцца ў мэтах насычэння ўнутранага рынку.

## Візы ў ФРГ

**Візавы аддзел пасольства ФРГ у Беларусі не будзе прымаць наведвальнікаў з 24 снежня 2007 года па 1 студзеня 2008 года. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведамілі ў дыпламатычнай місіі Германіі ў Мінску.**

У пасольстве адзначылі, што павялічваецца колькасць выдадзеных беларусам віз, што сведчыць аб нарошчванні ўзаемадзеяння паміж Беларуссю і Германіяй. Тавараабарот Беларусі і Германіі за 8 месяцаў гэтага года склаў $1,774 млрд і ўзрос у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года на 18,9 працэнта.

## Заданні па закладцы прадуктаў харчавання ў стабілізацыйныя фонды перавыкананы

У Беларусі, згодна з зацверджаным урадам графікам, закладка харчовых рэсурсаў у стабілізацыйныя фонды на міжсезонны перыяд павінна быць завершана да 15 лістапада. Аднак многія рэгіёны рэспублікі па шэрагу пазіцый ужо істотна перавыканалі ўстаноўленыя заданні — па бульбе, бураках, рэпчатай цыбулі, садавіне, сметанковаму маслу, сычужных цвёрдых сырах, ялавічыне. Аб гэтым паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ва ўпраўленні арганізацыі спажывецкага рынку харчовых тавараў Міністэрства гандлю.

Па стану на 5 лістапада ў сховішчы рэспублікі на зіму закладзена больш як 60,6 тыс. тон бульбы, што на 10 працэнтаў больш за заданне. У поўным аб'ёме выкананы план па закладцы гародніны — 56,2 тыс. тон, або на 1 працэнт больш. У тым ліку прынята на зімовае захоўванне 10,2 тыс. тон буракоў, амаль 11 тыс. тон рэпчатай цыбулі, 5 тыс. тон садавіны, што адпаведна на 2 працэнты, 8 працэнтаў і 14 працэнтаў больш, чым прадугледжвалася. Завершана закладка морквы і белакачаннай капусты — у стабілізацыйныя фонды пастаўлена адпаведна 13 тыс. тон і 22,9 тыс. тон. У цэлым па Беларусі на 3 працэнты больш, чым планавалася, закладзена на зімовае захоўванне сметанковага масла, на 10 працэнтаў перавыканана заданне па сычужных сырах, на 7 працэнтаў — па ялавічыне. Не ў поўным аб'ёме нарыхтавана толькі сухое малако мінскімі гармалзаводамі. Пры плане 3,8 тыс. тон яго закладзена на 5 лістапада каля 2 тыс. тон, што складае 45 працэнтаў. За апошні тыдзень пастаўкі сухога малака з рэгіёнаў рэспублікі ў беларускую сталіцу актывізаваліся, таму ёсць упэўненасць, што запланаваны аб'ём да 15 лістапада будзе выкананы.

В извещение о проведении аукциона по продаже земельного участка общей площадью 0,2499 га для индивидуального жилищного строительства в д. Бровки Минского района, опубликованное 02.11.2007 г. в газете «Звязда», **вносятся изменения: аукцион состоится 27.11.2007 г. и документы принимаются по 26.11.2007 г.**

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже обращенных в доход государства объектов недвижимости, расположенных по адресу: г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 36, в том числе: ЛОТ № 1 — ангар для лесопиления (общ. пл. 442,8 кв.м). Нач. цена 86 432 775 бел. руб. ЛОТ № 2 — здание прирельсового склада (общ. пл. 424,3 кв.м). Нач. цена снижена на 10 % и составляет 91 741 221 бел. руб. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 29.09.2007 г. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится 27.11.2007 г. в 15.00 по адресу: г. Борисов, ул. Чапаева, 6, к. 215. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 26.11.2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

**Контактные телефоны (8017) 224 61 34, (80177) 73 93 27. Сайт в Интернете: www.rlt.by**

**ООО «ЮНиР инвест» (продавец) совместно с УП «Минский городской центр недвижимости» (организатор аукциона)**

**ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

**по продаже административных помещений двухэтажной пристройки к жилому дому № 59 на улице Шпилевского в городе Минске.**

***Лот № 1:***

- изолированное помещение (инвентарный номер — 500/D-7055559), площадь — 6,8 кв. м, назначение — помещение неустановленного назначения;
- изолированное помещение (инвентарный номер — 500/D-7055442), площадь — 262,7 кв. м, назначение — административное помещение;
- изолированное помещение (инвентарный номер — 500/D-7055443), площадь — 115,7 кв. м, назначение — административное помещение;
- изолированное помещение (инвентарный номер — 500/D-7055444), площадь — 139,6 кв. м, назначение — административное помещение;
- изолированное помещение (инвентарный номер — 500/D-7055445), площадь — 135,1 кв. м, назначение — административное помещение;
- изолированное помещение (инвентарный номер — 500/D-7055446), площадь — 127,6 кв. м, назначение — административное помещение;

*Начальная цена лота — 3 162 699 153 белорусских рубля без учета НДС.*

Земельный участок площадью 0.4134 га предоставлен во временное пользование для строительства 16-этажного 1-секционного 126-квартирного жилого дома с техподпольем, техническим чердаком, встроенными помещениями товарищества собственников на 1-м этаже и надстроенными помещениями творческих мастерских № 17 (по генплану) с пристроенными с двух сторон симметричными двухэтажными блоками административных помещений (в осях «1-2» «5-6»).

Задаток в размере 99 миллионов белорусских рублей перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «Белпромстройбанк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583. Договор купли-продажи между продавцом и покупателем заключается в течение 5 рабочих дней с даты проведения аукциона. Оплата объекта осуществляется в следующем порядке: 35 процентов от цены продажи объекта с учетом НДС перечисляются в срок до 26.12.2007, 65 процентов от цены продажи объекта с учетом НДС оплачиваются в течение 3 (трех) месяцев с момента подписания договора купли-продажи лота. Аукцион состоится 11 декабря 2007 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Заявление на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по 10 декабря 2007 года до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефон для справок: 227 48 36 — УП «Минский городской центр недвижимости»; 655 44 70 (Velcom), 855 44 70 (МТС) — ООО «ЮНиР инвест».**

**КУРСЫ ВАЛЮТ**

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 9.11.2007 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 152,00 |
| 1 еўра | 3 154,72 |
| 1 латвійскі лат | 4 495,51 |
| 1 літоўскі літ | 913,53 |
| 1 чэшская крона | 117,29 |
| 1 польскі злоты | 865,70 |
| 1 расійскі рубель | 87,90 |
| 1 украінская грыўня | 427,39 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

Цэнтрабанк РФ

| | |
|---|---|
| USD | 24,4830 |
| 10 UAH | 48,3491 |
| 1000 BYR | 11,3676 |
| EUR | 35,8798 |

*Курс у гандлёвых кампаніях (на 8.11.2007 г.)*

| | |
|---|---|
| USD | 2135 / 2210 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

*Падпісвайцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2007 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

ISSN 1990 - 763X

07213>

## Беларусь і Іркуцкая вобласць прапрацоўваюць пытанні супрацоўніцтва ў абаронна-тэхнічнай прамысловасці

**Пытанні супрацоўніцтва Беларусі і Іркуцкай вобласці ў абаронна-тэхнічнай прамысловасці разгледжаны 7 лістапада на сустрэчы прэм'ер-міністра Беларусі Сяргея Сідорскага і губернатара Іркуцкай вобласці Расіі Аляксандра Цішаніна.**

Паводле слоў Сяргея Сідорскага, Беларусь захавала сваю абаронна-тэхнічную прамысловасць, і гэты сектар паспяхова развіваецца. «Мы канкурыруем як на постсавецкай прасторы па вытворчасці асобных блокаў і вузлоў, спецыяльнай тэхнікі, так і пастаўляем прадукцыю на экспарт па тэматыцы спецыяльнага прызначэння», — адзначыў прэм'ер-міністр.

Кіраўнік беларускага ўрада наведаў ААТ «Навукова-вытворчая карпарацыя «Іркут», дзе азнаёміўся з тэхналогіяй вытворчасці самалётаў розных мадыфікацый. «У Беларусі мадэрнізуюцца сістэмы самалётаў СУ. Асаблівыя поспехі дасягнуты ў галіне высокатэхнічнай мадэрнізацыі сістэм начнога бою», — падкрэсліў Сяргей Сідорскі.

Беларускі бок прапанаваў Іркуцкай вобласці павялічыць пастаўкі спецыяльнай тэхнікі для патрэб лесапрамысловага комплексу, у тым ліку на аснове развіцця вытворчай кааперацыі, са стварэннем сэрвісных цэнтраў па яе абслугоўванню і рамонту.

**БЕЛТА.**

## Да 2010 года — 9,5 млн тон цэменту

**Мадэрнізацыя цэментнай галіны Беларусі дасць магчымасць да 2010 года выпускаць 9,5 млн тон цэменту. Аб гэтым паведаміў міністр архітэктуры і будаўніцтва Аляксандр Селязнёў на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў.**

Ён адзначыў, што такая работа запланавана ў рамках дзяржаўнай комплекснай праграмы развіцця матэрыяльна-тэхнічнай базы будаўнічай галіны на 2006—2010 гады. «На сёння праграма рэалізуецца, крыніцы фінансавання вызначаны, бізнэс-планы ёсць», — адзначыў Аляксандр Селязнёў.

Цяпер на цэментных заводах рэспублікі вядуцца першачарговыя работы, якія павінны зняць пікавую нагрузку па вытворчасці гэтага будаўнічага матэрыялу. У лістападзе рыхтуюцца да ўводу ў эксплуатацыю дадатковыя магутнасці па выпуску цэменту на Беларускім цэментным заводзе ў Касцюковічах, яны складуць 200 тыс. тон. Аналагічны пуск магутнасцяў запланаваны на «Крычаўцэментнашыферы».

Аляксандр Селязнёў таксама паведаміў аб павелічэнні аб'ёму вытворчасці іншых будаўнічых матэрыялаў. Так, выпуск сценавых матэрыялаў да 2010 года ўзрасце больш як у два разы. Асноўны прырост плануецца на Мінскім і Бярозаўскім КБІ, «Забудове».

У ходзе выканання комплекснай праграмы ў 2006—2007 гадах павялічаны магутнасці прадпрыемстваў буйнапанэльнага домабудавання. Пры заданні росту на 247 тыс. кв.м магутнасці плануецца нарасціць прыкладна на 300 тыс. кв.м.

## Карэя звярнулася да Беларусі з просьбай падтрымаць яе кандыдатуру на правядзенне Сусветнай выстаўкі «ЭКСПО-2012»

Карэя звярнулася да Беларусі з просьбай падтрымаць яе кандыдатуру на правядзенне Сусветнай выстаўкі «ЭКСПО-2012». Аб гэтым паведаміў спікер Нацыянальнай асамблеі Карэі Лім Чхэ Чжонг на сустрэчы з прэм'ер-міністрам Беларусі Сяргеем Сідорскім.

Спікер высока ацаніў узровень эканамічнага развіцця Беларусі. На яго думку, актывізацыі двухбаковых адносінаў будзе садзейнічаць маючае адбыцца адкрыццё пасольства Карэі ў Мінску, а таксама першы візіт беларускага прэм'ер-міністра ў Карэю, праведзены 5—6 лістапада. Сяргей Сідорскі адзначыў, што Беларусь і Карэю звязваюць адзіныя падыходы ў правядзенні эканамічнай палітыкі, прыярытэтам якой з'яўляецца развіццё экспарту. Бакі таксама абмеркавалі пытанні развіцця міжпарламенцкіх адносінаў Беларусі і Карэі.

## Касцёл імкнецца да супрацоўніцтва з Праваслаўнай царквой і дзяржавай



**Гэта стала лейтматывам першай прэс-канферэнцыі, якую даў арцыбіскуп Тадэвуш Кандрусевіч пасля свайго прызначэння на кіруючую ў Касцёле на Беларусі Мінска-Магілёўскую кафедру.**

— Яшчэ да прыезду ў Мінск я прачытаў у Інтэрнэце інфармацыю пра тое, што зараз вядзецца размова пра магчымае падпісанне Канкардата (Пагаднення) паміж Ватыканам і Рэспублікай Беларусь, — сказаў новапрызначаны арцыбіскуп, — і вельмі ўзрадаваўся, бо гэта зафіксавала б пазіцыю Касцёла на Беларусі. Такім чынам Беларусь выйшла б на першыя пазіцыі сярод краін СНД. І калі такая работа распачнецца, я буду гатовы прыняць у ёй самы актыўны ўдзел.

Арцыбіскуп падкрэсліў, што ў Касцёла і дзяржаўнай улады шмат агульнага — і першы і другая служаць для людзей. Касцёл забяспечвае духоўны бок гэтага служэння. Барацьба супраць суіцыдаў, алкагалізму, наркаманіі, умацаванне інстытуту сям'і, маральнае выхаванне маладога пакалення — усё гэта складае супольнае поле, дзе могуць і павінны працаваць разам дзяржава і духавенства.

Што датычыцца адносінаў паміж Касцёлам на Беларусі і дзяржаўнымі ўладамі, то нядаўняя сустрэча новапрызначанага арцыбіскупа з кіраўніком краіны, якая адбылася падчас канферэнцыі «Дыялог хрысціянства і іслама», пакінула добрыя ўражанні і надзею на агульную прадуктыўную размову. «Я прыхільнік дыялогу, каб усе, нават самыя вострыя пытанні і праблемы вырашаць гэтым шляхам, — заўважыў арцыбіскуп. — Могуць быць непаразуменні, бо з аднаго боку, мы маем кананічнае права, з другога — у кожнай дзяржаве ёсць свае права, але трэба гаварыць адно з адным і чуць адзін аднаго».

Тое ж самае датычыцца і супрацоўніцтва з Беларускай праваслаўнай царквой. Каб адказаць на выклікі секулярнага свету, трэба імкнуцца да яднання, лічыць арцыбіскуп Тадэвуш Кандрусевіч. Ён даўно асабіста знаёмы і ў добрых адносінах з Мітрапалітам Філарэтам, жадае далей працаваць разам з ім і іншымі іерархамі і дзеячамі Праваслаўнай царквы.

— Я заўсёды ставіўся з вялікай павагай да Праваслаўнай царквы, — запэўніў Яго Эксцеленцыя, — гэта наша сястра-царква, якая мае тыя ж самыя Таінствы, тысячагадовую гісторыю. Сёння мы мусім быць адзіныя. І я спадзяюся, што тут на Беларусі мы знойдзем агульную мову і будзем працаваць разам.

Арцыбіскуп расказаў, што наперсны крыж, які ён апрануў спецыяльна на гэтую сустрэчу, быў падораны яму мітрапалітам Смаленскім і Калінінградскім Кірылам, і гэта — знак яго жадання сумеснага супрацоўніцтва з Праваслаўнай царквой.

Тадэвуш Кандрусевіч вярнуўся на Беларусь праз 16 гадоў. Ён нарадзіўся 3 студзеня 1946 г. у вёсцы Адэльск непадалёк ад Гродна. Атрымаў тэхнічную адукацыю ў Ленінградзе, працаваў інжынерам на Віленскім заводзе шліфавальных станкоў. У 1976 годзе паступіў у Духоўную семінарыю ў Каўнасе. З 1981 па 1988 гады быў вікарыем і пробашчам у прыбалтыйскіх касцёлах. З 1988 па 1991 год узначальваў парафіі ў Беларусі. Біскупскую сакру атрымаў з рук папы Яна Паўла II 20 кастрычніка 1989 года. 13 красавіка 1991 года быў прызначаны Апостальскім Адміністратарам для католікаў лацінскага абраду еўрапейскай часткі Расіі. 21 верасня 2007 года Святы пап Бенедыкт XVI вызваліў арцыбіскупа Тадэвуша Кандрусевіча ад пастырскага кіраўніцтва архідыяцэзіяй Маці Божай у Маскве і прызначыў Арцыбіскупам Мітрапалітам Мінска-Магілёўскім.

У суботу, 10 лістапада, а 11-й гадзіне, у Мінскай архікатэдры адбудзецца кананічнае ўступленне на пасаду Арцыбіскупа Мітрапаліта Мінска-Магілёўскага Тадэвуша Кандрусевіча.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

### ПРАДСТАЎНІЦТВА ЎРАДА МАСКВЫ АДКРЫЛАСЯ Ў МІНСКУ

У адпаведнасці з распараджэннем маскоўскага гараданачальніка Юрыя Лужкова, кіраўніком прадстаўніцтва назначаны Уладзімір Плаксін, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА. Асноўнымі задачамі прадстаўніцтва будуць удзел у развіцці і ўмацаванні гандлёва-эканамічных, навукова-тэхнічных і культурна-гуманітарных сувязей Беларусі і Масквы, а таксама каардынацыя работы па стварэнню і дзейнасці культурна-дзелавога цэнтра «Дом Масквы». Пасля завяршэння будаўніцтва ў Мінску гэтага цэнтра прадстаўніцтва Масквы пераедзе ў яго памяшканне. А пакуль яно размесціцца па адрасе: г.Мінск, праспект Незалежнасці, д.11, оф. 222.

## Дзесяць дзён, якія павінны прадухіліць ДТЗ

*З 10 па 20 лістапада пройдзе дэкада па прафілактыцы дарожна-транспартнага траўматызму*

Нягледзячы на тое, што сёлета назіраецца тэндэнцыя да змяншэння колькасці ахвяраў дарожна-транспартных здарэнняў (ДТЗ), абстаноўка на аўтамагістралях і на вуліцах населеных пунктаў яшчэ далёка не ідэальная. Штодзень у аўтамабільных аварыях ці пад коламі транспартных сродкаў гінуць людзі. За 10 месяцаў гэтага года, паводле звестак ДАІ, зарэгістравана больш за 6,1 тыс. ДТЗ, у выніку якіх 1207 чалавек загінулі і 6580 — атрымалі раненні.

Таму паводле распараджэння міністра ўнутраных спраў Беларусі з 10 па 20 лістапада пройдзе дэкада па прафілактыцы дарожна-транспартнага траўматызму. Як падкрэсліў намеснік начальніка ўпраўлення Дзяржаўтаінспекцыі МУС краіны Ігар Ваніцкі, у гэтай акцыі будуць задзейнічаны ўсе міліцэйскія сілы, уключаючы і кіраўніцтва МУС. Паводле слоў Ігара Ваніцкага, за кожным кіраўніком цэнтральнага апарату МУС, у тым ліку і за міністрам унутраных спраў, замацаваны той ці іншы раён. Вартавыя правапарадку пойдуць у народ, каб пераканаць усіх і кожнага ўдзельніка дарожнага руху ў неабходнасці строга выконваць правілы. За дэкаду кожны міліцыянер павінен будзе штодзень не менш чым 3 гадзіны службовага часу патраціць менавіта на прафілактыку ДТЗ. А супрацоўнікі ДАІ, увогуле, на гэтыя мэты будуць выдаткоўваць палову свайго працоўнага часу. Найбольш пільная ўвага будзе скіравана на прафілактычную працу з пешаходамі і веласіпедыстамі, якія найчасцей становяцца ахвярамі ДТЗ. Прычым нярэдка па сваёй жа віне, бо не паруліліся абазначыць сябе ў цёмны час сутак флікерамі. Дарэчы, падчас акцыі плануецца распаўсюдзіць каля 10 тыс. гэтых святлоадбівальных элементаў.

Не застануцца па-за ўвагай і кіроўцы транспартных сродкаў. Ігар Ваніцкі паведаміў, што аўтааматарам у чарговы раз будзе рэкамендавана «пераабуць» сваіх «жалезных коней» у зімовыя шыны. Між іншым, хоць за адсутнасць зімовых шын і не прадугледжана адміністрацыйнае пакаранне, многія аўтааматары, мяркуючы па даўжэзных чэргах ля шынамантажных майстэрняў, ужо прыслухаліся да парад «даішнікаў». А яшчэ прадстаўнік ДАІ нагадаў аб неабходнасці выконваць хуткасны рэжым, бо 30 працэнтаў аварый адбываецца па віне «ліхачоў». Менавіта гэтая катэгорыя парушальнікаў найчасцей пазбаўляецца правоў на кіраванне транспартным сродкам. Намеснік начальніка УДАІ МУС краіны абверг чуткі аб тым, што супрацоўнікі Дзяржаўтаінспекцыі апошнім часам пазбаўляюць вадзіцельскага пасведчання нават за ўчыненне нязначных ДТЗ. Паводле яго слоў, толькі 18 працэнтаў вінаватых у аўтааварыях развітваюцца з правамі, астатнія абмяжоўваюцца штрафам.

**Мікола ДЗЯБЁЛА.**

### БЕЛАРУСЬ ЧАСОВА ПРЫПЫНІЛА ЭКСПАРТ СВІНІНЫ

Аб гэтым паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў галоўным упраўленні знешнеэканамічнай дзейнасці Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання. Пастаўкі за межы рэспублікі адновяцца, калі поўнасцю будзе задаволена патрэбнасць унутранага рынку. Забарона на экспарт свініны тушамі і паўтушамі распаўсюджваецца на арганізацыі ўсіх формаў уласнасці.

**БЕЛТА.**

## 9 лістапада — Міжнародны дзень барацьбы супраць фашызму і антысемітызму

## Нянавісці да іншай нацыі няма апраўдання

Сёння па ўсім свеце ўзгадваецца ноч з 9 на 10 лістапада 1938 года, якая стала пачаткам Халакоста. Гэта ноч увайшла ў гісторыю пад назвай «Хрустальная» — з-за шкляных асколкаў, якія раніцай, быццам снег, пакрылі вуліцы нямецкіх гарадоў. Падчас гэтага пагрому ў Германіі былі забіты 92 яўрэі, падпалены сінагогі па ўсёй краіне, разбураны і разрабаваны больш за сем тысяч магазінаў. Каля 30 тысяч яўрэяў былі арыштаваны і высланы ў канцэнтрацыйныя лагеры, а на яўрэйства ў цэлым быў накладзены штраф у мільярд марак. Пасля «Хрустальнай ночы» большасць яўрэйскіх арганізацый і ўстаноў Германіі былі закрыты, а назіранне за яўрэямі перададзена ў рукі гестапа. Гэта стала пачаткам каласальнай трагедыі ў гісторыі чалавецтва, наступствы якой адчуваюцца дагэтуль. Таму ва ўсіх краінах сёння адбываюцца акцыі, сустрэчы, на якіх зноў і зноў гучаць словы перасцярогі: такое не павінна паўтарыцца.

— Тут важна зразумець вытокі антысемітызму, яго гісторыю, — лічыць Іна Герасімава, дырэктар Музея гісторыі і культуры яўрэяў у Беларусі пры Мінскім яўрэйскім абшчынным доме. — Таму мы ў гэтыя дні праводзім гутаркі на гэтую тэму. Мы кажам пра тое, што антысемітызм можа быць рэлігійны, бытавы, але самы страшны — гэта дзяржаўны. У Беларусі няма антысемітызму, але нас хвалююць некаторыя праявы фашысцкіх арганізацый, якія часцей за ўсё прыходзяць да нас з Расіі. Я маю на ўвазе прэсу, якая выдаецца там, але прадаецца і тут, у нас. А таксама апаганьванне яўрэйскіх могілак, якія час ад часу здараюцца ў нашай краіне, апошні выпадак адбыўся ў Бабруйску. Гэта выклікае заклапочанасць абшчыны.

Яўрэйскія арганізацыі праводзяць вялікую асветніцкую работу сярод насельніцтва, асабліва маладога пакалення, па прадухіленні праяў фашызму і антысемітызму.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ ОАО «ЧЕРМЕТРЕМОНТ»!
**20 ноября 2007 года в 15 часов 30 минут**

**СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ**

**акционеров ОАО «Черметремонт», место проведения собрания — по месту нахождения Общества: 223017, Минский р-н, п. Гатово, ОАО «Черметремонт», актовый зал.**

*Повестка дня:*

1. О совершении крупной сделки.

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании — 12.11.2007. Место и время регистрации участников собрания — в день проведения собрания с 13.30 до 15.20 по месту его проведения.

Просим принять участие в собрании или поручить представлять Ваши интересы на собрании акционеров представителю. При себе иметь документ, удостоверяющий личность и доверенность (для представителей).

Время и место ознакомления акционеров с материалами по вопросам повестки дня собрания: в рабочие дни (понедельник—пятница) с 8.30 до 17.00, начиная с 12.11.2007 в приемной ОАО «Черметремонт», а в день проведения собрания — с 13.30 до 14.20 по месту его проведения.

**Дирекция** **Наблюдательный совет**

## Спорт-тайм

### У каралевы спорту — новы кіраўнік

**Міністр працы і сацыяльнай абароны Уладзімір Патупчык абраны старшынёй Беларускай федэрацыі лёгкай атлетыкі.**

Лёгкая атлетыка застаецца самай медалеёмістай дысцыплінай і адным з самых масавых відаў спорту. 35 тысяч беларусаў займаецца лёгкай атлетыкай. У жніўні гэтага года наша федэрацыя па выніках працы аказалася ў ліку 12 лепшых з 200 федэрацый свету. А трое трэнераў (Юрый Максакаў, Людміла Нікіпорчык і Юрый Цыцорын) па выніках работы атрымалі высокія дзяржаўныя ўзнагароды з рук кіраўніка дзяржавы. Беларускімі лёгкаатлетамі ўжо заваявана 68 алімпійскіх ліцэнзій. Плануецца, што на Алімпійскіх гульнях у Пекіне нашы спартсмены заваююць 5—7 медалёў. Асноўныя надзеі кіраўнікі беларускага спорту звязваюць з такімі дысцыплінамі, як кіданне молата, штурханне ядра, шматбор'е, жаночыя эстафеты 4х100 і 4х400 метраў.

Як заўважыў міністр спорту і турызму Аляксандр Грыгараў, паводле даручэння кіраўніка дзяржавы будзе праводзіцца глабальная рэканструкцыя стадыёна «Дынама». Галоўная арэна краіны будзе адпавядаць самым высокім сусветным стандартам, і наша краіна зможа прыняць любыя міжнародныя лёгкаатлетычныя спаборніцтвы. Апошнія такія спаборніцтвы ў Беларусі праходзілі толькі ў 70-х, гэта быў лёгкаатлетычны матч «СССР—ЗША».

Сярод пажаданняў, якія Аляксандр Грыгараў выказаў новаму кіраўніку федэрацыі, — развіццё масавых спаборніцтваў на месцах, каб з часам такія папулярныя ў некаторых краінах спаборніцтвы, як марафон, і ў нас збіралі дзесяткі і нават сотні тысяч удзельнікаў.

Новы кіраўнік федэрацыі лёгкай атлетыкі Уладзімір Патупчык таксама абазначыў некалькі напрамкаў працы на сваім дадатковым працоўным месцы. У прыватнасці, асноўная ўвага будзе накіравана на развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы, а таксама стварэнне неабходных умоў для падрыхтоўкі рэзерву і развіццё масавага спорту.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

### ЦСКА і «Дынама» без шанцаў на выхад з групы

Беларус Аляксандр Глеб у паядынку лонданскага «Арсенала» з пражскай «Славіяй» у чацвёртым туры Лігі чэмпіёнаў не ўдзельнічаў. «Кананіры» згулялі ўнічыю — 0:0 — і зараз маюць у сваім активе 10 ачкоў. У іншай сустрэчы **групы «Н»** іспанская «Севілья» выйграла ў гасцях у чэмпіёна Румыніі «Сцяуа» — 2:0 — і зараз знаходзіцца на другім радку з 9 ачкамі. У «Славіі» — 4.

**У групе «А»** англійскі «Ліверпуль» разграміў дома турэцкі «Бешыкташ» — 8:0, а партугальскі «Порту» перамог французскі «Марсель» — 2:1. Становішча камандаў такое: «Порту» — 8, «Марсель» — 7, «Ліверпуль» — 4, «Бешыкташ» — 3. **У квартэце «В»** футбалісты лонданскага «Чэлсі» і нямецкага «Шальке» галоў не забілі — 0:0. Іспанская «Валенсія» ўступіла дома нарвежскаму «Русенборгу» — 0:2. У групе лідзіруюць «арыстакраты» (8), «Русенборг» набраў 7 ачкоў, «Шальке» — 4, «Валенсія» — 3. Унічыю (0:0) завяршылася сустрэча **ў квартэце «С»,** у якой спаборнічалі мадрыдскі «Рэал» і грэчаскі «Алімпіякос». Італьянскі «Лацыо» ўзяў верх над нямецкім «Вердэрам» — 2:1. Пасля чатырох матчаў «каралеўскі клуб» мае 8 ачкоў, «Лацыо» і «Алімпіякос» — па 5, а «Вердэр» — 3. **У квартэце «D»** данецкі «Шахцёр» прайграў на сваім стадыёне італьянскаму «Мілану» — 0:3. Гаспадары ж іншага матча групы, футбалісты шатландскага «Сэлціка», задаволіліся мінімальным выйгрышам над партугальскай «Бенфікай» — 1:0. Лідзіруе ў гэтай чацвёрцы «Мілан» (9), па 6 ачкоў у «Шахцёра» і «Селціка», у «Бенфікі» — 3. **У групе «Е»** французскі «Ліён» выйграў у нямецкага «Штутгарта» — 4:2, а іспанская «Барселона» — у шатландскага «Рэйнджэрса» — 2:0. Становішча камандаў: «Барселона» — 10 ачкоў, «Рэйнджэрс» — 7, «Ліён» — 6, «Штутгарт» — 0. **У групе «F»** кіеўскае «Дынама» пацярпела ўжо ў чацвёрты раз. На гэты раз — у гасцях, у англійскай каманды «Манчэстар Юнайтэд», — 0:4. Дзякуючы гэтай вікторыі гаспадары ўжо забяспечылі сабе выхад у наступны этап Лігі чэмпіёнаў, бо ў іх максімум ачкоў —12. У сустрэчы італьянскай «Ромы» і партугальскага «Спортынга» пераможца вызначаны не быў — 2:2. У «Ромы» — 7 ачкоў, на тры менш у «Спортынга». У першым тайме матча з міланскім «Інтэрам» расійскі ЦСКА вёў з лікам 2:0, але госці так і не змаглі ўтрымаць перавагу і прайгралі італьянцам — 2:4. У другой гульні **групы «G»** мацнейшымі аказаліся таксама гаспадары поля: турэцкі «Фенербахчэ» перамог галандскі ПСВ — 2:0. У квартэце на першым месцы ідзе «Інтэр» (9 ачкоў), на другім — «Фенербахчэ» (8), трэцім ПСВ (4), апошнія армейцы — 1.

### Зноў трэція

На Міжнародным дзіцячым турніры па хакеі з шайбай «Кубак МакДональдс-2007» у Мінску ігракі сталічнага «Юнацтва» паўтарылі свой леташні вынік — занялі трэцяе месца. Акрамя «бронзы», беларусы таксама атрымалі прыз за шчырую гульню. Прадстаўнікі беларускай сталіцы святкавалі перамогу ў трох матчах, а ўступілі толькі сярэбраным прызёрам і чэмпіёнам спаборніцтваў — адпаведна латышскім і фінскім юнакам. Галоўны трэнер нацыянальнай хакейнай зборнай Курт Фрэйзер выказаў надзею, што спаборніцтвы стануць традыцыйнымі.

## Выбар для індывідуальных прадпрымальнікаў

**Для дзяржаўнай рэгістрацыі ўнітарнага прадпрыемства індывідуальны прадпрымальнік павінен звярнуцца ў рэгіструючы орган не пазней чым 10 лістапада 2007 года. У выпадку пропуску гэтага тэрміну будзе страчана магчымасць рэгістрацыі УП у спрошчаным парадку.**

Як вядома, у адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 29 снежня 2006 г. № 760, з 1 студзеня 2008 года дзейнасць індывідуальнага прадпрымальніка можа ажыццяўляцца толькі з прыцягненнем не больш за тры члены сям'і і блізкіх сваякоў (муж альбо жонка, бацькі, дзеці, усынавіцелі, усыноўленыя (удачароныя), родныя браты і сёстры, дзед, баба, унукі). Прадпрымальніцкая дзейнасць з парушэннем гэтай умовы забаронена і будзе караецца штрафам у памеры ад 20 да 200 базавых велічынь з канфіскацыяй даходу, атрыманага ў выніку такой дзейнасці. Акрамя таго, за занятак незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасцю ва ўстаноўленых заканадаўствам выпадках прадугледжана і крымінальная адказнасць.

Такім чынам, індывідуальныя прадпрымальнікі павінны зрабіць выбар: альбо прадоўжыць сваю дзейнасць з улікам новых правілаў, альбо зарэгістраваць камерцыйную арганізацыю. Пры гэтым Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 28 чэрвеня 2007 г. № 302 прадугледжвае спрошчаную працэдуру рэгістрацыі ўнітарнага прадпрыемства паводле прынцыпу «аднаго акна», вызваляе іх ад дадатковых расходаў (рэгістрацыйнага збору, дзяржаўных пошлін, платы за закрыццё/адкрыццё рахункаў у банку) і неабходнасці атрымання новых ліцэнзій, а таксама розных дазволаў, якія былі атрыманы індывідуальным прадпрымальнікам у ходзе сваёй дзейнасці.

Акрамя таго, Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 15 кастрычніка 2007 г. № 496 устаноўлена, што прыватныя ўнітарныя прадпрыемствы на працягу аднаго года з даты дзяржаўнай рэгістрацыі ажыццяўляюць касавыя аперацыі ва ўстаноўленым для індывідуальных прадпрымальнікаў парадку. А тавары, якія былі ўвезены прадпрымальнікам-плацельшчыкам адзінага падатку на мытную тэрыторыю нашай краіны без мытнага афармлення ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 18 чэрвеня 2005 г. № 285 і ўказаны ў кнізе ўліку руху тавараў да даты дзяржаўнай рэгістрацыі ўнітарнага прадпрыемства, могуць уносіцца прадпрымальнікам у якасці неграшовага ўкладу ў статутны фонд УП альбо замацаваны за ім на праве гаспадарчага вядзення без мытнага афармлення такіх тавараў і выплаты мытных пошлін (збораў).

Пры перарэгістрацыі індывідуальных прадпрымальнікаў у прыватныя ўнітарныя прадпрыемствы створаныя УП могуць прымяняць як спрошчаны парадак падаткаабкладання (пры выкананні ўстаноўленых заканадаўствам крытэрыяў), так і агульны парадак падаткаабкладання, які прадугледжаны для юрыдычных асобаў.

Тым не менш, нягледзячы на гэтыя меры, пераважная частка індывідуальных прадпрымальнікаў пакуль баіцца новай схемы работы. На 5 лістапада ў Гродзенскай вобласці ад ІП пададзена толькі 380 заяў на рэгістрацыю прыватных унітарных прадпрыемстваў. І гэта пры тым, што на 1 кастрычніка 2007 года падатковымі інспекцыямі ўлічваюцца 23 389 індывідуальных прадпрымальнікаў, у тым ліку каля 8 тысяч ІП з наёмнымі работнікамі. Дарэчы, у параўнанні з пачаткам года колькасць ІП на Гродзеншчыне павялічылася на 1774, а ў параўнанні з аналагічнай датай мінулага года — на 2164 (10,2 працэнта). Гэта адбываецца ў тым ліку і па прычыне драблення індывідуальным прадпрымальнікам свайго бізнэсу, калі яго частка пераафармляецца на сваякоў альбо наёмных работнікаў.

Кіраўнік Гродзенскай абласной падатковай інспекцыі Віталь Кірыёнак не выключае павелічэння колькасці заяўнікаў у апошнія дні, калі дзейнічае спрошчаны парадак рэгістрацыі ўнітарнага прадпрыемства. Такая магчымасць будзе прадастаўлена ўсімі рэгіструючымі органамі ўсім ахвотнікам, нават нягледзячы на выхадны дзень.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

Ёсць нагода

## 300 КМ ЗА 16 ГАДЗІН, «ВЫШКА» І ЖАНОЧАЕ СЯБРОЎСТВА

**Сёння Сусветны дзень Кнігі рэкордаў Гінеса. Чаго толькі не трапляла на яе старонкі за яе шматгадовую гісторыю. Вось некаторыя вытрымкі з яе, якія датычацца аматараў калекцыянавання.**

**Уладальнік бензакалонкі ў Тэхасе хацеў збіраць гамбургеры, аднак паколькі яны хутка псуюцца, вырашыў засяродзіцца на рэцэптах іх прыгатавання. Высветлілася, што зрабіць гэта можна 800 рознымі спосабамі.**

**У свеце існуе ўнікальная калекцыя, якая складаецца з аднаго экспаната. Гэта эскімоскі ўцяплялънік для пупка. На жаль, карэннае насельніцтва Аляскі і прыпалярнай Канады страціла сакрэт вырабу патрэбнага матэрыялу, таму зараз яго ацэньваюць на вагу. Адзіны афіцыйна зарэгістраваны экзэмпляр важыць 15 грамаў.**

**Спадар з Цынцінаці вось ужо 30 гадоў збірае пасмы валасоў знакамітых людзей. У яго ўжо 115 пакетаў. Гавораць, там ёсць нават валасы Шэкспіра.**

**Яшчэ адзін амерыканец збірае барабанныя палачкі. У сярэднім кожная палачка абыходзіцца яму ў 700 долараў, паколькі ў калекцыю ўваходзяць толькі палачкі, што былі ва «ўжыванні» ў знакамітых музыкантаў. Сёння ў яго 1300 пар.**

**А ШТО ВЫ ЛІЧЫЦЕ СВАІМ УЛАСНЫМ ЖЫЦЦЁВЫМ ДАСЯГНЕННЕМ, СВАІМ РЭКОРДАМ?**

***Вольга НОВІК, намеснік галоўнага рэдактара газеты «Голас Любаншчыны»:***

— Я нарадзілася і вырасла ў вёсцы Нясвіжскага раёна, у простай сям'і (маці даярка, бацька рабочы ЖКГ), дзе было трое дзяцей. Маёй запаветнай марай было атрымаць вышэйшую адукацыю. І я лічу вялікім сваім жыццёвым дасягненнем, што адразу пасля школы я здолела паступіць у БДУ, на бюджэт. Я адзіны член сям'і, у каго ёсць вышэйшая адукацыя. У перспектыве мне хацелася б атрымаць і другую «вышэйшую». Увогуле, я не з тых, каму важна даказваць іншым, што ў нечым я — лепшая. Даказваю нешта я толькі сабе. І новыя планкі стаўлю перад сабой выключна для самарэалізацыі, а не для прызнання навакольнымі.

***Руслан ЯЛОШКА, кіраўнік калектыву сучаснага танца «F&M»:***

— Самым значным сваім дасягненнем я лічу наступны факт сваёй біяграфіі: аднойчы я вырашыў праверыць, здолее чалавечы арганізм вытрываць 16-гадзінны велакрос, ці не. Сеў на веласіпед і паехаў — з Мінска па Слуцкай шашы праз Слуцк, Мікашэвічы, Тураў і амаль да самай мяжы. Праехаў 300 км. Выехаў у 18.00, прыехаў у 10.00 раніцы наступнага дня. Спыняўся толькі на пару хвілін перакусіць (на веласіпедзе гэта рабіць вельмі нязручна). Мне было цікава: змагу я гэта вытрываць ці не. Змог! Мне нецікава даказваць, што я ў нечым вылучаюся сярод астатніх, што я больш «круты». Куды больш цікава даказаць, што нейкая мая тэорыя працуе на практыцы.

***Наталля ЛЕЎЧАНКА, каардынатар праектаў рэкламнага агенцтва «Пасія»:***

— Ніякіх значных рэкордаў у маім жыцці пакуль не было. Я вельмі хацела сігануць з парашутам, аднак калі даведалася, што мой аднакурснік ўжо зрабіў гэта і зламаў нагу, маё жаданне прапала. Гэты мой рэкорд не адбыўся. Многія кажуць, што жаночага сяброўства не бывае. А мы з дзвюма маімі сяброўкамі даказалі адваротнае і я лічу, што гэта — своеасаблівы рэкорд, які таксама варты Кнігі рэкордаў Гінеса. Мы сябруем з першага курса. Увогуле, я жадаю кожнаму з нас мець сваю кнігу ўласных рэкордаў і кожны дзень запісваць туды свае хай і невялікія, але такія важныя дасягненні.

***Святлана БАРОЎСКАЯ, тэлевядучая Першага канала:***

— Я ніколі не заўважыла б свой рэкорд, калі б на яго маю ўвагу не звярнуў выкладчык факультэта журналістыкі БДУ. Не так даўно я давала майстар-клас для студэнтаў 3—5 курсаў і гаварыла паўтары гадзіны без перапынку. Як мне потым сказалі, я магла б перамагчы, калі б нехта праводзіў марафон на хуткасць вымаўлення слоў, выразаў, бо магу не толькі гаварыць доўга і хутка, але пры гэтым даносіць сэнс выразаў.

***Андрэй ВАЛЮК, спартсмен (шашкі-64):***

— Шашкамі я займаюся з 10 гадоў і з таго часу спаборнічаў у больш чым 160 турнірах, праехаў больш за 210 тысяч кіламетраў. Ці не рэкорд гэта?

***Уладзімір БУЛГАКАЎ, галоўны дызайнер галоўнага мастацкага ўпраўлення Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта:***

— Якое ў мяне дасягненне? Калі я не памыляюся, то ніводзін з дызайнераў не распрацоўваў, як я, форму ажно для шасці Алімпійскіх гульняў.

***Вольга СЯЎРУК, спартыўны карэспандэнт тэлеканала «АНТ»:***

— Сёлета я ўстанавіла некалькі рэкордаў. Звычайна я даязджаю дадому з працы за 45 хвілін, а аднойчы з перасадкамі я даехала за 30 хвілін. А яшчэ я ўжо тры з паловай месяцы не ем ніякай каўбасы.

***Аляксандр САЛАДУХА, спявак:***

— Я зараз знаходжуся ў канцэртным туры, які прысвечаны майму юбілею — я ўжо 20 гадоў на сцэне. Тур стартаваў 20 кастрычніка 2006 года і за плячыма ў мяне ўжо 114 гарадоў і 114 канцэртаў.

**Рэкорды збіралі Інга МІНДАЛЁВА і Ірына ПРЫМАК.**

Спрэчныя нататкі

## КАДРАВЫ ГОЛАД?

**Змена кіраўнікоў — працэс хоць і балючы, але натуральны. На замену старэйшага пакалення прыходзяць маладыя — з вялікімі планамі і амбіцыямі. Заняць пасаду кіраўніка ахвотнікаў звычайна многа, асабліва калі пасада тая прэстыжная. А вось у вёсцы сітуацыя крыху іншая.**

Аказваецца, што нягледзячы на кадравыя рэестры, якія ёсць у кожным райвыканкаме, падабраць кіраўніка сельгаскааператыва няпроста.

У Ляхавіцкім раёне ў чатыры гаспадаркі давялося рэкамендаваць сходу былых старшыняў. І тут адзін цікавы факт. З адыходам на пенсію былы кіраўнік раёна А. Сакун пайшоў у СВК «Кастрычнік» намеснікам старшыні, а цяпер ужо ўзначаліў сельгаскааператыў «Тальмінавічы». З гэтай нагоды ў райцэнтры жартуюць, што калі Аркадзь Андрэевіч такімі тэмпамі будзе рухацца, то неўзабаве можа зноў апынуцца ў райвыканкаме — у былым кабінеце. А калі сур'ёзна, то тут толькі можна вітаць чалавека, які яшчэ мае дзелавы патэнцыял. І не толькі ён адзін аказаўся такім.

У свой час «Звязда» пісала пра канфлікт, які ўзнік паміж кіраўніком калгаса «Новае жыццё» У. Марозам і кіраўніцтвам раёна. У тым працістаянні старшыня калгаса не ўстаяў і пакінуў пасаду. А праз некалькі гадоў аказаўся запатрабаваным. І сёлета прыняў СВК «Востраў». Пра астатніх расказваць на буду, бо і там былі прыкладна такія ж сітуацыі.

Здавалася б, калі месца кіраўніка вызваляецца, то тут жа павінна выцягнуцца чарга з маладых, якім пад трыццаць пяць ці ў межах гэтага. А тут мы бачым людзей ужо немаладога веку. Дык што перашкаджае ўчарашняму выпускніку сельгасакадэміі ці чалавеку ўжо папрацаваўшаму прэтэндаваць на пасаду старшыні сельгаскааператыва?

Напэўна, лепш ведае сітуацыю той, хто сам яшчэ нядаўна хадзіў у маладых кіраўніках.

— Вось сёння я пайшоў на работу на досвітку, а вярнуўся дамоў у цемнаце, і так кожны дзень. Чатыры гады не быў у адпачынку, — расказвае старшыня СВК «Дарава» Уладзімір Пятроўскі, — а зарплата ўсяго мільён. Малады чалавек з дзелавой хваткай заробіць удвая больш з меншым клопатам. На гэтай пасадзе я ўжо дзевяць гадоў, паспеў прывыкнуць і ўцягнуцца, а так ісці на гэтыя турботы сёння ахвотнікаў мала.

А калі яны і ёсць, то далёка не кожны здольны справіцца з работай і вытрымаць канкурэнцыю з былым кіраўніком, няхай ужо і завочную. Часта бывае, што людзі шкадуюць былога старшыню, бо новы прайграе яму па многіх пазіцыях.

Да слова будзе прытча.

Два маладыя львы назіраюць з-за хмызняку за прайдам.

— Настаў твой час, — кажа малодшы, — бачыш, які стары, а цэлы гарэм трымае, ды яшчэ і кормяць яго львіцы. Ідзі і займі яго месца!

Старэйшы тут жа кінуўся да лежбішча, а малодшы адбег і чакае. У хуткім часе прэтэндэнт на прайд вяртаецца. Поўсць ва ўсе бакі, вуха разарванае і лапу цягне.

— Я тут падумаў: а навошта мне клопат гэты? Мала што гарэм трэба ахоўваць, дык яшчэ і кожную абслугоўваць... — уздыхнуў няўдачнік.

Здараецца, што старшыня сам адмаўляецца ад пасады і спрабуе дасягнуць поспеху ў іншай справе.

— У нас двое кіраўнікоў падаліся ў горад, вырашылі там паспытаць шчасця, — кажа Валянціна Міхальчык, намеснік старшыні Баранавіцкага райвыканкама па эканоміцы, — а затым вярнуліся ў свае гаспадаркі. Што датычыцца маладых кадраў, то тут сапраўды ёсць праблема. Іх не ўсё задавальняе...

Кадравы голад назіраецца ва ўсіх раёнах. Цяжка падабраць не толькі кіраўніка СВК, але і старшыню сельсавета.

Гэта некалі партыя магла пасылаць на любы ўчастак работы і чалавек, калі не хацеў рызыкаваць партбілетам, а заадно і кар'ерай, не меў выбару. Сёння ж настаўніка не пасадзіш ў крэсла старшыні сельсавета і не кожны аграном захоча ўзначаліць сельгаскааператыў — праблем многа, а грошай мала. І навошта ў такім разе браць на сябе клопат, бязладдзе, «разгоны з наганяем», калі пры такой жа ці нават большай зарплаце можна жыць больш спакойна.

А яшчэ пры назначэнні новага кіраўніка ёсць рызыка. Быццам бы чалавек і здольны, а сутыкнуўся з рэчаіснасцю — і разгубіўся.

На гэты факт указвалі ўсе кіраўнікі, з якімі давялося пагаварыць.

Але тут ёсць адзін момант, які ўказвае, што не ўсё ў вёсцы адназначна.

Кадравая ліхаманка закранае толькі слабыя гаспадаркі — гэта туды маладыя не хочуць ісці. А ў сельгаскааператывах, якія з'яўляюцца флагманамі раёна ці працуюць стабільна, кадравай праблемы няма. Такімі гаспадаркамі старшыні кіруюць дзесяцігоддзямі, і як той стары леў, уступаць свае пазіцыі больш маладым не збіраюцца. Які сэнс, калі справа наладжана?

А закончыць нашу размову першы намеснік кіраўніка Брэсцкага аблсельгасхарча Леанід Марыніч.

— Працаваць на сябе — гэта адна справа, а калі на табе ляжыць цяжар адказнасці за калектыў, то тут іншая гаворка. Неабходна людзям выплачваць зарплату, думаць пра сацыяльныя паслугі... і на асабістае жыццё часу не хапае. А для маладых гэты фактар таксама мае значэнне. Вось у СВК «Пяхаўцы» Маларыцкага раёна рэкамендавалі маладога кіраўніка. Крыху папрацаваў і кажа, што трэба ўцякаць. Мы яго падтрымалі маральна, правялі ў гаспадарцы абласны семінар, і чалавек адчуў упэўненасць. Маладым кіраўнікам даецца жыллё, але, галоўнае, не пакідаць іх адзін на адзін з праблемамі.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ**

## З'ЯВІЛІСЯ НОВЫЯ СТАНЦЫІ. РУХ АЎТОБУСАЎ І ТРАЛЕЙБУСАЎ ЗМЕНЕНЫ

Інфармбюро

**У сувязі з падаўжэннем першай лініі Мінскага метрапалітэна пасля адкрыцця новых станцый — «Барысаўскі тракт» і «Уручча» — у мікрараёнах «Уручча» зменены маршруты руху наземнага гарадскога пасажырскага транспарту.**

У прыватнасці, калі гаварыць пра аўтобусныя маршруты, № 13 «ДС Зялёны Луг-6—Макаёнка» не будзе заязджаць у мікрараён «Уручча», яго рух арганізаваны па вул. Мірашнічэнкі, 1-у зав. Кальцова, вул. Кальцова, Лагойскаму тракту, вул. Каліноўскага, вул. Славінскага, вул. Кедышкі, вул. Валгаградскай, вул. Макаёнка. (Інтэрвал руху ў будныя дні — 12 хвілін, у выхадныя — 13—14 хвілін.)

Аўтобусны маршрут № 14 «АВ Маскоўскі—ДС Уручча-4» закрыты. Маршрут № 15 «ДС Славінскага—9-ы км» цяпер пралягае па вул. Славінскага, вул. Кедышкі, вул. Філімонава, пр. Незалежнасці, вул. Каліноўскага, вул. Гінтаўта, вул. Шафарнянскай, пр. Незалежнасці (мясцовы праезд), пр. Незалежнасці (інтэрвал руху ў будныя дні — 11—12 хвілін, у выхадныя — 14 хвілін). Маршруты № 15А «АВ Маскоўскі—9-ы км» і № 15Д «ДС Славінскага—9-ы км» закрытыя. Аўтобусы па маршрутах № 25 «ДС Кульман—ДС Уручча-2» і № 27 «ДС Ангарская-4—Сасновы Бор» будуць хадзіць без змяненняў. Гэтак жа як і аўтобусы па маршруце № 51 «ДС Карбышава—ДС Уручча-4». Маршруты № 33 «АВ Маскоўскі—ДС Уручча-4», № 35 «ДС Зялёны Луг-6—Піянерская», № 51Д «ДС Карбышава—Уручча-3» спыняюць сваё існаванне.

Аўтобусы па маршруце № 55 «ДС Уручча-2—ДС Уручча-4» будуць хадзіць па вул. Русіянава, вул. Нікіфарава, вул. Старынаўскай, пр. Незалежнасці (мясцовы праезд), вул. Шафарнянскай, вул. Гарадзецкай, вул. Гінтаўта (інтэрвал руху ў будныя і выхадныя дні — 10 хвілін). № 64 «Макаёнка—ДС Уручча-2» пакінуты без змяненняў. Маршрут № 71 «Акадэмія навук—ДС Уручча-2» скарачаецца да АВ Маскоўскі (інтэрвал руху адпаведна 10—11 і 13 хвілін). № 71Д «АВ Маскоўскі—ДС Уручча-2» закрываецца, а маршрут № 80 «ДС Карбышава—вул. Рагачоўская» застаецца без змяненняў. Маршрут № 86 «АВ Маскоўскі—пас. Азярышча» скарачаецца да ДС Уручча-4 (з праездам праз ст. м. «Уручча») (інтэрвал руху адпаведна 10—11 і 13 мінут у будныя і выхадныя дні). Маршрут № 99 «ДС Уручча-4—9-ы км» пралягае па вул. Гінтаўта, вул. Шафарнянскай, пр. Незалежнасці (мясцовы праезд), вул. Старынаўскай, вул. Паштовай, вул. Герояў 120-й дывізіі, вул. Рагачоўскай, пр. Незалежнасці (інтэрвал руху адпаведна 4 і 5—6 хвілін). № 139 «ДС Уручча-2—Рагачоўская» (замест маршрута № 99Д) праходзіць па вул. Русіянава, вул. Нікіфарава, вул. Старынаўскай, вул. Паштовай (вул. Панамарова, вул. Вадалажскага — пры руху ў зваротным накірунку), вул. Герояў 120-й дывізіі (інтэрвал руху ў будныя дні — 10—14 хвілін, у суботу — 28 хвілін). № 151 «ДС Уручча-4—Уручча-3» і № 589 «ГЦ Ждановічы—ДС Уручча-2» пакінуты без змяненняў.

Тралейбусныя маршруты па большасці пакінуты без змяненняў. Гэта датычыцца маршрутаў № 37 «ДС Уручча-4—пл. Мяснікова», № 41 «Малініна—ДС Уручча-2», № 42 «Ваўпшасава—ДС Уручча-4», № 61 «Талбухіна—ДС Уручча-2». Тралейбусны маршрут № 42Д «ДС Уручча-4—АВ Маскоўскі» закрыты. Маршрут № 62 «ДС Уручча-2—ДС Уручча-4» пралягае па вул. Русіянава, пр. Незалежнасці (мясцовы праезд), вул. Астрашыцкай (інтэрвал руху ў будныя дні — 3 хвіліны, у выхадныя — 6 хвілін).

**Сяргей СТАРЫНАЎ.**

Заснавальнікі — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» і грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Рэгістрацыйны № 12.

9 ЛІСТАПАДА 2007 г. ПЯТНІЦА № 46 (15497)

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

Прафтэхшкола

# НЕ ХАЧУ Ў БУДАЎНІКІ, А ХАЧУ — У АЎТА-СЛЕСАРЫ

**Змяншэнне колькасці выпускнікоў базавай школы амаль удвая ў параўнанні з папярэднім годам не магло не адбіцца на запаўненні месцаў у прафесійна-тэхнічных навучальных установах. І хоць ва ўсіх рэгіёнах тэрміны прыёму дакументаў у прафтэхустановы былі падоўжаны да 15 верасня, кантрольныя лічбы прыёму ўдалося выканаць па краіне толькі на 89,3 працэнта.**

— Нават у сталіцы поўнасцю змаглі ўкамплектавацца далёка не ўсе прафтэхустановы, — паведаміў журналісту «Звязды» начальнік упраўлення прафесійна-тэхнічнай адукацыі Міністэрства адукацыі Эдуард Ганчар. — Спецыяльнасці на аснове базавай адукацыі былі запоўнены толькі на 83,3 працэнта ад запланаванага.

Сёлета пераважнай формай конкурснага адбору быў конкурс адзнак, указаных у дакуменце аб адукацыі. Нават на тых спецыяльнасцях, дзе ў папярэднія гады для прэтэндэнтаў на навучанне праводзіўся ўступны экзамен, у гэтым годзе вырашылі ад экзамена адмовіцца і абмежавацца конкурсам адзнак у атэстаце — толькі б поўнасцю ўкамплектавацца...

Своечасова змаглі завяршыць прыём у сталіцы толькі прафесійна-тэхнічныя ўстановы сферы абслугоўвання, электронікі, гандлю, бытавога абслугоўвання насельніцтва, кулінарыі, паліграфіі, чыгуначнага транспарту і яшчэ некалькі прафтэхвучылішчаў. А на некаторых спецыяльнасцях, такіх як «аператар сувязі», «кантралёр аддзялення банка», «цырульнік», нават сфарміраваліся конкурсы. Напрыклад, у абітурыентаў, якія паступалі на кантралёра аддзялення банка, сярэдні бал дакумента аб адукацыі склаў 8,7.

Акрамя таго павышаным попытам у моладзі карысталіся такія прафесіі як «памочнік машыніста цеплавоза і электравоза», «праваднік пасажырскага вагона», «білетны касір», «эксплуатацыя і рамонт аўтамабіляў».

Але самымі вострадэфіцытнымі для Мінска на сённяшні дзень з'яўляюцца будаўнічыя прафесіі, што звязана з ростам аб'ёмаў у сталіцы будаўніцтва. Між іншым, маладыя людзі выбіраюць будаўнічыя прафесіі зусім неахвотна. Увогуле ў прыярытэтах падрастаючага пакалення назіраюцца апошнім часам пэўныя перакосы. Мала хто з маладых людзей жадае прысвячаць сваё жыццё фізічна цяжкім прафесіям ці некамфортным з пункту гледжання ўмоў працы.

Некаторыя разглядаюць прафтэхшколу як тупік у сваёй прафесійнай кар'еры і першапачаткова зарыентаваныя на атрыманне вышэйшай ці сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Тым больш што вышэйшая адукацыя стала ў нашай краіне масавай. І няцяжка прадказаць, што ўсяго праз два гады, калі сёлетнія выпускнікі базавай школы пераўтворацца ў выпускнікоў сярэдняй школы, за свайго абітурыента прыйдзецца змагацца ўжо нават вышэйшым навучальным установам.

Сур'ёзныя праблемы назіраліся сёлета з запаўненнем месцаў у прафтэхустановах, якія рыхтуюць кадры для машынабудаўнічай галіны, лёгкай і перапрацоўчай прамысловасці і сельскай гаспадаркі. Яно і зразумела, бо выпускнікоў сельскіх школ становіцца з кожным годам усё менш, а гараджан на спецыяльнасці, звязаныя з сельскай гаспадаркай, наўрад ці заманіш. З добрымі вынікамі на фініш прыёмнай кампаніі прыйшлі Брэсцкая і Магілёўская вобласці. У Гомельскай вобласці кантрольныя лічбы набору на аснове базавай адукацыі ўдалося выканаць на 93 працэнты, затое на аснове агульнай сярэдняй адукацыі — на 106 працэнтаў.

— Увогуле па краіне кантрольныя лічбы прыёму на спецыяльнасці на аснове агульнай сярэдняй адукацыі мы выканалі на 103,7 працэнта, — паведаміў Эдуард Ганчар. — І нас гэта вельмі радуе, таму што ўжо праз год рынак працы атрымае кваліфікаваныя рабочыя кадры. — Да таго ж прыём на аснове агульнай сярэдняй адукацыі будзе працягнуты ў чацвёртым квартале гэтага года, каб прафесійна-тэхнічную адукацыю маглі атрымаць хлопцы, якія дэмабілізаваліся з радоў Узброеных Сіл і іншыя катэгорыі грамадзян, якія пажадаюць атрымаць рабочую прафесію.

Эдуард Ганчар падкрэсліў, што важнасць сістэмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі для беларускай эканомікі вызначаецца найперш структурай занятага насельніцтва, у якой рабочыя складаюць да 60 працэнтаў. Таму трэба выкарыстоўваць розныя формы прафесійнай падрыхтоўкі і не толькі моладзі, але і дарослага насельніцтва. Гэта можа быць завочнае, вячэрняе ці кароткатэрміновае навучанне. Дарэчы, 70 працэнтаў навучальных устаноў прафесійна-тэхнічнай адукацыі маюць аддзяленні па навучанні дарослых.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# ПРЫВІТАННЕ ПРАЦОЎНАГА ЛЕТА



Фота Сяргея ХАЛАДЗІЛІНА, БЕЛТА.

**Ушанаванне пераможцаў абласнога конкурсу на лепшы студэнцкі атрад адбылося ў Гомелі. Лепшыя студэнцкія атрады вызначаліся па выніках летняй працоўнай акцыі «Працоўны семестр-2007». Лепшым студэнцкім атрадам Гомельскай вобласці прызнаны атрад імя Аляксандра Ясенкі Рэчыцкага раённага камітэта БРСМ. У намінацыі «Лепшы сельскагаспадарчы атрад» перамога дасталася атраду імя Віктара Оськіна з Гомеля (Навабеліцкі РК АТ «БРСМ»). У Гомельскай вобласці ў гэтым годзе больш як 7 тыс. маладых людзей былі працаўладкаваны ў валанцёрскія, экалагічныя, сельскагаспадарчыя, будаўнічыя атрады як унутры краіны, так і за яе межамі.**

***НА ЗДЫМКУ: байцы студэнцкіх атрадаў Таццяна ПРАКОПЧЫК, Юлія МАРЫТНЕНКА, лепшы камандзір студэнцкага атрада Гомельскай вобласці — студэнт БДУ Аляксандр ГАВЕЙКА і Людміла КРУПЕЙЧАНКА.***

# КНІГУ ЗАМЯНЯЕ КАМП'ЮТАР,

## *або Што чытае сучасная моладзь?*

**На адным са шматлікіх сайтаў нядаўна зазначыў дыскусію з нагоды таго, ці ёсць будучыня ў сучаснай кнігі. Прыхільнікі таго, што кніга мае права быць у нашым жыцці, сцвярджалі, што друкаваны ліст ніколі не знікне. У людзей заўсёды будзе жаданне паляжаць на зручнай канапе з кнігай у руках. Іх апаненты сцвярджалі, што кнігі будуць, але толькі ў электронным варыянце. Інтэрнэт, маўляў, хутка развіваецца, за ім будучыня. Цікава, што ўдзельнікамі гэтай дыскусіі былі маладыя людзі.**

Ёсць або няма будучыні ў кнігі, пакажа час. А пакуль жа я вырашыў высветліць, што ж чытае сучасная моладзь. Для гэтага правёў апытанне сярод моладзі, схадзіў у кнігарню, а таксама бібліятэку. Вынікі зробленай працы былі чаканымі, але трохі незвычайнымі.

Цяжка адзначаць, але аматараў кнігі сярод маладога пакалення куды менш, чым сярод старэйшага. Моладзь часцей за ўсё чытае вузкаспецыялізаваную літаратуру, неабходную для вучобы або прафесійнага росту. Ім прасцей звярнуцца не да кнігі па інфармацыю, а да камп'ютара. Так атрымалася, што кнігу пачалі замяняць найноўшыя тэхналогіі. Магчыма, гэта звязана з тым, што ў моладзі іншае разуменне жыццёвых каштоўнасцяў. Іх погляды карэнным чынам адрозніваюцца ад бачання ўсяго іх бацькамі.

Вось некалькі каментарыяў наконт таго, чым захапляецца сучасная моладзь.

***Настасся Карацеева, студэнтка Белдзяржуніверсітэта:***

— Так склалася, што срэбра мне больш падабаецца, чым золата. Ва ўсім. Так і ў літаратуры, мне больш падабаюцца творы аўтараў сярэбранага веку. Падабаюцца за свой псіхалагізм, сімвалізм, імпрэсію, новыя формы, простыя ісціны, сказаныя хоць і ў двухтысячны раз, але інакш... У сучаснай літаратуры ёсць таксама шмат чаго цікавага. Але асабіста я лічу, што ўсё новае — гэта добра забытае старое. Магчыма, што праз некаторы час аб нашых сучасніках будуць гаварыць як пра класікаў, мэтраў літаратуры... Але гэта будзе потым. Зараз жа мне цікава чытаць творы Дастаеўскага, Горкага, Буніна, Тургенева, Блока, Заля. Класіка — гэта літаратура не толькі для душы, але і для асэнсавання жыцця.

***Інга Несцяронак, студэнтка Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта:***

— Я, пэўна, буду не зусім арыгінальнай, але скажу, што чытаю ў асноўным навучальную літаратуру. Справа ў тым, што мая прафесія — урач. І я лічу, што павінна ведаць калі не ўсё, то пераважную большасць з таго, што датычыцца маёй прафесіі. Мне ж трэба будзе лячыць людзей, ратаваць іх жыцці. А якім я буду практыкам, калі не буду ведаць тэорыю. Не, вядома, я чытаю і творы для душы. Часцей за ўсё гэта класіка. Мае знаёмыя таксама не асабліва захапляюцца чытаннем кніг для душы. Асноўная праблема — недахоп часу. Думаеш, што потым, калі скончыш вучыцца, прачытаеш тое, што хацелася прачытаць раней. Але як паказвае практыка, тады ўжо будзе не да чытання: праца, сям'я, дом...

***Антон Трафімовіч, студэнт Белдзяржуніверсітэта:***

— Чытаю зараз не так шмат, як хацелася б. У пачатковай школе, думаю, і то больш чытаў. З апошніх кніг, што прачытаў, магу адзначыць «Стары і мора» Хемінгуэя і «Гук сонечнага гадзінніка» Ханы Аніронікавай. Гэта тое, што спадабалася. Ёсць і творы, у якіх я проста расчараваўся. Да іх ліку можна аднесці твор «Сабор Парыжскай божай мацеры» Гюго. Хоць, можа, я не зразумеў гэты твор (раман здаўся мне казкай). Вельмі падабаецца малая проза. Эсэ. З нядаўніх пор стаў рэгулярна чытаць «Меркаванні» на адным з парталаў naviny.by. Фантастыку, дэтэктывы ніколі не ўспрымаў.

***Вольга Баранчук, студэнтка Белдзяржуніверсітэта:***

— Мае літаратурныя перавагі змяняюцца кожны тыдзень. Усё залежыць ад таго, што задаюць ва ўніверсітэце. Зараз, напрыклад, чытаю раман Эміля Заля.

Гэта меркаванні самой моладзі. Як мы бачым, літаратурныя перавагі розныя. Толькі вось усіх студэнтаў аб'ядноўвае адно. Большасць з іх чытае толькі тое, што задаюць ва ўніверсітэце. Магчыма, таму, што больш ні на што не хапае часу. Я вырашыў спытаць у прадаўцоў кніг, што чытае сучасная моладзь, якія кнігі карыстаюцца найбольшай папулярнасцю сярод маладых людзей. Для гэтага адправіўся на кніжны кірмаш «Белэкспа». Сваім меркаваннем са мной падзялілася прадавец кніг Святлана, на прылаўках у якой можна знайсці практычна ўсё — пачынаючы ад кніг па псіхалогіі і заканчваючы творамі на ваенную тэматыку. Святлана са мной падзялілася:

— Сучасная моладзь цікавіцца практычна ўсім. Апошні час, напрыклад, многія сталі захапляцца практычнай псіхалогіяй. Прычым не як часткай вучэбнага плана, а як літаратурай для самаразвіцця. І гэта не можа не радаваць. Вельмі часта сталі цікавіцца творамі на ваенную тэматыку. Гэта ў асноўным хлопцы. На «ўра» ідуць кнігі з серыі «Сто вялікіх». У кожнай з гэтых кніг распавядаецца пра сто вялікіх акцёраў, футбалістаў, спартоўцаў, кампазітараў... Пагадзіцеся, гэта вельмі цікава. У мяне, праўда, няма мастацкай літаратуры. Спытаецеся ў каго-небудзь яшчэ.

**(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ»).**

# У ВАС ДЭПРЭСІЯ? А НАВОШТА ЯНА ВАМ?..

**Кажуць, што жыццё — нібыта зебра: то чорная паласа, то белая. Вось і ў мяне, напэўна, настала ў жыцці не самая светлая паласа: ва ўніверсітэце завалілі рознымі тэстамі ды рэфератамі, а тут яшчэ курсавую працу пісаць трэба... Дыхнуць няма калі, круцішся як тая вавёрка ў коле, а ўсё роўна перарабіць усяго не можаш. Ды тут яшчэ з дзяўчынай пасварыўся, ходзім адно на аднаго надзьмутыя. От выйшаў я раз у такім стане на вуліцу, а там — халодны вецер працінае цела наскрозь нават праз зімовую куртку ды з неба сыплецца ці то снег, ці то дождж... Паўсюль мокра, слізка і халадна, а аўтобус, як на ліха, недзе згубіўся ў лабірынтах гарадскіх вуліц. Памёрз я хвілін з дваццаць на прыпынку і вырашыў: «А ну ўсё да чорта! Хопіць з мяне! Сыходжу ў дэпрэсію!..»**

Але дабраўшыся дадому і адпаіўшы свой гаротны арганізм гарбатай, вырашыў пачакаць кідацца ў дэпрэсію, а пакуль больш даведацца пра яе, бо мы часта кажам фразы накшталт маёй «Сыходжу ў дэпрэсію!», а што гэта за звер і адкуль у яго ногі растуць — не задумваемся.




Аказваецца, яшчэ жрацы Егіпта ў IV тысячагоддзі да н.э. лячылі людзей ад паталагічнага стану журботы, а герой Гамераўскай «Іліяды» Беларафонт «по Алейскому полю скитался кругом, одинокий, сердце глодая себе, убегая следов человека». А як лячылі дэпрэсію! Натуральна, што сучасныя антыдэпрэсанты з'явіліся толькі 50 гадоў таму, і чалавецтва за сваю гісторыю звярталася да шматлікіх спосабаў лячэння. Вось, напрыклад, старажытныя грэкі лячылі дэпрэсію травамі, асабліва настоямі мандрагоры або марозніку, а вось урачы XVIII стагоддзя ў Германіі спрабавалі пазбавіць сімптому меланхоліі (а менавіта так раней называлі дэпрэсію) хворых даволі дзіўным спосабам: іх прывязвалі да стулаў і колаў, якія круціліся, бо меркавалася, нібы цэнтрабежная моц можа дапамагчы. Дый наогул, трапляць у рукі псіхіятра да самага пачатку XX стагоддзя было небяспечна: дактары лічылі, што моцны фізічны боль адцягвае ўвагу хворых ад болю душэўнага, таму голад, збіванне, трыманне на ланцугу — цалкам прывычныя медыцынскія метады для тых часоў. Кажуць таксама, што так нават лячылі англійскага караля Георга III, калі той стаў вар'ятам: па парадах лепшых лекараў Еўропы яго жорстка... збівалі. Вось падчас адной такой працэдуры кароль і памёр.

Безумоўна, часы зараз не тыя, медыцына ў нас іншая, больш гуманная, і, начытаўшыся такіх жахаў, я такі вырашыў звярнуцца па інфармацыю да спецыялістаў. І вось што мне паведаміла **Аксана ЛАЗОЎСКАЯ, урач-псіхатэрапеўт 33-й студэнцкай паліклінікі горада і Мінскага гарадскога цэнтра пагранічных станаў:**

— Дэпрэсія — гэта стан, які характарызуецца зніжэннем настрою, здольнасці канцэнтрацыі ўвагі, самаацэнкі і ўпэўненасці ў сябе, а таксама стратай звычайных інтарэсаў. Да чалавека ў гэтым стане могуць прыходзіць ідэі віны і самапрыніжэння, будучыня здаецца змрочнай і нават узнікаюць думкі пра нежаданне жыць. Часта дэпрэсія суправаджаецца парушэннем сну, зніжэннем апетыту і павышанай стамляльнасцю.

Існуюць тры перыяды ў жыцці чалавека, калі ён найбольш схільны да дэпрэсіўнага настрою: юнацкі, сярэдні і пенсійны ўзрост. Так, юнакі заканчваюць школу, ім трэба вызначацца ў жыцці, вучыцца, працаваць. Ды яшчэ не заўсёды атрымліваецца пабудаваць адносіны з процілеглым полам, з бацькамі. Важна адзначыць, што ў юнацкім узросце дэпрэсіі праходзяць нетыпова з-за нясталасці эмацыянальных структур: на першым плане можа быць не дрэнны настрой, а зніжэнне самаацэнкі, незадаволенасць сабой і змрочныя думкі пра будучыню. Падлеткі задумваюцца над сэнсам жыцця і сумняваюцца, ці варта жыць далей. Таму і кідаюць універсітэт, пачынаюць прымаць наркотыкі... У сярэднім узросце, калі чалавек ужо пражыў 30—40 гадоў, ён пачынае падводзіць вынікі сваёй маладосці — чаго дасягнуў, якую пасаду займае і гэтак далей. І нарэшце, у пенсійным узросце людзі таксама схільныя да дэпрэсіі з-за самога факта выхаду на пенсію, з-за таго, што дзеці пакідаюць бацькоў, можа, з-за незадаволенасці сваім жыццём, з-за пагаршэння здароўя... Дарэчы, паводле статыстыкі, дэпрэсія ў жанчын бывае ў два разы часцей, чым у мужчын. Але я звязваю гэта з тым, што слабая палова чалавецтва больш часта звяртаецца па дапамогу.

***— Аксана Яўгенаўна, а як чалавеку даведацца, што ў яго сапраўды дэпрэсія?***

— Для гэтага трэба пабываць на прыёме ў спецыяліста. А вось насцярожыцца варта пры пагаршэнні свайго настрою. Калі на працягу прыкладна двух тыдняў чалавек прачынаецца раніцай і змрочна сябе адчувае, і дзень яго не радуе, і ў жыцці нічога не цікавіць, і няма жадання бачыць іншых людзей, ды яшчэ апетыт або знізіўся або павялічыўся, галава баліць — то абавязкова трэба ісці да спецыяліста. Лепей лішні раз звярнуцца, пракансультавацца, параіцца, чым самому мучыцца і думаць, маўляў, «вось я сам павінен справіцца». Дэпрэсія — гэта сур'ёзная хвароба, якая патрабуе адпаведнага лячэння ў спецыяліста. Бо апендыцыт сам сабе ніхто не выразае, вось і не трэба недаацэньваць дэпрэсію.

***— Раскажыце пра курс лячэння дэпрэсіі.***

— Калі чалавек своечасова звярнуўся па дапамогу, то мінімальны курс — месяц. А наогул курс прыёму антыдэпрэсантаў для замацавання эфекту лячэння і папярэджання паўтарэння складае ад шасці месяцаў да трох гадоў. У шэрагу гарадскіх паліклінік працуюць урачы псіхатэрапеўты, у нас ёсць Мінскі гарадскі цэнтр пагранічных станаў (вул. Мендзялеева, 4, тэл. рэгістратуры 235 61 74). І кваліфікаваная дапамога будзе аказана абсалютна бясплатна — як амбулаторнае лячэнне ў паліклініцы, так і стацыянарнае ў аддзяленні неўрозаў.

***— Як наша насельніцтва адносіцца да наведвання псіхатэрапеўта?***

— Па-рознаму. Яшчэ застаецца страх перад псіхатэрапеўтамі. Але я адразу хачу сказаць, што лячэнне ў нас добраахвотнае, канфідэнцыйнае, а звесткі, якія расказваюць нам людзі, закрытыя нават для іншых урачоў, бо мы ніякай інфармацыі з кабінета не выдаём. Звяртанне да псіхатэрапеўта ніяк не паўплывае ні на атрыманне вадзіцельскіх правоў, ні на вызначэнне прафесіі. Нагадаю яшчэ раз, што сілай тут лячыць вас ніхто не будзе, калі чалавек здаровы, то мы ніякіх прэтэнзій да яго не маем.

***— А ці ўсе вылечваюцца ад дэпрэсіі?***

— Усё залежыць ад чалавека. Як яму самому захочацца, бо гвалтам здаровы не будзеш. Але хачу сказаць, што дэпрэсіі лечацца даволі паспяхова.

***

Карацей, я зразумеў: галоўнае — прызнацца самому сабе, што ў цябе сапраўды нешта сур'ёзнае, пераадолець стэрэатыпы нашага грамадства наконт псіхатэрапеўтаў ды псіхолагаў і звярнуцца па дапамогу. Дарэчы, неабавязкова ісці адразу ў паліклініку. Напрыклад, студэнты Белдзяржуніверсітэта могуць звярнуцца ў псіхалагічную службу БДУ, дзе іх уважліва выслухаюць і паспрабуюць дапамагчы. Вось што расказаў **начальнік псіхалагічнай службы БДУ Руслан ПАПОК:**

— Да нас студэнты звяртаюцца з двума тыпамі дэпрэсій — сітуацыйнымі з-за нейкіх няўдач падчас сесіі і адносінаў з іншымі людзьмі, а таксама сезоннымі. Змагацца з першымі даволі цяжка, бо трэба спачатку знайсці прычыну, а потым яе ліквідаваць. А, напрыклад, калі дэпрэсія з-за дрэнных адносінаў з іншым чалавекам, то такія адносіны трэба выбудоўваць на новым узроўні, а гэта дастаткова доўгі і няпросты шлях. Што датычыцца сезонных дэпрэсій, то тут усё трохі лягчэй. Сама прырода дапамагае. Як выпадзе першы снег пасля восеньскіх зацяжных дажджоў або зялёныя лісткі з'явяцца пасля вясенняй слоты, то і на душы весялей становіцца, і ў такі перыяд чалавеку прасцей аказаць дапамогу.

Галоўнае, абавязкова трэба звяртацца да спецыяліста. Бо сябры і сваякі могуць дапамагаць на ўзроўні перажыванняў, а можа стварыцца такая сітуацыя, што гэтыя перажыванні накладуцца на вашы і становішча толькі пагоршыцца.

Вось і атрымліваецца, што калі не звяртаць увагу на дэпрэсію, то з ёй можна даволі доўга існаваць і нават не падазраваць аб радасным жыцці без чорных думак і заўсёды дрэннага настрою. Так што калі вас дасталі дрэннае надвор'е, аўтобусы, якія вечна спазняюцца, праца без перадыху ды іншы негатыў, знайдзіце вольную часіну і завітайце з візітам да спецыяліста. Можа, усё і не так дрэнна, як вам здаецца, і вы нарэшце зможаце не прылічваць сябе да 121 мільёна чалавек, якія пакутуюць ад дэпрэсіі па ўсім свеце, паводле дадзеных Сусветнай арганізацыі аховы здароўя.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

# Урокі дабрыні ў... калоніі

**У кабінеце беларускай мовы і літаратуры віцебскай ВК № 1 адбылася незвычайная падзея. Настаўніца беларускай мовы Вольга Мікалаеўна Сушанава, якая, дарэчы, адзначыла 25-годдзе сваёй працы ў сярэдняй школе № 26 пры калоніі, і малады афіцэр — начальнік атрада Дзмітрый Алейнікаў сумесна правялі першыя заняткі. Яны цяпер праходзяць па рэкамендацыі Дэпартамента выканання пакаранняў МУС Беларусі. На думку аўтараў ідэі, «звязка» на занятках педагог і выхавальнік такім чынам дазволіць зрабіць найбольш эфектыўная.**

Нетыповы ўрок у тыповым кабінеце звычайнай сярэдняй школы, дзе вучацца каля 290 чалавек. На сценах фатаздымкі вядомых беларускіх пісьменнікаў і паэтаў. Вось радкі Пімена Панчанкі: «Без чалавечнасці не будзе вечнасці». Выхаванцы ціхенька сядзяць за партамі і ўдзельнічаюць у мерапрыемстве. Яны падарожнічалі па астравах дзяцінства, дабрыні, надзеі. У працэсе адзін з асуджаных падлеткаў расказаў, што ў дзяцінстве марыў, каб на яго роднай вуліцы паклалі новы асфальт, ён уступіць у шлюб і будзе на руках насіць сваю каханую, ходзячы па гэтым асфальце. Другі успомніў, што бацька яго равесніка, калі выйграў вялікія грошы ў латарэйнай гульні, адмовіўся ад іх і аддаў на дабрачынныя мэты — перадаў дзіцячаму дому. Хлопцы падбіралі сінонімы да слова «дабрыня»: «любоў», «чалавечнасць». Завочна прасілі прабачэння ў сваіх родных за тое, што трапілі ў калонію.

Такія заняткі праводзяцца на конкурснай аснове. Журы ўзначальвае начальнік ВК № 1, падпалкоўнік унутранай службы Аляксандр Гаралёў. Заняткі, куды запрасілі журналіста «Звязды», ацэньваў і старшы інспектар упраўлення Дэпартамента выканання пакаранняў МУС па Віцебскай вобласці Сяргей Шахурын, які даў высокую ацэнку рабоце настаўніцы Вольгі Сушанавай.

Мяне потым правялі па корпусах калоніі. Тут утульна і цёпла, нават акварыум ёсць у бытавым памяшканні. Пазнаёміліся з мясцовым паэтам Іванам, які паказаў мне свае вершы. Усяго ў калоніі перавыхоўваюцца больш за 380 падлеткаў ва ўзросце ад 14 да 21 года. Параўнальна вялікая колькасць асуджаных ва ўзросце за 20 тлумачыцца тым, што лепшым асуджаным даюць магчымасць поўнасцю адбыць свой тэрмін пазбаўлення волі ў калоніі. У ПТВ пры калоніі рыхтуюць рэзчыкаў па дрэве і іншых спецыялістаў. У швейным цэху хлопцы шыюць пасцельную бялізну, спецадзенне, так што калонія сама сябе ўсім гэтым забяспечвае, ды і за вароты калоніі адпраўляецца прадукцыя.

Жыццё ў калоніі строга па раскладу. Пад'ём у 6.30, потым выхад на зарадку. Увесь дзень нечым занятыя. Адбой у 22.30. Кормяць тут тры разы на дзень. У ліку іншага прапаноўваюць з'есці кексы, выпіць сок. Многія выхаванцы дома такога і ўявіць сабе не маглі. Па суботах у калонію прыязджае аўталаўка. Паколькі грошы мець асуджаным забаронена, гандляр, ведаючы, колькі на «асабістым рахунку» кожнага ёсць рублёў, і абслугоўвае. На такі «рахунак» «залічаюцца» грошы, афіцыйна заробленыя падчас работы ў вытворчых майстэрнях калоніі.

Традыцыйна праводзяцца сустрэчы з роднымі. Але ж ёсць і «ноў-хаў»: за добрыя паводзіны выхаванца могуць адпусціць у горад у суправаджэнні афіцэраў, каб наведаць нейкае культурнае мерапрыемства, паесці марожанае ў кавярні..

Сярод былых выхаванцаў ёсць нямала паважаных людзей. Ветэраны службы ўспамінаюць, што нават будучы камандзір савецкай падводнай лодкі ўтрымліваўся тут. Кожнаму падлетку, хто парушыў закон, дзяржава дае шанц стаць чалавекам. Было б жаданне, а дарослыя ў калоніі ва ўсім дапамогуць.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# ХТО СПЯВАЎ ЗА ЎСЮ ДЫВІЗІЮ І СЛУЖЫЦЬ НА СЦЭНЕ?

## Беларускія эстрадныя зоркі расказалі аб сваёй сувязі з арміяй

ПлацдАРМ



**Хоць 90-годдзе Узброеных Сілаў Беларусі выпадае на 2008-ы, святочныя мерапрыемствы, якія прысвячаюцца юбілею, ужо адбываюцца. Неўзабаве на экраны выйдзе новы мастацкі фільм аб арміі (яго працоўная назва «Шчыт Айчыны»). З'явіцца новы літаратурны альманах «Армія і культура». Будзе арганізавана выстава твораў ваенных мастакоў. Адбудзецца фінал Усеармейскага тэлевізійнага фестывалю салдацкай песні. Яго лаўрэаты возьмуць удзел у канцэрце, які будзе прысвечаны юбілею Узброеных Сілаў Беларусі. У лютым падвядзяцца вынікі творчага конкурсу на лепшае асвятленне ваеннай тэматыкі ў СМІ. Днямі ж у Мінску быў прэзентаваны тэлевізійны музычны праект «Айчыне служым!» (яго арганізавалі Міністэрства абароны, Мінскі гарвыканкам, Белтэлерадыёкампанія і БРСМ).**

Тыя, хто далучыўся 7 лістапада да гэтай акцыі, змаглі пазнаёміцца з выставай рарытэтнай і сучаснай ваеннай тэхнікі, пабачыць паказальныя выступленні ваенных, пакаштаваць армейскай кашы. Уваход у сталічны Палац спорту на канцэрт з удзелам знакамітых беларускіх калектываў і выканаўцаў (ансамбль «Песняры», гурт «Тяни-Толкай», Ірына Дарафеева, Іна Афанасьева, браты Хлястовы і іншыя) быў свабодным. Як адбіраліся выканаўцы? Начальнік прэс-службы Міністэрства абароны палкоўнік Вячаслаў Раменчык растлумачыў, што ў першую чаргу ўлічвалася жаданне саміх спевакоў стаць удзельнікамі праекта «Айчыне служым!»: «Калі мы праводзілі першую акцыю «Дэмбельскі альбом», мы сапраўды запрашалі артыстаў, але на «Дэмбельскі альбом-2» і гэты праект яны добраахвотна адгукаліся самі, бо сапраўды хацелі выступіць для ваенных». А ці ўсе гэтыя аматары сапраўды служылі Айчыне?



У самага юнага ўдзельніка акцыі Андрэя Кунца, зразумела, усё яшчэ наперадзе. Хлопец прызнаўся карэспандэнту «Звязды», што абавязкова пойдзе служыць, бо «адтуль вернешся сапраўдным мужчынам, а без арміі мужчына не мужчына». Якім канкрэтна войскам ён сам аддаў бы перавагу, юнак яшчэ не гатовы адказаць. Саліст дзяржаўнага ансамбля «Песняры» Валерый Скаражонак паведаміў, што сам не служыў з-за стану здароўя: «Да ваенных я стаўлюся з павагай і таму хацеў бы бачыць у будучым свайго 10-гадовага сына абаронцам Айчыны, афіцэрам. Я параіў яму паступаць у Мінскае ваеннае суворaўскае вучылішча.» Андрэй Хлястоў сапраўды аддаў даніну Айчыне, праўда спяваючы: «Служыў я ў 51-й гвардзейскай ракетнай дывізіі ў Асіповічах. У арміі я быў запявалай», — узгадаў спявак. Брат Андрэя, Аляксей Хлястоў, як і салісты гурта «Тяни-Толкай», не служылі. «Мы выконваем свой ваенны абавязак па-іншаму, — перакананы Кірыл Клішэвіч з «Тяни-Толкай», — нам асабіста міністр абароны сказаў, што мы служым сваімі патрыятычнымі песнямі. Нам прыемна выконваць іх для ваеннай публікі, бо яна самая ўдзячная: у арміі ж не кожны дзень канцэрты. Калі б у нас быў жаночы калектыў, то ў час выступленняў нас бы прымалі яшчэ лепей!» Іна Афанасьева, зразумела, не служыла, але паведаміла цікавы факт з гісторыі сваёй сям'і: «Мой прапрапрадзед быў генералам. Служыў ён у царскай арміі. Мікалай другі нават узнагародзіў яго зямлёй пад Магілёвам». Спявачка падзялілася ўласным назіраннем, маўляў, жыццё артыстаў і ваенных вельмі падобнае, бо тыя і іншыя ў раз'ездах. Пэўна, самы ваенны дуэт на беларускай эстрадзе, «Механіка», таксама не служыў. «Мы з Дзімам паступілі ў інстытуты, таму не трапілі ў армію, — тлумачыць Ягор Борыкаў. — Аднак мы служым на сцэне, аб'ездзілі, мабыць, усе беларускія часці, нават некаторыя расійскія і ўкраінскія. Нас заўжды сустракаюць як ваенных, а не звычайных эстрадных артыстаў». «Дарэчы, мы зараз запісваем новы трэк, які прысвячаецца пагранічнікам, — далучыўся да гутаркі Дзмітрый Кірыенкаў. — Плануем зняць на новую песню кліп на сапраўднай заставе».

Якая ваша любімая армейская песня? Я, шчыра кажучы, губляюся, калі спрабую адказаць на гэта пытанне, бо выбраць адну не магу. А вось нашы артысты без ваганняў назвалі самую лепшую на іх погляд песню. У Андрэя Кунца яна з уласнага рэпертуару — «Армія магутная», у гурта «Механіка» свая — «Прысяга», бо «без яе не абыходзіцца армейскае жыццё». У Валерыя Скаражонка — «Вяртанне» Уладзіміра Мулявіна, які сам быў дзіцем вайны, 1941 года нараджэння. У Кірыла Клішэвіча — песня «Смуглянка» з фільма «У бой ідуць адны старыя». У Іны Афанасьевай — «У солдата выходной, пуговицы в ряд».

**Ірына ПРЫМАК.**
**Фота Вольгі ЛАСКІ.**

# КНІГУ ЗАМЯНЯЕ КАМП'ЮТАР...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Прайшоўшы крыху далей, бачу прылавак з вялізным выбарам мастацкай літаратуры. Тут ёсць практычна ўсё, аб чым можна толькі марыць. Прычым ёсць кнігі як у тонкай вокладцы, так і падарункавыя асобнікі, якія, вядома, і каштуюць даражэй. Праўда, гэта выдатны падарунак. Цікаўлюся ў прадаўца, што ж купляе сёння сучасная моладзь.

*— Што цікавіць сучасную моладзь? Адназначна не магу адказаць. Шмат чаго яе цікавіць. Купляюць класіку. Але гэта часцей за ўсё па навучальнай праграме. Задалі ва ўніверсітэце прачытаць той або іншы твор, тады многія і прыходзяць да нас купляць кнігі. Многіх цікавіць навуковая фантастыка, фэнтазі. Апошні час сталі ўсё часцей пытаць творы Лук'яненкі. Лічу, што шмат у чым гэта звязана з рэкламай фільма, знятага паводле рамана. Сярод моладзі ён стаў культавым пісьменнікам. А некалькі гадоў таму яго ніхто не абмяркоўваў і не купляў яго твора. Заўсёды пытаюць Уэлса, Твэна, Дзюма. З рускіх пісьменнікаў амаль заўсёды захоўвае пазіцыі Бяляеў. Апошні час вялізнай папулярнасцю карыстаецца твор «Гары Потэр». Але думаю, што з часам гэтая цікавасць спадзе. Часта пытаюць дэтэктывы Дар'і Данцовай. Яе творы лёгка чытаюцца. Магу сказаць адно: сучасная моладзь цікавіцца практычна ўсім. Іншае пытанне: ці шмат маладых людзей сярод пакупнікоў. Калі па праўдзе, то не так ужо і шмат.*


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Ну што ж, пасля наведвання кніжнага кірмаша стала зразумела, што наша моладзь цікавіцца практычна ўсім. А як ідуць справы з бібліятэкамі? Ці ходзіць у гэтыя культурныя ўстановы моладзь? Для таго, каб атрымаць адказ на гэтае пытанне, адправіўся ў **Мінскую абласную бібліятэку ім. А.С. Пушкіна.** На мае пытанні адказала вядучы бібліятэкар аддзела абанемента **Галіна Андрэеўна Каптур**.

*— Да нас прыходзіць вельмі шмат студэнтаў, якія бяруць вучэбную літаратуру. Для сябе яны бяруць, у асноўным, навінкі. Гэта — творы сучасных аўтараў, якія на слыху. Я не сказала б, што для душы чытаюць шмат. Не ведаю, можа, яны шукаюць кнігі ў Інтэрнэце. Чытаюць фэнтазі, творы «модных» сучасных аўтараў. Пытаюць Пялевіна, Муракамі, цікавяцца псіхалогіяй, філасофіяй. Вельмі часта бяруць кнігі Карнегі. Калі правесці падзел па палавой прыкмеце, то сярод чытачоў больш за ўсё дзяўчат. Хлопцаў у бібліятэцы зараз вельмі рэдка ўбачыш. Многія гавораць, што з часам кніга знікне. Дакладней, знікне папяровы варыянт, а на змену прыйдзе электронны. Не думаю, што так адбудзецца. Мне падаецца, што электронны варыянт — гэта адно, а звычайная кніга — зусім іншае.*

Падвяду вынікі свайго даследавання. Як высветлілася, літаратурныя прыхільнасці ў сучаснай моладзі вельмі разнастайныя. Некаторыя захапляюцца практычнай псіхалогіяй, некаторыя захоплена чытаюць твор «Гары Потэр». Іншым падабаюцца дэтэктывы Марынінай або Данцовай. Хтосьці любіць фантастыку, а хтосьці цярпець яе не можа. Колькі людзей, столькі і поглядаў на жыццё. Можна толькі зрабіць адну выснову, што чытаць сталі, сапраўды, мала. Асабліва гэта датычыцца хлопцаў, якія практычна не наведваюць бібліятэкі. Можа, сапраўды, друкаваны варыянт кнігі хутка знікне? Наўрад ці... Але факт застаецца фактам. Інтэрнэт і ўсе найноўшыя тэхналогіі паступова выцясняюць кнігу са спісу захапленняў сучаснай моладзі. Не спрачаюся, што ёсць людзі, якім больш прыемна прачытаць чарговую кнігу, чым сядзець у Інтэрнэце. Але такіх не так ужо і шмат. Да гэтай высновы я прыйшоў пасля таго, як правёў апытанне сярод сваіх знаёмых. Калі ўжо студэнты-гуманітарыі чытаюць вельмі мала (толькі той мінімум, які патрабуе праграма), то што ўжо гаварыць аб тых, чыё жыццё звязана з дакладнымі навукамі... Праўда, падчас напісання матэрыялу зазначыў, што літаратурныя перавагі студэнтаў залежаць ад таго, у якой навучальнай установе яны вучацца. Будучыя медыкі чытаюць кнігі, звязаныя з медыцынай, а праграмісты цікавяцца больш літаратурай аб камп'ютарах... Не, з аднаго боку гэта нядрэнна. Толькі вось было б добра, калі б моладзь, акрамя вучэбнай літаратуры, надавала ўвагу і іншай. Гэта трэба для таго, каб быць адукаваным чалавекам, усебакова развітым.

У любым выпадку ўсё залежыць ад кожнага асабіста. Ніхто нікога не будзе прымушаць чытаць той або іншы твор без вашай на тое ахвоты.

**Сяргей ДЗЕВЯТОЎСКІ.**

# МІЛІЦЫІ НАДЗЕЙНЫЯ ПАМОЧНІКІ

Яшчэ зусім нядаўна дружыннікі ўспрымаліся як архаізм, перажытак мінулага. Маладое пакаленне мела ўяўленне аб грамадскіх ахоўніках парадку ў асноўным па вядомых кінакамедыях. Многія памятаюць домакіраўніка, сыгранага ў фільме «Брыльянтавая рука» Нонай Мардзюковай, і Бывалага, у вобразе якога ў «Аперацыі «Ы» перад гледачамі выступіў Яўген Маргуноў. З некаторага часу сустрэчы з людзьмі з нарукаўнымі павязкамі здзіўлення больш не выклікаюць.

На Гродзеншчыне аднымі з лепшых і найбольш шматлікіх з'яўляюцца добраахвотныя дружыны Кастрычніцкага раёна абласнога цэнтра, работа якіх тры гады таму ўзнавілася. Прававой базай для іх дзейнасці стаў Закон Рэспублікі Беларусь «Аб удзеле грамадзян у ахове правапарадку». 28 кастрычніка 2004 года для кіравання грамадскімі фарміраваннямі, каардынацыі іх дзеянняў рашэннем адміністрацыі раёна быў створаны штаб добраахвотных дружын, які нязменна ўзначальвае першы намеснік кіраўніка адміністрацыі Сцяпан Сяргей (С.І. Сяргей). Праз два тыдні былі зарэгістраваны першыя тры дружыны (РПУП «Гродзенская тытунёвая фабрыка «Нёман», ААТ «Гродна Азот» і «Белкард»). У 2005 годзе іх колькасць падвоілася.

Цяпер на тэрыторыі раёна дзейнічаюць адзінаццаць добраахвотных дружын агульнай колькасцю 140 чалавек. Атрады аховы правапарадку вучылішча алімпійскага рэзерву і палітэхнічнага каледжа налічваюць у сваіх шэрагах 15 чалавек. Дружыны сфарміраваны на добраахвотнай аснове з ліку грамадзян, якія дасягнулі 18-гадовага ўзросту і не прыцягваліся да крымінальнай ці адміністрацыйнай адказнасці. Асноўная задача гэтых фарміраванняў — ахова правапарадку. Дружыннікі разам з участковымі інспектарамі міліцыі наведваюць па месцы жыхарства пажылых і адзінокіх грамадзян, кватэры з рэпутацыяй «прытон», асобаў, якія стаяць на прафілактычных уліках, дапамагаюць у рабоце адміністрацыям інтэрнатаў. Выхадам на маршруты папярэднічае інструктаж старшага ўчастковага інспектара міліцыі, які ставіць канкрэтныя задачы. З пачатку гэтага года члены дружын ажыццявілі больш за 1700 выхадаў на дзяжурствы. Пры гэтым аказана дапамога ў затрыманні 37 правапарушальнікаў.

Выхады дружыннікаў на дзяжурствы матэрыяльна стымулююцца — дадаткова аплатныя дні да адпачынку, а таксама грашовая аплата за выхады. Кожнае прадпрыемства па-рознаму заахвочвае сваіх членаў грамадскіх фарміраванняў праваахоўнай накіраванасці. Так, ААТ «Белкард» выплачвае за гадзіну дзяжурства 0,1 базавай велічыні, прадастаўляючы да адпачынку два каляндарныя дні, шклозавод — 0,25 базавай велічыні і два дадатковыя дні адпачынку пры наяўнасці 12 дзяжурстваў за год.

Праваахоўнікі стараюцца не заставацца ў даўгу. Нядаўна на базе аддзела ўнутраных спраў праведзены першы агляд-конкурс добраахвотных дружын раёна. Яны прадстаўлялі дзевяць калектываў. Дружыннікі паказалі свае веды заканадаўства, прадэманстравалі здольнасці ў аказанні першай медыцынскай дапамогі. Пры гэтым набылі дадатковыя навыкі. Лепшыя былі ўзнагароджаны памятнымі падарункамі і атрымалі прэміі. А першае месца заняла дружына ААТ «Гродна Азот». Яе ўзначальвае інжынер гэтага прадпрыемства Ірына Седляр. Члены дружыны штодзённа, акрамя нядзелі, патрулююць вуліцы абласнога цэнтра. За час свайго існавання яны выходзілі на дзяжурствы звыш дзвюх тысяч разоў, аказаўшы міліцыянерам у падтрыманні правапарадку вялікую дапамогу.

Улік работы членаў дружын, вынікі якой падводзяцца штомесяц, вядуць грамадскія пункты аховы грамадскага парадку. Кожнае фарміраванне курыруе найбольш вопытны міліцыянер. Пытанні дзейнасці «грамадскай міліцыі» рэгулярна разглядаюцца на пасяджэннях раённага штаба дружын. Па выніках такіх мерапрыемстваў прымаюцца кіраўніцкія рашэнні, накіраваныя на паляпшэнне работы аб'яднанняў грамадзян праваахоўнай накіраванасці. Нядаўна дзейнасць дружын стала прадметам разгляду раённай адміністрацыі. На пасяджэнні прынята рашэнне, заклікане павысіць эфектыўнасць іх работы. ААТ «Гродна Хімвалакно», «Гродзенскі механічны завод» і РУП «Гродназнерга» загадана да 1 снежня стварыць свае дружыны. Райкам грамадскага аб'яднання «БРСМ» павінен падаць у адміністрацыю дакументы для рэгістрацыі новых маладзёжных атрадаў аховы правапарадку ва ўстановах адукацыі. Штогадовае правядзенне ў першым квартале агляда-конкурсу дружын і прапрацоўка пытання аб замацаванні гэтых грамадскіх фарміраванняў за нарадамі палка ППСМ УУС аблвыканкама даручаны Кастрычніцкаму РАУС. Пашырыцца практыка прыцягнення добраахвотнікаў у якасці сведак пры складанні на парушальнікаў парадку адміністрацыйных пратаколаў, выбіцця ўчастковых інспектараў на сямейныя скандалы. Супрацоўнікі міліцыі бачаць у дружынніках не толькі законапаслухмяных суайчыннікаў, але і надзейных памочнікаў.

**Іван РЫБАК,**
**намеснік начальніка УУС Гродзенскага аблвыканкама.**


Фота БЕЛТА.

## ГРОШЫ НА АДУКАЦЫЮ РАЗМЯРКОЎВАЮЦЦА НЕСПРАВЯДЛІВА

**Аўтары новага даклада Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па пытаннях адукацыі, навукі і культуры (ЮНЕСКА) прыйшлі да высновы, што ў свеце выдаткі на адукацыю моладзі сканцэнтраваны пераважна ў невялікай колькасці краін.**

Напрыклад, бюджэт сістэм адукацыі такіх краін, як Францыя ці Італія большы, чым сумарныя выдаткі на адукацыю ўсіх краін Афрыкі на поўдзень ад Сахары. А там, дарэчы, жыве 15 працэнтаў насельніцтва свету школьнага ўзросту.

Яшчэ больш уражлівы кантраст з выдаткамі ЗША — 28 працэнтаў бюджэту глабальнай сістэмы адукацыі, хоць там жыве толькі 4 працэнты дзяцей і моладзі свету. Аўтары новага даклада тлумачаць гэта значнай колькасцю ўніверсітэтаў і параўнаўча высокім коштам вышэйшай адукацыі ў ЗША. Атрымліваецца, што бюджэт амерыканскай сістэмы грамадскай адукацыі прыблізна роўны сумарным выдаткам на адукацыю арабскіх дзяржаў, краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, Лацінскай Амерыкі і Карыбскага басейна, Паўднёвай і Заходняй Азіі.

Такім чынам, ЗША фактычна з'яўляюцца самым вялікім у свеце манапалістам і інвестарам у сферы адукацыі.

На думку дырэктара інстытута статыстыкі ЮНЕСКА Хендрыка ван дэр Пола, сёння ў свеце паўстала праблема забеспячэння доступу моладзі да адукацыі з сем'яў з абмежаванымі фінансавымі магчымасцямі шляхам выкарыстання такіх механізмаў, як стыпендыі і беспрацэнтныя пазыкі.

**Леанід ТУГАРЫН.**

# КВАДРАМОТАПРАБЕГ — ЗА БЯСПЕКУ РУХУ

**Нават снег, які нечакана выпаў, не перашкодзіў правядзенню ў Мінскім раёне першага квадрамотапрабегу пад сцягам Упраўлення ДАІ Мінскай вобласці і ДТСААФ.**

Калона з дваццаці ўдзельнікамі прабегу рухалася па маршруце «Пасёлак Баравая — Астрашыцкі гарадок», дзе каля мемарыяльнага помніка «Танк» прайшоў урачысты мітынг, прысвечаны 90-годдзю Узброеных Сілаў краіны. Паглядзець на спаборніцтвы і майстар-класы сабралася шмат моладзі.

У квадрамотапрабегу ўдзельнічалі як вопытныя спартсмены, так і юныя. Самаму малодшаму — Данілу Ганчарыку — споўнілася шэсць гадоў. Бацька малога Сяргей жартуе, называе сябе «сямейным трэнерам», бо і старэйшы сын сур'ёзна займаецца гэтым відам спорту. Міхаіл Ганчарык — майстар спорту, пераможца Кубка Балтыі, чэмпіён Латвіі. Хлопцы заўсёды актыўна ўдзельнічаюць у такіх мерапрыемствах, бо лічаць, што не толькі карысна для здароўя, але і спрыяе бяспецы руху.




Паводле слоў намесніка начальніка УДАІ МУС аблвыканкама Міхаіла Акуліча, сёлета было затрымана 898 матацыклістаў, з іх 378 без вадзіцельскага пасведчання, 353 знаходзіліся ў нецвярозым стане. На Міншчыне здарылася 72 ДТЗ з удзелам матацыклістаў, у якіх загінулі дзевяць чалавек і семдзесят сем атрымалі пашкоджанні рознай ступені цяжкасці.

**Марына БЕГУНКОВА. Фота аўтара.**

## Муз-news

# Агурбаш спяе дуэтам?

Нехта з артыстаў сваіх прыхільнікаў шчыра любіць, нехта — успрымае як дадзенасць, нехта нават проста трывае. А вось Анжаліка Агурбаш, у якой існуе некалькі фан-клубаў, з усімі рэгулярна кантактуе, сустракаецца, і нават дае для іх «прэс-канферэнцыі». Адна з іх была прымеркавана да дня нараджэння беларускага фан-сайта www.agurbash.by, якому днямі споўніўся год.

Артыстка расказала прыхільнікам у онлайн-рэжыме, што зараз большасць часу забірае новы праект — супрацоўніцтва з прадзюсарам Максам Фадзеевым. Песня «Дзіма» з будучага альбома была прэзентаваная яшчэ ўлетку, а сам альбом, як мяркуецца, змесціць 11 песень і выйдзе на дзвюх мовах — рускай і англійскай — у студзені—лютым 2008 года. Невядома, ці будзе ён прадстаўлены ў Беларусі — зараз Анжаліка больш выступае ў Казахстане, ва Украіне, на Далёкім Усходзе і ў Маскве. Больш падрабязнай інфармацыі на гэты конт артыстка не збіраецца дзяліцца з прэсай да выхаду альбома ўключна.

На беларускай мове спявачка «з задавальненнем запісала б альбом, калі б кампазітары і паэты напісалі сапраўды добрыя песні». Акрамя таго, Анжаліка падзялілася, што плануе спяваць дуэтам — з дачкой Дашай, у якой прыгожы тэмбр голасу, і прыехаць у найбліжэйшы час у Мінск — але з прыватным візітам, наведаць маму, сына і блізкіх сяброў. Таксама ў планах — удзел у лістападзе—снежні ў выніковых канцэртах «Залаты грамафон» (узнагароды гэтага хіт-параду атрымаюць яшчэ тры беларускія артысты — Дзмітрый Калдун, Б'янка і Сярога), і ўдзел у «Тыдні высокай моды ў Маскве», дзе Анжаліка Агурбаш, прыгадаўшы мадэльнае мінулае, выступіць у дэфіле мадэльера Ілы Шыяна.

**Вядучая рубрыкі Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

# ПАТРЫЯТЫЗМ ПРАЗ ГУЛЬНЮ

Бешанковіцкі райкам БРСМ правёў у пасёлку Ула ваенна-спартыўную гульню «Патрыёт». Каля 60 чалавек узялі ўдзел у розных спартыўных конкурсах. Пераможцы атрымалі ўзнагароды. Менавіта такія гульні прыцягваюць моладзь да ўдзелу ў грамадскім жыцці і з'яўляюцца добрай рэкламай дзейнасці БРСМ.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# БЫЦЬ ВАДЗІЦЕЛЕМ НЯПРОСТА

Недахоп вадзіцеляў аўтобусаў і тралейбусаў адчуваецца ў Мінску.

На прадпрыемстве «Мінсктранс» паведамілі, што сёння ў аўтобусных і тралейбусных парках налічваецца каля 600 вакантных месцаў вадзіцеляў. Тым не менш да кандыдатаў прад'яўляюць строгія патрабаванні, улічваючы іх прафесійныя веды, вопыт практычнай работы, уменне працаваць з людзьмі. На думку спецыялістаў прадпрыемства, цяжкасці ў наборы вадзіцельскага складу звязаны з цяжкімі ўмовамі працы вадзіцеля гарадскога пасажырскага транспарту, напружаным графікам работы і вялікімі псіхалагічнымі нагрузкамі ва ўмовах высокай інтэнсіўнасці дарожнага руху.

**Аляксандр ФІЛІПОВІЧ, «Мінск-Навіны».**

# *Дабрачынны Baby cup*

23 снежня ў сталічным Палацы спорту пачнуцца міжнародныя спаборніцтвы па мастацкай гімнастыцы «Baby Cup». Гэта юбілейны, 10-ы турнір, спонсарам якога на гэты раз выступіць віцебскае абутковае прадпрыемства «Марко». Як паведаміла галоўны трэнер нацыянальнай зборнай па мастацкай гімнастыцы Ірына Ляпарская, усе сродкі, вырučаныя на турніры ад продажу білетаў, пойдуць на дабрачынныя мэты, у прыватнасці на лячэнне цяжка хворай дзяўчынкі ў адным з дзіцячых дамоў. А галоўны спонсар спаборніцтваў «Марко» вылучыць частку сваёй прадукцыі для дзіцячых дамоў Беларусі.

У праграме юбілейнага турніру не толькі спаборніцтвы, але і дыскатэка для юных гімнастак у забаўляльным комплексе «Журавінка», а таксама навагодняя ёлка, куды запросяць выхаванцаў дзіцячых дамоў Беларусі. Наведае турнір дзяржсакратар Саюза Расіі і Беларусі Павел Барадзін, які ўсынавіў двaіх дзяцей. Госцем стане і лёгкаатлет Вадзім Дзевятоўскі, які некалькі гадоў таму ўзяў шэфства над адным з дзіцячых дамоў.

Увогуле дабрачыннасць характарызуе не толькі названы турнір мастацкай гімнастыкі. На прэс-канферэнцыі Ірына Ляпарская прадставіла італьянскага фатографа Гвіда Санцыліо, які папулярызуе беларускую гімнастыку за межамі нашай краіны з дапамогай арыгінальнага календара з беларускімі ледзі памоста. Аднак з Беларуссю італьянца звязвае і сяброўства з Мсціслаўскай школай-інтэрнатам для дзяцей з асаблівасцямі слыху, для якіх Гвіда Санцыліо набыў 15 акустычных пратэзаў.

Сёлетні турнір «Baby cup» пройдзе пад дэвізам «Мары збываюцца». Яго арганізатарамі стануць Міністэрства спорту і турызму, Прэзідэнцкі спартыўны клуб, Беларуская асацыяцыя гімнастыкі, НАК Беларусі.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

## Абітурыент—2008

# «ТРЭНІРОЎКА» З АНАЛІЗАМ ПАМЫЛАК

У Беларускім дзяржаўным універсітэце 11 лістапада распачынаецца чарговы раўнд рэпетыцыйнага тэсціравання, якое арганізавана Інстытутам непарыўнай адукацыі БДУ сумесна з Рэспубліканскім інстытутам кантролю ведаў.

Свае веды будучыя абітурыенты змогуць праверыць па 11 вучэбных дысцыплінах. 11 лістапада ў БДУ пройдзе рэпетыцыйнае тэсціраванне па «Сусветнай гісторыі навейшага часу» і прадмеце «Чалавек. Грамадства. Дзяржава». 18 лістапада — па замежных мовах і геаграфіі, 25 лістапада — па рускай мове, 2 снежня — па беларускай мове. На 9 снежня запланавана рэпетыцыйнае тэсціраванне па матэматыцы і біялогіі. А завяршыцца тэсціраванне 16 снежня. У гэты дзень можна будзе здаць тэсты па гісторыі Беларусі, фізіцы і хіміі. Як бачна, тэсціраванне будзе праводзіцца толькі ў выхадныя дні, каб не перашкаджаць вучэбнаму працэсу ў школе.

Рэгістрацыя ўдзельнікаў рэпетыцыйнага тэсціравання распачалася 1 лістапада ў Цэнтры тэсціравання БДУ па адрасе: вул. Кастрычніцкая, 4. Кошт складае 16 100 рублёў за адну дысцыпліну. Пры жаданні ўдзельнікі рэпетыцыйнага тэсціравання змогуць атрымаць кансультацыю з поўным разборам варыянтаў тэста і аналізам сваіх памылак, але ўжо за дадатковую плату.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## Планета жывёл

# КОНСКІЯ СІЛЫ



За акном XXI стагоддзе. Мы звыкла нервуемся з-за высокіх цэнаў на бензін і салярку, бегаем у пошуках запчастак, глядзім рэкламу, якая прапаноўвае купляць толькі гэтае і ніякае іншае машыннае масла. Аднак, аддаючыся ці то атавізму, ці то звычцы, працягваем вымяраць магутнасць сваіх аўтамабіляў у «конскіх сілах», ды і самі аўто часам называем жалезнымі коньмі.

Але калі задаць сабе пытанне, ці шмат мы ведаем пра «сівак-бурак», што суправаджалі нашых продкаў на працягу тысячагоддзяў, акрамя таго, што адносяцца яны да сямейства няпарнакапытных (хоць і гэта ведаюць нямногія), і што іх угнаенне — лепшае (і гэта, мабыць, ведаюць не ўсе).

Уся гісторыя каня звязана з мясцовасцямі, у якіх яны пражывалі (вучоныя называюць гэта біятопамі), і праходзіла пад знакам пераходу іх з лясоў (дзе продкі коней, яшчэ маленькія, з фокстэр'ера) у стэпы і саваны, якія свайму з'яўленню абавязаны ў тым ліку і коням.

Вы толькі ўявіце сабе шматмільённыя табуны коней, якія перакочваюцца па еўразійскіх стэпах, прычым па стэпах квітнеючых, яшчэ не кранутых плугам і сахой!

Якімі павінны быць адносіны чалавека і каня, чаму мільённыя табуны коней і іншых капытных не выядалі да кораня і не вытоптвалі квітнеючых стэпаў і тундраў, і разам з тым адной каляіны ад гусенічнай тэхнікі дастаткова для таго, каб ператварыць у балота вялікі ўчастак тундры. Будзем спадзявацца, што на гэтыя пытанні можна яшчэ адказаць, бо на Зямлі засталіся яшчэ нашчадкі спачатку дзікіх, а затым прыручаных коней.

Гаворка пойдзе пра ўсім вядомых мустангаў, менш вядомых брамбі і зусім мала вядомых шырокаму колу чытачоў цымаронах — конях, якія былі некалі хатнімі, а затым здзічэлі.

Мустангі! Калі вымаўляеш гэтае слова, то ўзнікаюць карцінкі з жыцця дзікага Захаду: каўбоі ўсе з «Кольтамі 45-га калібру»; індзейцы, якія скачуць па-вар'яцку; орды бізонаў і, безумоўна ж, вялікія табуны грацыёзных коней з грывамі, што развіваюцца.

Аднак пачнём з таго, што мустангі не такія ўжо і грацыёзныя, як прынята пра іх пісаць і іх адлюстроўваць. Гэта даволі нізкарослыя і даволі пузатыя конікі з не надта стройнымі нагамі. Акрамя таго, не ўсе ведаюць, што мустангі — гэта зусім не карэнныя жыхары Паўночнай Амерыкі, а здзічэлыя коні. У Амерыцы яны — другасныя прышэльцы. Таму як уся гісторыя сучасных няпарнакапытных (і цяперашніх коней, і зебраў з асламі, і тапіраў) пачалася менавіта з амерыканскага кантынента. Менавіта адсюль, з прэрый Паўночнай Амерыкі, калісьці спачатку продкі коней, а потым і цяперашнія коні некалькімі патокамі перасеклі Берынгаў праліў (тады на гэтым месцы была суша) і шырока рассяліліся спачатку па Еўразіі, а потым і па Афрыцы. Затым на сваёй радзіме яны зніклі, знішчаныя, па ўсёй бачнасці, асабліва буйнымі драпежнікамі старажытнай Амерыкі.

Зноў коні на амерыканскім кантыненце з'яўляюцца толькі ў XVI стагоддзі, суправаджаючы іспанскіх канкістадораў, а крыху пазней і іншых перасяленцаў і заваёўнікаў з Еўропы.

Некаторыя з гэтых коней здзічэлі і, патрапіўшы ў ідэальныя для жыцця ўмовы, вельмі моцна размножыліся. Яшчэ ў XIX стагоддзі некаторыя табуны мустангаў налічвалі да пяцідзесяці тысяч жывёл, а ўсяго ў прэрыях Паўночнай Амерыкі дзікіх коней жыло не менш як 2 млн галоў.

Вельмі моцна па шматтысячных табунах ударыла, як гэта ні дзіўна, Першая сусветная вайна. Попыт на коней, іх мяса і шкуру павысіўся ў шмат разоў; павысіўся попыт і на збожжавыя культуры — фермеры сталі выцясняць дзікіх коней з прэрый і выкарыстоўвалі гэтыя землі пад ворыва.

Астаткі выгнаных з раўнін мустангаў сталі жыць у цяжкадаступных перадгор'ях амерыканскага Захаду. Але і тут іх застала куля паляўнічых, прычым знішчаліся мустангі з такім запалам, з якім не знішчалася ніводная жывёліна Амерыкі (выключаючы хіба што амерыканскага блукаючага голуба).

Апомніліся амерыканцы толькі ў 60-х гадах мінулага стагоддзя, пасля таго як Федэральнае бюро кіравання зямлёй аб'явіла, што дзікіх мустангаў ва ўсёй Паўночнай Амерыцы засталося не больш як 9 тыс. галоў. Нарэшце, толькі ў 1971 годзе была аб'яўлена поўная забарона палявання на мустангаў, яны былі аб'яўлены нацыянальнай гордасцю, сімвалам непакорнасці і амерыканскай свабоды. Гэтыя захады далі нядрэнныя вынікі, пагалоўе мустангаў стала аднаўляцца і да 80-х гадоў мінулага стагоддзя іх налічвалася ўжо не менш як 50 тысяч галоў.

Акрамя Паўночнай Амерыкі дзікія (дакладней, здзічэлыя) коні сустракаюцца і ў іншых частках свету. Так, напрыклад, у 1535 годзе іспанскі гарнізон быў вымушаны кінуць умацаваны форт (які стаў затым Буэнас-Айрэсам) і ратавацца ўцёкамі пад націскам індзейцаў, што наступалі. У спешцы ў форце былі пакінуты не больш як 7 галоў коней, якія хутка здзічэлі. Праз 45 гадоў канкістадоры зноў адбілі гэту тэрыторыю ў індзейцаў і выявілі ў наваколлі вялікія табуны дзікіх коней — патомкаў тых самых, кінутых. Пачалося тое, што і павінна было пачацца: дзікіх коней (іспанцы называлі іх цымаронамі) сталі пераследаваць з выкарыстаннем усіх сродкаў і метадаў, выцясняючы іх з месцаў, прыдатных для земляробства і культурных паш. Цяпер цымаронаў засталося некалькі соцень, і яны знаходзяцца пад аховай.

Асобна варта сказаць і аб Аўстраліі. Вядома, што ў 1788 годзе губернатар Аўстраліі Артур Філіп прывёз у Порт-Джэксан «кожнай твары па пары» хатніх жывёл з роднай Англіі, сярод іх — жарабца і трох кабыл. Коням у Аўстраліі прыйшлося даспадобы, некаторыя з іх збеглі з канюшняў... А далей здарылася ўсім знаёмая гісторыя: у наступным стагоддзі аўстралійскія раўніны запаланілі вялікія табуны брамбі (так аўстралійцы называюць сваіх дзікіх коней). Аднак затым табуны моцна парадзелі з-за жорсткага на іх палявання і бяскорміцы. Таму як тыя пашы, якія не былі занятыя аўстралійскімі жывёлаводамі, былі падчыстую патраўлены трусамі (таксама, трэба адзначыць, «гасцямі» з Еўропы).

Сустракаюцца здзічэлыя коні і ў Заходняй Еўропе. Напрыклад, на балоцістых раўнінах Камарга створаны запаведнік «дзікіх белых коней» — патомкаў сарацынскіх арабскіх скакуноў. Іх тут ахоўваюць і толькі зрэдку выкарыстоўваюць у гаспадарчых мэтах, выпускаючы на раўніны хатніх кабыл, якіх праз некаторы час адлоўліваюць (робяць гэта для прыліцця свежай крыві хатнім жывёлам).

Сустракаюцца дзікія коні і на некаторых ізаляваных астравах. Так, напрыклад, у водах Атлантыкі ёсць невялікі востраў Сейбл, куды ў мінулым стагоддзі былі завезены поні, якія, вядома ж, здзічэлі. Пры адсутнасці на востраве чалавека гэтыя маленькія конікі там жывуць у дастатку.

А цяпер самае цікавае. Аказваецца, здзічэлыя коні сустракаюцца і ў нас у Беларусі! Дакладней, яны курсіруюць паміж Беларуссю і Украінай па зоне адчужэння ў раёнах, дзе прысутнасць чалавека, самі разумееце, мінімальная. Пра невялікія табункі коней, якія калі-нікалі з'яўляюцца ў раёнах, што прылягаюць да Чарнобыля, і не падпускаюць да сябе чалавека на адлегласць стрэлу, мне расказвалі ўкраінскія міліцыянеры, што бывалі там па службе. Дарэчы, у той раён у 90-х гадах мінулага стагоддзя быў запушчаны і табун па-сапраўднаму дзікіх коней Пржавальскага; магчыма, міліцыянеры іх і зблыталі са здзічэлымі. Аднак коні Пржавальскага зусім не розных масцей. Гаворка, хутчэй, ідзе аб розных відах коней, якія часам з'яўляюцца на гарызонце, па-за дасягальнасцю стрэлу. І правільна робяць.

**Аляксандр АЧАРЭТНІ.**
**Алена АЧАРЭТНЯЯ (фота).**

# НАШ ПАРОЛЬ — 31802!

Цудоўнай традыцыяй у Заводскім раёне г. Мінска стала супрацоўніцтва Палаца пазашкольнай работы «Золак» з вайсковай часцю 31802.

У жыцці кожнага чалавека вельмі важна, хто аказваецца побач з ім у моманты перамог і паражэнняў, пазнання і дасягненняў. Патрэбны мудры, моцны, вопытны настаўнік, які зможа не толькі навучыць, але і натхніць маральна ў цяжкую хвіліну. Як прыклад таму роля каманднага складу вайсковай часці 31802 і непасрэдна яе камандзіра палкоўніка Юрыя Мазура.

Менавіта Заводскі раён першым узнавіў гульню «Зарніца» на ўзроўні раёна, а раённы піянерскі савет установы «Золак» ініцыяваў правядзенне гульні на ўзроўні горада.

Падлеткі пазнаюць на ўласным вопыце будні і святы армейскага жыцця. Дзе яшчэ можна папрацаваць з мінашукальнікам, прайсці паласу перашкод, пераправіцца па паралельных вяроўках, транспартаваць «умоўна параненага»?! А вопытны медінструктар не толькі дапаможа праявіць веды па медыцыне, але і падкажа, як у экстрэмальных умовах выратаваць жыццё чалавеку, выкарыстоўваючы падручныя сродкі. А дзе яшчэ, як не ў вайсковай часці будзе гарманічна выглядаць група, якая бяжыць у процівагазах. Не дзіўна, што тыя, хто пабываў хоць раз на гульні «Зарніца», імкнуцца трапіць у каманду і на наступны год, а ў школах праходзіць вельмі жорсткі конкурсны адбор кандыдатаў у каманду.

Свежае паветра, армейская рамантыка, палявая кухня, адпачынак плячо ў плячо з сябрамі па камандзе, экскурсія па вайсковай часці, «трафеі» ў форме фатаздымкаў і яркіх уражанняў...

**Алена ГАЛАВАНЬ, метадыст па рабоце з дзіцячымі арганізацыямі і аб'яднаннямі Палаца пазашкольнай работы «Золак»,** *г. Мінск.*

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

## ПЯТНІЦА, 16 ЛІСТАПАДА

**1**

**5.35, 15.50 Серыял «Трымай мяне мацней».**
**6.20, 7.10, 8.10** Добрай раніцы, Беларусь!
**6.30, 7.05** Прэс-агляд.
**6.45, 7.45, 20.30** Зона Х.
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 16.00, 18.00, 23.10** Навіны.
**7.30, 8.30** Дзелавое жыццё.
**8.20** Гатуем разам.
**8.35** Сфера інтарэсаў.
**9.05 Серыял «Абарона супраць».**
**10.00 Серыял «Плюс бясконцасць». Заключная серыя.**
**10.55, 16.50 Серыял «Каханне як каханне-2».**
**12.10 Меладрама «Службовы раман». 2-я серыя.**
**13.30** Відэафільм АТН «ВІА Анатоля Ярмоленкі».
**14.00** Гадзіна суда. Справы сямейныя.
**14.45** Nota Bene.
**15.15, 18.10** Навіны рэгіёна.
**15.30 Серыял «Клава, давай!».**
**18.25** Футбол. Адборачны матч чэмпіянату Еўропы U-21. Беларусь—Сан-Марына.
**21.00** Панарама.
**21.45, 1.40 Серыял «Медыум».**
**22.45** «Жорсткая размова».
**23.20** Дзень спорту.
**23.30** Фігуры.
**0.00 Меладрама «Сэкс і больш нічога».**



*Яе планы простыя: выбраць мужчыну для зачацця дзіцяці, правесці з ім ноч і больш ніколі не бачыцца.*

**Н**

**6.00, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 22.45, 3.00** Нашы навіны.
**6.05, 15.00** «Лаліта. Без комплексаў».
**7.05** «Наша раніца».
**9.05 Серыял «Таццянін дзень».**
**10.00** «Модны прыгавор».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.00, 3.20** Навіны спорту.
**11.10, 21.05 Серыял «Не радзіся прыгожай».**
**12.00** «Малахаў+».
**13.10 Серыял «Мая цудоўная няня».**
**13.40** «Федэральны суддзя».
**14.30** «Кантрольная закупка».
**16.15 Серыял «Дачка садоўніка».**
**17.15** «Няхай гавораць» з Андрэем Малахавым.
**18.20** «Дакументальны дэтэктыў».
**18.55** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**22.10 «Наша Russia».**
**23.05 Маст. фільм «Нелегал».**
**2.10 Маст. фільм «Канікулы».**
**4.10 Маст. фільм «Вялікае расчараванне».**
**5.50 Камедыя «Ясь і Яніна».**

**ЛАД**

**6.45, 14.25** Мультсерыял «Новыя прыгоды Віні-Пуха».
**7.05** «Ранішняя падзарадка».
**8.10** Ядзім дома.
**8.40 Серыял «Каменская-3».**
**9.40** У гэты дзень.
**9.45, 17.35** Гадзіна суда з Паўлам Астахавым.
**10.35** «Казанова».
**11.05, 16.35 Серыял «Жанчына з водарам кавы».**
**12.05 Серыял «Анатомія Грэй».**
**13.00** Сезон у дачы.
**13.35** «ПРАсоўванне+».
**14.05** Анекдот. LAD.
**14.55** Пазакласная гадзіна.
**15.05, 18.50** Клуб былых жонак.
**16.00** Усё аб бяспецы.
**18.35** Навіны культуры.
**19.40** Іншае жыццё.
**20.40** Калыханка.
**20.55** «Цудоўная сямёрка». Эпізод другі.
**22.00** Бітва экстрасэнсаў.
**23.05** Шок-О-ЛАД.
**0.05** Хакей. НХЛ. Агляд тыдня.

**ТВ РЕН**

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Міншчына».
**6.20, 7.50** «З чаго пачынаецца раніца».
**7.40, 15.50** «Крутыя рабяты». Дзённік.
**8.40** «Аўтапанарама».
**9.00 Серыял «Салдаты 13».**
**10.00** «Наш дом».
**10.40** «Сучасныя цуды: Аўтадызайн». Дак. фільм. 1-я частка.
**11.05 Серыял «Рэбека».**
**12.00, 18.25 Серыял «Зацьменне».**
**13.00** «Асабісты інтарэс».
**13.50** «Падымальнік пінгвінаў». Канцэрт Міхаіла Задорнава.
**14.45** Мультсерыял «Касмічныя каўбоі».
**15.10 Серыял «Элен і рабяты».**
**16.00** «Ёсць кантакт».
**16.50** «Бабскі бунт». Ток-шоў.
**17.30** «Званая вячэра».
**20.05** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, малы».
**20.30 Камедыя «Развод і сямёра дзяцей».**
**22.55** «Відзьма-нявідзьма».
**23.35 Баявік «Тюряга».**
**1.25** «Відавочца прадстаўляе: самае шакіруючае».

**Мир**

**4.00, 5.00, 6.00, 7.00** Зараджайся!
**4.30, 14.00** Дзіцячы сеанс. Серыял «ОБЖ».
**5.30** Дак. серыял «Джэмі ў сябе дома».
**6.30 Удачная пакупка.**
**7.30** Серыял «Амапола».
**8.30, 11.30, 14.30, 17.30, 20.30** «Навіны Садружнасці».
**8.45** Арт-рэвалюцыя.
**9.00** Даведнік.
**9.30** «Спрэчная тэрыторыя». Ток-шоў.
**10.30 Серыял «Раксалана».**
**12.00, 22.30** Студыя 60x90.
**12.15, 22.35 Маст. фільм «Дзень даўжэйшы за ноч».**
**13.45** Урокі англійскай мовы.
**15.00** Сливки общества.
**16.00** Парад парадаў.
**17.00** Вясельныя вар'яцтвы.
**17.55** Дзелавы тыдзень.
**18.15** «Каму на Русі жыць добра».
**18.45** «Слава за хвіліну».
**19.45** «Цік-так».
**20.00** Лепшае з «Джэнтльмен-шоў».
**21.00 «Бушыдо — шлях воіна». Серыял.**
**22.00** «Паўночнікі».

**ВосьМой**

**7.00** «Зялёны дом».
**7.15, 10.55, 21.05, 23.30** «Метэапрагноз».
**7.20 Маст. фільм «Дайце кнігу скаргаў».**
**9.00** «Дом жывых гісторый».
**9.30** «К-відэа» для дзяцей.
**9.50, 19.45 Серыял «Нікіта».**
**10.40** «Музпарад».
**11.00 Маст. фільм «Дом каля возера».**
**13.00** «Дзённы тэлечат».
**16.30** «Жыццё, поўнае радасці».
**17.00** Мультпарад.
**17.10 Серыял «Зорныя вароты».**
**19.00** «Падарожжа з густам».
**19.30** «Сад і агарод».
**19.40, 21.25** «Распродаж. Навінкі. Акцыі».
**20.45** «Вечарніца».
**21.00** «Навіны кіно».
**21.10** «Каралі муай тай».
**21.30 Маст. фільм «Сахара».**
**23.35** «Начны тэлечат».

**РОССИЯ ТЕЛЕКАНАЛ**

**7.00** Добрай раніцы, Расія!
**9.05** «Мой сярэбраны шар. Пётр Алейнікаў».
**10.00 Серыял «Калі яе зусім не чакаеш».**
**11.00, 14.00, 17.00, 19.00** Весткі.
**11.30, 14.10, 17.20** Мясцовы час. Весткі—Масква.
**11.50 Серыял «Бандыцкі Пецярбург-9. Галандскі пасаж».**
**12.50 Серыял «Пецярбургскія тайны».**
**13.50, 16.50, 18.50, 23.00** Весткі—Беларусь.
**14.30 «Кулагін і партнёры».**
**15.00** Суд ідзе.
**15.55 Серыял «Скрадзеныя пацалункі».**
**17.45 Серыял «Анёлахоўнік».**
**19.45** Добрай ночы, малыя!
**19.55** «Юрмала-2007».
**20.55 Баявік «Пакрыццё ўрону».**
**23.10 Драма «Стрыптыз».**

**НТВ БЕЛАРУСЬ**

**6.00** «Сёння раніцай».
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**9.10** «Наша ўсё!».
**10.20** «Ліхія 90-я».
**10.50** «Іх нoравы».
**11.20 Серыял «Усё змяшалася ў доме».**
**13.25 Серыял «Урачэбная тайна».**
**15.25** «Асарці».
**15.35** «Агляд. Выратавальнікі».
**16.30 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.40** «Следства вялі...».
**20.45** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**21.10** «Ты — суперстар».
**23.05 Трылер «Горад грахоў».**

**ТВ ЦЕНТР**

**5.00** Канал «Настрой».
**7.30** Выбары-2007.
**7.50, 14.20, 18.50** «Гісторыя дзяржавы Расійскай».
**7.55 Камедыя «Гараж».**
**10.00** Дзень бусла.
**10.15, 13.50, 23.40** Пятроўка, 38.
**10.30, 13.30, 16.30, 19.30** Падзеі.
**10.45 Серыял «Зацьменне».**
**11.45 Серыял «Каменская».**
**12.55** «У цэнтры ўвагі». «Бяздзетныя».
**14.00, 17.05** Дзелавая Масква.
**14.30, 2.00 Серыял «Адна справа на дваіх».**
**15.30** Новая «Часінка».
**16.45** Выбары-2007. Тэледэбаты.
**17.15** Нашы любімыя жывёлы.
**17.50 Серыял «Расплата за грахі».**
**18.55** «У цэнтры ўвагі». «Домік у вёсцы».
**20.05 Маст. фільм.**
**22.00** «Народ хоча ведаць». Ток-шоў.
**23.10** Падзеі. 25-я гадзіна.
**23.55 Баявік «Герой».**
**2.50 Маст. фільм «Мярцвяк ідзе».**

**EUROSPORT**

**9.30** «Уцёкі».
**10.00, 0.00, 2.00** Чэмпіянат свету. «Ралі Ірландыі».
**10.30** Футбол. Еўра-2008. Данія—Іспанія.
**11.15** Футбол. Еўра-2008. Ірландыя—Германія.
**12.15** Спідвей.
**14.15** Футбол. Еўра-2008. Расія—Англія.
**15.15, 19.15** Футбол. Еўра-2008. Нідэрланды—Славенія.
**16.15** Футбол. Еўра-2008. Францыя—Літва.
**17.00, 18.15** Санны спорт. Кубак свету.
**17.45, 1.45** Футбол. Еўра-2008. Навіны.
**20.00, 22.00** Футзала. Чэмпіянат Еўропы.
**21.30** Цімберспортс.
**23.30** Самыя дужыя людзі планеты.
**0.30** Экстрэмальны спорт.
**1.00** Рэстлінг.

### ФІЛЬМ ДНЯ

**НТБ 23.05 «ГОРАД ГРАХОЎ» (ЗША, 2005 г.)**

*Узнагароды: прыз Канскага МКФ (Францыя, 2005 г.), прыз MTV (ЗША, 2006 г.), прызы Акадэміі навукова-фантастычных фільмаў, фільмаў жахаў і фільмаў-фэнтэзі (ЗША, 2006 г.), прэміі Асацыяцыі кінакрытыкаў, якія пішуць у Інтэрнэце (ЗША, 2006), прыз «BMI Film&TV» (ЗША, 2005 г.), прыз глядацкіх сімпатый Акадэміі кіно і тэлебачання Ірландыі (2006 г.).*

Гэта горад злачынстваў і пакаранняў, гэта месца, дзе «кроў льецца галонамі», а «шлях да ісціны ляжыць праз трупы», гэта свет, які карумпаваны і раз'едзены ржой і тленнем заганаў. Але і ў гэтым свеце магчымы сапраўдныя пачуцці, якія ўзвышаюць герояў над ім.



**Рэжысёры** — Роберт Радрыгес, Фрэнк Мілер, Квенцін Таранціна. У ролях: Брус Уіліс, Мікі Рурк, Джэсіка Альба, Клайв Оуэн, Рутгер Хаўэр, Элайджа Вуд, Разарыё Доўсан, Беніcіё Дэль Тора, Брытані Мерфі, Майкл Мэдсен.

## СУБОТА, 17 ЛІСТАПАДА

**1**

**6.30** Дак. серыял «Выдатныя гістарычныя асобы». «Вашынгтон».
**6.55** Брытва Акама.
**7.25** Існасць.
**7.50** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**9.00, 12.00, 15.00, 18.00** Навіны.
**9.05** Здароўе.
**9.40 Серыял «Дзядуля маёй мары».**
**10.15** Шпілька.
**10.50** Тайны смак.
**11.20** Ранішняя хваля.
**12.10 Камедыя «Гусарская балада».**
**14.00** «Цыганы». Відэафільм АТН.
**14.30** Мужчынскі характар.
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** Парламент у асобах.
**15.55** Nota Bene.
**16.25** У свеце матораў.
**16.55** Вакол планеты.
**17.35** Зона Х.
**18.20** «Ваша лата».
**19.20** «Новая хваля-2007».
**21.00** Панарама.
**21.40 Драма «Франц+Паліна».**
*Гісторыя кахання падчас вайны беларускай дзяўчыны і... маладога эсэсаўца.*
**0.05** Дзённік ММКФ «Лістапад-2007».
**0.15** Легенды сусветнага рока. Genesis.
**1.25** Музычны плей-оф.

**Н**

**7.00** «Суботняя раніца».
**8.00, 9.00, 16.00, 20.50, 3.00** Нашы навіны.
**9.05 Серыял «Сябры».**
**9.40** «Здароўе».
**10.30** «Смак».
**11.05** «Чароўнасць хатніх гадаванцаў». Дак. серыял.
**11.40 Маст. фільм «Да мяне, Мухтар!».**
**13.10** «Тэлечасопіс «Саюз».
**13.40 Камедыя «Добры дзень, я Ваша цётка».**
**16.10, 3.20** Навіны спорту.
**16.15** «Мая жонка — няпростая жанчына».
**17.15** «Бенефіс Алены Вараbей».
**18.45** «Адзін супраць усіх».
**19.50** Адборачны матч чэмпіянату Еўропы па футболе. Ізраіль—Расія.
**22.00** Адборачны матч чэмпіянату Еўропы па футболе. Албанія—Беларусь.
**23.45 Маст. фільм «Гастралёр».**
**1.15 «Прыстанішча камедыянтаў».**
**3.25** Эдвард Радзінскі. «Загадкі Сталіна».
**4.05 Камедыя «Адзінокім прадастаўляецца інтэрнат».**

**ЛАД**

**7.45** Дак. серыял «Мільён пытанняў аб прыродзе».
**7.55 Фільм-казка «Пра Чырвоную Шапачку». 1-я серыя.**
**9.00** Свая кампанія.
**10.05** Добрыя навіны.
**10.45** Школа рамонту.
**11.50** Урачэбныя тайны.00
**12.30** «Тэатр. Выбранае». Віват, «Воскресенье», віват!
**13.10** І. Вырыпаеў. Спектакль «Валянцінаў дзень».
**16.25** Гандбол. Ліга чэмпіёнаў ЕГФ. Мужчыны. БГК ім. Мяшкова (Беларусь)—Босна (Боснія і Герцагавіна).
**18.00** «Спорт, спорт, спорт...» Святлана Бурдзевіцкая.
**18.35 Маст. фільм «Джынсы — талісманы».**
**20.50** Анекдот. LAD.
**21.15 Камедыя «Горад шчасця, штат Тэхас».**
**23.10** Баскетбол. НБА. Матч тыдня. Х'юстан—Сан Антоніа.
**0.55** Невытлумачальна, але факт.

**ТВ РЕН**

**6.35** «Ваенная тайна».
**7.20** «Анфас».
**7.35** «Прыгоды кенгуранят». Мультсерыял.
**8.00** Серыял «Афрамасквіч».
**9.00** «Наш дом».
**9.30** «Вялікія мазгаломы».
**10.30** «Прачніся і спявай».
**11.05** «Мінск і мінчане».
**11.35 Серыял «Жаданая».**
**12.35 Маст. фільм «Канец аперацыі «Рэзідэнт». 1-я серыя.**
**14.10** Мультсерыял «Тунімалсы».
**14.35** «Новыя падарожжы дылетанта».
**15.05** «Народжаны ў СССР».
**15.50** «Відзьма-нявідзьма».
**16.30, 19.30** «24 гадзіны».
**16.40** «Фантастычныя гісторыі».
**17.30** «Наша справа».
**17.40** «Прыватныя гісторыі».
**18.30** «Паспець усё».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10 Маст. фільм «Аляксандр».**
**23.05** «Крутыя рабяты».
**0.05 Маст. фільм «Хронікі звычайнага вар'яцтва».**



*Малады чалавек з дапамогай чорнай магіі спрабуе вярнуць каханую, якая стамілася ад яго дзіўных выхадак, але замест пасмы валасоў каханай выразае кавалак з шавялюры яе спячай цёткі.*

**2.05 Трылер «Сэнт Анж».**

**Мир**

**4.00, 12.00** Любімыя акцёры.
**4.15, 12.15 Маст. фільм «Вёска Утка».**
**6.00, 17.00 Серыял «Душачка Моніка».**
**6.30** Удачная пакупка.
**6.45, 15.00** Дак. серыял «Хіт-парад дзікай прыроды».
**7.45** «Сямейны альбом».
**8.00** Мультсерыял «Прыгоды маленькай рыбкі».
**8.30** «Тэра-інкогніта».
**9.00** «Мільён пытанняў аб прыродзе».
**9.30** «Вялікая будоўля».
**10.00** «Мар, дзейнічай, будзь!».
**10.30** Ведаем рускую.
**11.30, 14.30, 17.30, 20.30** «Навіны Садружнасці».
**14.00** Студыя 60x90.
**14.10** Казахстан: старонкі гісторыі.
**16.00** «Аднакашнікі».
**18.00 Маст. фільм «Падарунак лёсу».**
**20.00** «Супраць мафіі».
**21.00** Кіно Індыя. Маст. фільм «У пошуках адплаты».
**23.45 Серыял «Тайнае імя Бога».**

**ВосьМой**

**9.00** «Сад і агарод».
**9.05** «Метэапрагноз».
**9.10** «Адзінка ў кубе».
**9.30** Мультпарад.
**9.55** «К-гульня».
**10.00** «Каралі муай тай».
**10.15 Маст. фільм «Сахара».**
**12.15 Маст. фільм «Вікторыя і Альберт».**
**13.45** Дак. серыял «Блакітная планета».
**14.30** «Змяні свой свет».
**15.00** Мультпарад па выхадных.
**16.30** «Адшукваецца адпачынак».
**17.00** «Сямейны экран».
**19.10** «Навіны кіно».
**19.15** «Зялёны дом».
**19.30, 21.10** «Распродаж. Навінкі. Акцыі».
**19.35 Маст. фільм «Знахар».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.00** «Навіны кіно».
**21.15 Маст. фільм «Гладыятар».**
**23.55** «Начны тэлечат».

**РОССИЯ ТЕЛЕКАНАЛ**

**7.00** Добрай раніцы, Расія!
**8.15** «Уся Расія».
**8.30** Мультсерыял «Огі і прусакі».
**8.50** Мультфільм.
**9.00** «Ваенная праграма».
**9.20** Студыя «Здароўе».
**9.55** Ранішняя пошта.
**10.30** Гарадок. Дайджэст.
**11.00, 14.00, 19.00** Весткі.
**11.10, 14.20** Мясцовы час. Весткі—Масква.
**11.20** «Суботнік».
**12.00** «Гульня ўяўлення».
**12.30** «Вакол свету».
**13.30** «Сінеманія».
**14.30 Дэтэктыў «Цана галавы».**
**16.10** «Белым па чорнаму». Ток-шоў Святланы Сарокінай.
**17.05** «Крывое люстэрка. Тэатр Яўгена Петрасяна».
**18.30** «Рэвізор».
**19.20** Ігар Маісееў. Канцэрт памяці вялікага майстра.
**20.50 Камедыя «Алекс і Эма».**
**22.45** «BELARUS-OPEN-2007». Чэмпіянат Усходняй Еўропы па танцах.
**23.55 Трылер «Спартанец».**

**НТВ БЕЛАРУСЬ**

**7.45, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.00 Серыял «Дэтэктывы з табакеркі».**
**8.55** «Агляд».
**9.25** «Без рэцэпта».
**10.20** «Галоўная дарога».
**10.55** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.25** «Асабліва небяспечны!».
**13.55 Дэтэктыў «Класік».**
**16.25** «Жаночы погляд». Андрэй Дзяменцьеў.
**17.00 Трылер «Бяжы, Лола, бяжы».**
**19.40** «Прафесія — рэпарцёр».
**20.20** «Праграма Максімум».
**21.35** «Рускія сенсацыі».
**22.35** «Ты не паверыш!».
**23.35 Драма «Прагулка на нябёсы».**
**1.10** «Рэальная палітыка».
**1.45** «Мікс-Файт М-1. Баі без правілаў».

**ТВ ЦЕНТР**

**5.10 Маст. фільм «У агні броду няма».**
**7.00** АБВГДэйка.
**7.30** Праваслаўная энцыклапедыя.
**8.00** «Насякомыя». «Атакі тэрмітаў».
**8.45** «Гісторыя дзяржавы Расійскай».
**8.55** Мультфільм.
**9.10 Фільм-казка «Каралеўства крывых люстэркаў».**
**10.30, 13.30, 16.30, 23.05** Падзеі.
**10.50** «Рэпарцёр».
**11.05** Лінія абароны.
**11.50** «Сто пытанняў даросламу».
**12.40** Гарадскі сход.
**13.50** Фільм Леаніда Млечына «Хіба нельга знішчыць пацукоў?».
**14.35 Маст. фільм «Целаахоўнік».**
**16.45** Пятроўка, 38.
**17.00** Дак. фільм «Поўдзень Афрыкі. Бітва з апартэідам».
**18.00** Серыял «Чыста англійскае забойства».
**20.00** «Пастскрыптум».
**21.10 Маст. фільм.**
**23.20 Маст. фільм.**
**1.35 Серыял «Адна справа на дваіх».**
**2.40 Серыял «Востраў скарбаў».**

**EUROSPORT**

**8.45** Матагонкі.
**9.45, 1.00** Чэмпіянат свету. «Ралі Ірландыі».
**10.15, 13.45** Футбол. Еўра-2008. Расія—Англія.
**11.15** Санны спорт.
**11.45, 19.30** Футбол. Еўра-2008. Навіны.
**12.00** Футбол. Еўра-2008. Францыя—Літва.
**12.45, 16.00** Футзала. Чэмпіянат Еўропы.
**15.00, 0.00** Футбол. Еўра-2008. Агляд.
**19.45** «Eurosport Buzz».
**20.15** Фігурнае катанне.
**22.00** Бокс.
**1.30, 2.00** Аўтагонкі.

### ФІЛЬМ ДНЯ

**РАСІЯ 20.50 «АЛЕКС І ЭМА» (ЗША, 2003 г.)**

Каб пагасіць картачны доўг і пазбегнуць смерці ад рук мафіі, за месяц Алекс павінен напісаць раман. Каб паскорыць працэс, ён наймае практычную стэнаграфістку Эму.

**Рэжысёр** — Роб Райнер. **У ролях:** Аляксандр Ваццe, Джордан Лунд, Сафі Марсо, Дэвід Пэймер, Жыжы Бірменгем, Кэйт Хадсон, Лейлі Крамер.



## НЯДЗЕЛЯ, 18 ЛІСТАПАДА

**1**

**5.30** Індыйскае кіно. Меладрама «Я побач з табой».
**8.30** Альманах падарожжаў.
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** Арсенал.
**9.40 Серыял «Дзядуля маёй мары».**
**10.15** Культурныя людзі.
**10.50** Дак. серыял «Сусветныя адысеі».
**12.10** Дак. фільм «Дажынкі ў Рэчыцы».
**12.40** Да дня работнікаў сельскай гаспадаркі. Святочны канцэрт Нацыянальнага аркестра Беларусі пад кіраўніцтвам М. Фінберга.
**14.05** Відэафільм АТН «Зыход крыніц».
**14.30** Дак. серыял «Тайны забытых перамог». «Бура»: Загадана знішчыць!».
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Відэачасопіс.
**15.55** КВЗ. Еўраліга.
**17.45** Зорны старт. Дзённік дзіцячага Еўрабачання.
**18.05** Суперлато.
**19.05 Камедыя «Мужчына павінен плаціць».**
**21.00** Панарама тыдня.
**22.25** Лістапад-2007. Урачыстае адкрыццё.
**23.10** Вось дык шоў!
**0.15 Меладрама «Кропкі над «і».**



*Ці можа адзіны страсны пацалунак змяніць усё жыццё?*

**1.55** Усе стыхіі.

**Н**

**7.00** «Нядзельная раніца».
**8.00, 9.00, 16.00, 3.00, 5.00** Нашы навіны.
**9.05** Нядзельная пропаведзь.
**9.20 Серыял «Сябры».**
**10.00** «Бесталковыя нататкі».
**10.20** Пакуль усе дома.
**11.15** Фазэнда.
**11.50** «Ранішняя пошта».
**12.50** «Страсці па насякомых». Дак. фільм.
**13.10** «Разумніцы і разумнікі».
**13.50** «Хвіліна славы».
**16.15, 3.10** Навіны спорту.
**16.20** Нядзельны «Ералаш».
**16.50** «Асабістае жыццё Эльдара Разанава».
**17.40** «КВЗ». Вышэйшая ліга.
**20.00** Контуры.
**21.05** «Дыханне планеты».
**21.35** «Фабрыка зорак».
**23.25** Юбілейны вечар Эльдара Разанава.
**1.45** «Камедзі Клаб».
**2.30 Драма «Катала».**
**4.00 Камедыя «Прыватны дэтэктыў, або Аперацыя «Кааперацыя».**

**ЛАД**

**7.10** Звон.
**7.35** Мір вашаму дому.
**7.50** Фільм-казка «Пра Чырвоную Шапачку». 2-я серыя.
**9.00** Наша пяцёрачка.
**10.05** Не ў час.
**10.35** Школа рамонту.
**11.45** Сезон у дачы.
**12.25** Дак. серыял «Невядомая планета». «Тры твары Каталоніі», «Містыка Каталоніі».
**13.25** Лабірынты: каменныя крыжы.
**13.55** «Прасоўванне+».
**14.15** Слова пісьменніка.
**14.50** Святло далёкай зоркі. Уладзімір Жданаў.
**15.20** «Беларускі вясельны каравай». Відэафільм.
**15.40** Серыял «Дзве зоркі».
**16.40 Камедыя «Мужчына для маладой жанчыны».**
**18.10 Вестэрн «Малады Бонер».**
**20.05** Анекдот. LAD.
**20.25** Тэлебарометр.
**20.45** Правы чалавека.
**21.00 Баявік «Вуліца міласэрнасці».**
**22.55 Меладрама «Інтымны дзённік».**

**ТВ РЕН**

**6.35 Фільм-казка «Тры залатыя валаскі».**
**8.00 «Афрамасквіч». Серыял.**
**9.00** «Аўтапанарама».
**9.30** «Відавочца прадстаўляе: самае смешнае».
**10.30** «Вялікае снеданне».
**11.05** «Я — падарожнік».
**11.35 «Жаданая». Серыял.**
**12.35 Маст. фільм «Канец аперацыі «Рэзідэнт». 2-я серыя.**
**14.10** «Тунімалсы». Мультсерыял.
**15.00** «Ecce homo».
**15.30** «Відавочца прадстаўляе: самае шакіруючае».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Культурнае жыццё».
**17.20** «Чуткі. Скандалы. Сенсацыі. Расследаванні».
**18.10** «Схема смеху».
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень».
**20.30 Маст. фільм «Эскорт».**



*Картэр — элітны прадстаўнік эскорту для дам вышэйшага свету. Але жорсткае забойства палюбоўніка яго сяброўкі, жонкі сенатара, змяняе ўсё яго жыццё.*

**22.30** «Спартыўны тыдзень».
**23.00** «Паветраныя гонкі». Абу-Дабі.
**0.00** «Па поўнай праграме».
**0.40 «Уцёкі». Серыял.**

**Мир**

**4.00, 12.00** Любімыя акцёры.
**4.15, 12.15** Кінаальманах «Жартуеце?».
**6.00, 17.00 Серыял «Душачка Моніка».**
**6.30** Удачная пакупка.
**6.45, 15.00** Дак. фільм «Кельты».
**7.50** Студыя 60x90.
**8.00** Мультсерыял «Прыгоды маленькай рыбкі».
**8.25** «У гасцях у Мінуткі».
**9.00** Даведнік.
**9.30** «Хіт-экспрэс».
**10.30** «Хвост каметы».
**11.30, 14.30, 17.30** «Навіны Садружнасці».
**14.00** «Праваслаўная сталіца».
**16.00** Паэзія Арменіі.
**16.15, 23.40** Любоўныя гісторыі.
**16.45** Арт-рэвалюцыя.
**18.00** «Рандэву з зоркай».
**18.30** «У нашу гавань заходзілі караблі...».
**19.30** Спецыяльны рэпартаж.
**20.00** «Разам».
**21.00 Маст. фільм «Грубая сіла».**
**22.50 Серыял «Тайнае імя Бога».**

**ВосьМой**

**9.00, 19.30** «Сад і агарод».
**9.05, 23.10** «Метэапрагноз».
**9.10** «Адшукваецца адпачынак».
**9.30** «Мультпарад».
**9.55** «К-гульня».
**10.00** «Мой любімы гадаванец».
**10.15 Маст. фільм «Гладыятар».**
**12.45 Маст. фільм «Вікторыя і Альберт».**
**14.30** «Добрая вестка з Рыкам Рэнерам».
**15.00** «К-відэа для дзяцей».
**15.20** Фільм для дзяцей.
**16.45 Серыял «Эркюль Пуаро».**
**17.45 Маст. фільм «Каханне і галубы».**
**19.35, 21.00** «Распродаж. Навінкі. Акцыі».
**19.40 Маст. фільм «Знахар».**
**20.45** «Вечарніца».
**20.55** «К-відэа» для ўсёй сям'і.
**21.05 Маст. фільм «Сенсацыя».**
**22.40** К-відэа — «Топ-8».
**22.50** Мультфільмы для дарослых.

**РОССИЯ ТЕЛЕКАНАЛ**

**7.00. 11.00, 14.00** Весткі.
**7.10 Камедыя «Каталажка».**
**8.30** «Огі і прусакі». Мультсерыял.
**8.50** Мультфільм.
**9.00** «Дыялогі пра жывёл».
**9.30** «Смехапанарама».
**10.00** «Сто да аднаго».
**11.10** «Сам сабе рэжысёр».
**12.10** «Уладар розуму».
**12.40** «Відавочнае-неверагоднае».
**13.10** «Пакой смеху».
**14.20** Камедыя «Кааператыў «Палітбюро».
**16.00** Весткі. Дзяжурная часць.
**16.30** «Сумленны дэтэктыў».
**17.00** «Танцы на лёдзе». Фінал.
**19.00** Весткі тыдня.
**20.00** «Спецыяльны карэспандэнт».
**20.30 Маст. фільм «Сімпатыка».**



*Што агульнага ў мульцімільянера, уладальніка вялікага конезавода, яго жонкі і няўдачніка, які спіўся?*

**22.45** «Belarus-open-2007». Паказальныя выступленні.

**НТВ БЕЛАРУСЬ**

**8.00, 10.00, 13.00, 16.00** Сёння.
**8.15 Серыял «Дэтэктывы з табакеркі».**
**9.10** «Шчаслівы рэйс».
**10.25** «Ядзім дома!».
**11.00** «Усё адразу!».
**11.40** «Іх нoравы».
**12.10** «Авіятары».
**12.40, 20.40** «Надзвычайнае здарэнне». Агляд за тыдзень.
**13.25** «Ліхія 90-я».
**14.05** «Крамлёўскія дзеці».
**15.00** «Масква—Ялта—Транзіт».
**16.25** «Адзін дзень. Новая версія».
**17.05 Камедыя «Вам букет!».**
**19.00** «Сёння. Падагульняючая праграма».
**19.55** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**21.20** «Галоўны герой».
**22.40** «Нядзельны вечар з Уладзімірам Салаўёвым».
**23.50 Драма «Молах».**

**ТВ ЦЕНТР**

**4.30 «Гараж». Маст. фільм.**
**6.30** Марш-кідок.
**6.55** Дзённік падарожніка.
**7.25** Сялянская застава.
**8.00** «Насякомыя». «Блышыны рай».
**8.45** «21 кабінет».
**9.20** Нашы любімыя жывёлы.
**9.55** «Рэальныя гісторыі». Пажарныя за працай.
**10.30, 23.20** Падзеі.
**10.40 Камедыя «Жаніцьба Бальзамінава».**
**12.25** Нані Брэгвадзе ў праграме «Запрашае Барыс Ноткін».
**12.55** «Дэтэктыўныя гісторыі». «Паштальён прыходзіць двойчы».
**13.30** Падзеі. Маскоўскі тыдзень.
**14.00** «Гісторыя дзяржавы Расійскай».
**14.25** «Скандальнае жыццё» з Вольгай Б. Прафесія — аферыст.
**15.15** «Жыццё і лёс Міхаіла Ульянава».
**16.00 Маст. фільм «Усё будзе добра».**
**18.00 Маст. фільм «Важней, чым каханне».**
**20.00** «У цэнтры падзей».
**21.05 Дэтэктыў «Пуаро Агаты Крысці».**
**23.35 Маст. фільм.**
**1.40 Маст. фільм.**
**3.15 Маст. фільм.**

**EUROSPORT**

**4.00, 9.00, 11.00** Аўтагонкі.
**8.00** Матагонкі.
**10.30, 0.00, 2.00** Чэмпіянат свету. «Ралі Ірландыі».
**12.00** Санны спорт.
**13.00, 21.00** Футбол. Еўра-2008. Шатландыя—Італія.
**14.00** Футбол. Еўра-2008. Уэльс—Ірландыя.
**14.45, 22.00** Футбол. Еўра-2008. Нарвегія—Турцыя.
**15.45, 23.00** Футбол. Еўра-2008. Нідэрланды—Люксембург.
**16.30, 19.15, 1.45** Футбол. Еўра-2008. Навіны.
**17.30, 19.30** Футзала. Чэмпіянат Еўропы.
**23.45** Мотаспорт па выхадных.
**0.30** Бокс.

*У праграме магчымыя змяненні. Перадрукоўка праграмы забаронена!*

### ФІЛЬМ ДНЯ

**НТБ 17.05 «ВАМ БУКЕТ!» (ФРАНЦЫЯ, 2002 г.)**

Хто б мог падумаць, што галоўным героем забаўнай, галавакружнай блытаніны можа стаць такі мілы духмяны сюрпрыз?

**Рэжысёр** — Жан Лабрун. **У ролях:** Сандрын Кіберлен, Жан-П'ер Дарусен, Дамінік Блан, Мацье Амальрык, Жан-Клод Брыялі, Морыс Бенішу.



# БЕЛАРУСКІЯ ПРЫВАТНЫЯ ГЕРБЫ

## Далуга



У блакітным полі срэбная падкова гакамі ўніз, на ёй залаты крыж кавалерскі, з падковы ўніз вылятае срэбная страла.

Гербам ДАЛУГА карысталіся: Арцімовіч, Асецкі, Асоўскі, Бабіцкі, Байрулевіч, Барэйка, Бельскі, Бублевіч, Буйвід, Валентыновіч, Высоцкі, Вырвіч, Вяржбоўскі, Вярбоўскі, Вярсоцкі, Габрыяловіч, Галінскі, Гарэльскі, Гарэцкі, Гатоўскі, Гзоўскі, Гурэцкі, Грабоўскі, Дамброўскі/Дуброўскі, Дакурна, Длужнеўскі, Дмужнеўскі, Жэльскі, Залескі, Закрэўскі, Залеўскі, Зеленеўскі, Кавецкі, Кавалеўскі, Камароўскі, Камінскі, Касцюкоўскі, Касоўскі, Кашовіч, Клішэўскі, Князьнін, Кошка, Краткоўскі, Левандоўскі, Лукоўскі, Лясоўскі, Макавецкі, Манчынскі, Маразовіч, Нарымскі, Насаржэўскі, Насарэўскі, Ніскі, Нестаровіч, Нітаслаўскі, Паксенкіновіч, Падгурскі, Папчэўскі, Праневіч, Радзівіловіч, Рашкоўскі, Сабоцкі, Склатоўскі, Слацвінскі, Слуцкі, Сутовіч, Сутоцкі, Турскі, Улінскі, Уцімскі, Хадакоўскі, Цяшкоўскі, Шырма, Шышка, Ясенскі, Ястрэмбскі/Ястрэбскі.



## Дарагамір

У чырвоным полі тры нагі збройныя, як у бегу, злучаныя ў трыкутнік у цэнтры шчыта.

Гербам ДАРАГАМІР карысталіся: Дарагамір, Кулікоўскі, Петрыкоўскі, Роўба, Рдултоўскі, Садоўскі, Ушак, Шаціла.

## Дарагаслаў

У чырвоным полі срэбнае паўкола канцамі ўніз, на ім срэбная страла аперaная наканечнікам дагары.

Гербам ДАРАГАСЛАЎ карысталіся: Абрампольскі, Агонь-Даганоўскі, Акулевіч, Астрэйка, Бароўскі, Барысевіч, Белаблоцкі, Бенядзіктовіч, Бранеўскі, Булат, Булатовіч, Булацкі, Бутовіч, Бухавецкі, Весялоўскі, Вольскі, Высоцкі, Вянцкоўскі, Гайко, Гарніцкі, Гарэцкі, Гламбоцкі, Дамброўскі, Жэльскі, Забродскі, Закрэўскі, Звольскі, Каменскі, Карэцкі, Каханскі, Конча, Кончыч, Кучынскі, Лісоўскі, Лянтоўскі, Магнушэўскі, Макоўскі, Мяржвінскі, Навацкі, Нядзвецкі, Папроцкі, Прашынскі, Прушкоўскі, Пяскоўскі, Пяткоўскі, Пятровіч, Ражкоўскі, Ражноўскі, Руцінскі, Сакалоўскі, Свянціцкі, Сідаровіч, Скарбек, Смагарэўскі, Станскі, Стахоўскі, Таkарскі, Твардоўскі, Траяноўскі, Трушынскі, Шчаноўскі.



**Рубрыку вядзе Уладзімір КРУКОЎСКІ.**

# ТАЛЕРКУ ЎСТАНАВІЦЬ ПРОСТА?

Наконт установкі спадарожнікавых талерак гаварылася многа. Нават існавала думка, што ўсе гэтыя патрабаванні па ўстаноўцы талерак звязаныя з жаданнем абмежаваць доступ да інфармацыі. Але ўсё аказалася працей.

А што неабходна зрабіць, каб на доме ўстанавіць спадарожнікавую талерку? Мне яна не патрэбная, бо ў доме ёсць кабельнае тэлебачанне, але вырашыў праверыць на сабе.

У прыёмнай начальніка аддзела планіроўкі і забудовы пры ўпраўленні архітэктуры і горадабудаўніцтва Баранавіч нічога не чулі пра спадарожнікавыя талеркі, таму давялося зазірнуць у кабінет начальніка.

— Выклікана гэта тэхнічным бокам справы, — патлумачыў Баляслаў Тумашчык. — Даволі часта даводзіцца чуць скаргі людзей, якія пацярпелі ад установкі талерак. Асабліва гэта датычыцца панэльных дамоў. Пры мантажы прабіваецца панэль. А затым у яе зацякае вада і пачынаюцца праблемы. Вось чаму цяпер не дапускаецца самавольная ўстаноўка спадарожнікавых «талерак». Найперш неабходна атрымаць дазвол ад уладальніка шматкватэрнага дома — будаўнічага кааператыва, ЖКГ і г.д. І тады, калі ласка, да нас па дазвол. Здараецца, што на цэнтральных вуліцах манціруюць спадарожнікавыя антэны як каму ўздумаецца — над балконам ці пад ім, на даху ці сцяне, і такім чынам парушаецца знешні выгляд дома. Усё ж пры ўстаноўцы неабходна не забываць і пра эстэтычны бок справы. І гэта адносіцца не толькі да спадарожнікавых «талерак», але і кандыцыянераў. Даволі непрывабны выгляд маюць будынкі, на якіх вісяць рознакаліберныя кандыцыянеры. А што датычыцца прыватных дамоў, то да іх гаспадароў ніякіх прэтэнзій няма. Кожны ўстанаўлівае, як лічыць мэтазгодным.

І тут ёсць рацыянальнае зерне. Успомнім, як у свой час на шматкватэрных дамах устанаўлівалі антэны. І хоць па закону самавольная ўстаноўка забаронена, кожны імкнуўся паставіць сваю персанальную антэну. Мяккае пакрыццё дахаў часта пашкоджвалася, і жыльцы апошніх паверхаў у такіх выпадках скардзіліся ва ўсе інстанцыі на вільготнасць і плесню ў кватэрах. Ёсць і яшчэ адна праблема. А што рабіць з гаспадарамі, якія ўжо ўстанавілі талеркі? Іх вялікая колькасць. Дык што, прымушаць іх дэманціраваць талеркі ці абкладаць штрафам? Апошні варыянт найбольш лёгкі, але ці законны?

А пакуль што талеркі людзі ўстанаўліваюць і па дазвол ісці не спяшаюцца. Напэўна, ніхто не хоча звязвацца з нашымі чыноўнікамі — баяцца цыганіны.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

Інфарм-укол

# ВЫРАТАВАННЕ СВАЙГО «Я»

**10 СПОСАБАЎ ПАВЫСІЦЬ САМААЦЭНКУ**

1. Штодня знаходзіць час на любімую справу. Хобі заспакойвае нервы. Вы робіце штосьці не таму, што павінны, а таму, што хочацца.

2. Купіць што-небудзь для душы. Шопінг здымае стрэс: падчас яго мы схільныя марыць і забываць на непрыемнасці.

3. Дапамажам людзям. Наша дапамога прынясе каму-небудзь карысць і не дазволіць паглыбіцца ў выдуманыя праблемы.

4. Дзённік дасягненняў. Запісвайце ў дзённік тое, што вам удаецца зрабіць і час ад часу перачытвайце гэта.

5. Навучаць дзяцей. Навучыце дзяцей (не абавязкова нават сваіх) чаму-небудзь цікаваму і карыснаму. Іх радасць і захапленне падчас гэтага працэсу дапамогуць усвядоміць уласную ўнікальнасць.

6. Асвоіць новую справу. Галоўнае — рух наперад! Падчас уласнага росту атрымліваеш магчымасць сказаць сабе: «Малайчына!».

7. Спяваць у ваннай. У працэсе спеваў аўтаматычна паляпшаецца самаадчуванне.

8. Займацца спортам. Пры выкананні рытмічных рухаў у крoў вылучаюцца эндарфіны — гармоны радасці.

9. Радавацца кампліментам на адрас іншых. Калі вам кажуць, які ў вас цудоўны муж, успрымайце гэта як камплімент сабе.

10. Святкаваць свае дні нараджэння. Цудоўны спосаб пачуць аб сабе шмат добрага.

**10 СПОСАБАЎ ПАНІЗІЦЬ САМААЦЭНКУ**

1. Нічога не рабіць. Верны шлях стаць нікім.

2. Прымаць усё на свой рахунак. Цэлая індустрыя спрабуе зарабіць грошы на нашай незадаволенасці сабой. Працістаяць агрэсіўнай рэкламе дапаможа здаровы сэнс і незалежныя эксперты.

3. Фантастычныя мэты. Рэальна глядзіце на рэчы. Няўдачы, зразумела, паніжаюць самаацэнку.

4. Вялікія высновы з малых непрыемнасцяў. Ці можна з-за дробязяў сумнявацца ў сваіх дасягненнях?

5. Зайздросціць усім. У кожнага чалавека ёсць і тое, чаму можна пазайздросціць, і тое, чаму ніяк не пазайздросціш.

6. Любімае слова — «павінен(-на)». Ніхто ні да чаго вас не прымушае. Галоўным чынам, мы маем справу з уласным выбарам, які застаецца паважаць.

7. Апранацца абы-як. Не насіце рэчы, якія вас не ўпрыгожваюць. Адзін позірк у люстэрка — і дэпрэсія тут як тут.

8. Прыміце правал на свой рахунак. Дзіця не прынялі ў прэстыжную школу, каханы здрадзіў і г.д. У любых падзей шмат удзельнікаў і шмат вінаватых.

9. Рабіце тое, што не ўмееце. Адзін філосаф сказаў: «Дзякуй Богу, які стварыў усё непатрэбнае цяжкім, а цяжкае непатрэбным».

10. Чакайце ад жыцця канкрэтнага. Чым больш канкрэтныя мэты вы ставіце перад сабой, тым мацней будзе расчараванне, калі вы не атрымаеце гэтага.

**Доктор Алексей Алексеевич ХАДОРКИН:**

*при алкогольной, никотиновой, пищевой зависимости люди пытаются бороться со стрессом, употребляя спиртные напитки, сладкое, пищу, включающую жиры и муку, никотин. Это неправильно! Если вы сами не можете отказаться от этих привычек, мы окажем психологическую помощь. Так же успешно лечатся псориаз и энурез у детей.*

**Запись на прием по телефонам:**

Минск 292-72-73
Брест 25-14-67
Барановичи 42-06-95
Борисов 73-37-77
Бобруйск 46-22-01
Витебск 36-40-30
Молодечно 7-01-88
Орша 21-40-40
Полоцк 43-58-61
Солигорск 7-32-39
Слуцк 2-99-19
Жлобин 5-11-42
Могилев 27-26-48
Пинск 37-32-42
Светлогорск 2-72-71, 2-16-55
Речица 3-52-77
Мозырь 2-94-74, 40-60-85
Гродно 74-04-24, 41-42-39
Волковыск 2-11-85
Лида 4-59-20.

Лицензия МЗ РБ № 02040/0311208 от 27.10.2006 г. до 27.09.2011 г.

## ІТАЛЬЯНЦАМ ПАДАБАЕЦЦА СТРАЛЯЦЬ КАЧАК

**Італьянскія паляўнічыя пераважна адстрэльваюць рабчыкаў і качак, а немцы — ласёў і казуль. Затое славяне — беларусы, рускія і палякі — проста любяць паляванне, расказаў старшыня ўстановы «Віцебская абласная структура» рэспубліканскага дзяржаўна-грамадскага аб'яднання «Беларускае таварыства паляўнічых і рыбаловаў» (БТПР) Ігар Шульган.**

Сёлета мясцовымі і іншаземнымі паляўнічымі ў паляўнічых угоддзях БТПР ужо здабыта 77 ласёў, больш як 900 кабаноў, звыш 200 казуль, амаль 90 баброў. З 3 лістапада адкрываецца сезон палявання на пушніну, дазволена таксама будзе паляванне з сабакамі. Цікава, што іншаземцы з сабакамі не палююць, хоць такі від здабычы звера можа быць для іх арганізаваны.

У лясах віцебскага падраздзялення БТПР за 9 месяцаў гэтага года толькі для замежных турыстаў, а іх пабывала каля сотні, было арганізавана 28 тураў, у той час як за ўвесь мінулы год — 20. У сярэднім кожны пяты рубель даходу паляўнічыя гаспадаркі атрымліваюць ад арганізацыі палявання для іншаземцаў. Напрыклад, у талачынскім падраздзяленні БТПР прыбытак ад тураў замежных гасцей перавысіў Br65 млн. Як адзначыў Ігар Шульган, нягледзячы на тое, што паляванне лічыцца дастаткова дарагім відам адпачынку, у гэтым годзе павялічылася колькасць мясцовых паляўнічых. Зараз 5,9 тыс. паляўнічых і 2,7 тыс. рыбаловаў з'яўляюцца членамі БТПР у Віцебскай вобласці.

**Дзіяна КУРЫЛА, БЕЛТА.**

Прамая лінія

# НЯМА АЛЕРГЕНА — НЯМА АЛЕРГІІ

**На пытанні адказвае галоўны алерголаг Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь, дацэнт кафедры алергалогіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, кандыдат медыцынскіх навук Людміла МАСЛАВА.**

**(Працяг. Пачатак у нумары за 3 лістапада).**

☎ ***— З Бярэзінскага раёна турбуе Тацццяна Міхайлаўна. Майму сыну — 18 гадоў. Хварэе на бранхіяльную астму алергічнага паходжання. Тры гады ў нас — стойкая рэмісія. Але летась флюараграфія выявіла нейкія змяненні ў лёгкіх. Праз некаторы час паставілі дыягназ пад пытаннем — саркаідоз. Ці можа гэта быць вынікам алергіі, якая мігрыруе?***

— Адназначна не можа. Тут няма прамой сувязі. Памянёныя захворванні могуць існаваць паралельна. Бранхіяльная лёгкая алергічная астма не суправаджаецца нейкімі структурнымі змяненнямі з боку лёгачнай тканкі. Тым больш, вы гаворыце, што наогул назіраецца рэмісія. Адносна саркаідозу неабходна абследавацца асобна.

☎ ***— Дзень добры! Звоніць Валянціна Паўлаўна з Магілёва. Дзіцяці — 8 гадоў, алергік. У 2003 годзе абследавалі ў Віцебску. Нам далі заключэнне — інфекцыйная грыбковая сенсібілізацыя, бытавая алергія, ступень умераная. Як толькі пачынаецца пахаладанне, захворванне адразу праяўляецца: горла і нос закладвае. Што нам пакапаць?***

— Для лячэння алергічнага рыніту выкарыстоўваюць прэпарат назанекс — зручную аэразоль, якая аказвае мясцовае лячэбнае ўздзеянне. Прымяняць яе трэба хоць бы месяц, а то і некалькі. Штодня раніцай — па адной дозе ў кожны насавы ход, і нос пачне добра дыхаць. Пасля можна будзе паўтарыць пробы з бытавымі алергенамі, і калі яны акажуцца станоўчымі, пажадана правесці лячэнне імі. Гэта будзе спрыяць выпрацоўцы абарончага імунітэту да хатняга пылу, а таксама таму, каб рыніт не спрыяў развіццю бранхіяльнай астмы. Акрамя таго, вам трэба прафілактаваць грып і прастудныя захворванні. Тут магчыма выкарыстанне такіх прэпаратаў, як ірс-19, рыбамуніл, бронхаваксон, якія спрыяюць выпрацоўцы абароны да бактэрыяльнай інфекцыі. Зрабіце ўсё гэта паслядоўна і эфект не прымусіць сябе чакаць.

☎ ***— Валянціна Іосіфаўна, Клецкі раён. Пакутую ад алергіі, якая высыпае на назе і руках. Калолі мне дэксазон і супрасцін. Быццам бы, на нейкі час стала лепей. А цяпер цела так свярбіць, што ўзнікаюць чырвоныя болькі. Выпісалі мне скабікар, але ўсё роўна сверб не праходзіць.***

— Наколькі я разумею, гэта не крапіўніца і не алергія... Сверб ёсць пастаянна?

***— Так. Асабліва бліжэй да вечара.***

— Можна паспрабаваць падключыць антыгістамінныя прэпараты працяглага дзеяння — эрыўс, зіртэк, тылфаст.

***— Зразумела. А што вы параіце для 4-месячнай унучкі, якую пачало высыпаць? Мы купаем яе ў рамонку. Ці можа на яго быць алергія?***

— Можа быць.

***— А на валяр'яну, калі ў ёй купаць?***

— Рэакцыя можа быць на любы прэпарат. І ў такіх выпадках можна дзён дзесяць даваць дзіцяці прэпараты, якія хутка выводзяцца з арганізма — фенкарол, супрасцін, тавігіл. Дазваляецца і выкарыстанне гарманальных мазяў — лакойда, элакома. У невялікай колькасці, разы два ў дзень, на працягу 5—7 дзён.

***— Ці можна для старэйшай, 4-гадовай, унучкі, у якой таксама з'яўляюцца алергічныя праяўленні, прымяняць скабікар?***

— Можаце паспрабаваць выкарыстоўваць і скабікар, і скінкап.

***— А дзе можна абследаваць нашых дзяцей?***

— Дзіцячы алерголаг ёсць, напрыклад, у Бараўлянах. Пажадана прыехаць туды з накіраваннем і з агульным аналізам крыві, трохразовым вынікам аналізаў калу на яйкі гельмінта.

☎ ***— Турбуе Маргарыта з Бабруйска. Урачы, да якіх я звярталася, не могуць паставіць дакладны дыягназ. У мяне вакол рота і носа — чырвоныя плямы, якія свярбяць. Карыстаюся гарманальнай маззю, але нічога не дапамагае...***

— Напэўна, у вас — перараальны дэрматыт. Не думаю, што ў вашай праблемы — алергічнае паходжанне. Такія дэрматыты могуць быць алергічнымі толькі ў выніку непасрэднага кантакту з пэўнымі рэчывамі, напрыклад, з касметычнымі сродкамі. У такіх выпадках пачырваненне і ацёк з'яўляюцца акурат у тым месцы, куды нанесена рэчыва. Таму вам трэба абследаваць страўнікава-кішэчны тракт. Усё ж такі скура — люстэрка жывата. Зрабіце фібрагастраскапію з біяпсіяй, ультрагук органаў брушной поласці, капраграму, біяхімічны аналіз крыві, агульны аналіз крыві з лейкацытарнай формулай.

***— У мяне яшчэ — жалезадыфіцытная анемія. Можа, я перастаралася з ужываннем спецыфічных прэпаратаў?***

— Наўрад ці. Калі б былі вінаватыя прэпараты, гэта было б не так лакальна, а больш сістэмна.

☎ ***— Гомельская вобласць на провадзе. Ніна Іванаўна. У дачкі алергія на медыкаменты. І ў нас склалася няпростая сітуацыя з урачэбнай дапамогай. Як толькі мы скажам пра нашу праблему ў той жа бальніцы, урачы губляюцца. Што нам рабіць? Як абследавацца?***

— Варта гаварыць урачам не тое, што ў вашай дачкі ёсць алергія на лекавыя сродкі, а прад'яўляць спіс тых прэпаратаў, на якія была непажаданая рэакцыя.

***— Мы так і робім.***

— Правільна. Алергія з'яўляецца толькі на тое, з чым чалавек неаднаразова сутыкаўся. На новыя прэпараты рэакцыі не будзе. Прэпаратаў жа зараз вельмі многа. Доктар падбярэ тое, што трэба. Калі будзе неабходнасць, правядзе нават скурныя пробы або прыменіць лекавы прэпарат пад «прыкрыццем» супрацьалергічнага сродку.

***— На жаль, урачы не хочуць гэтым займацца. Пробы нам не рабілі.***

— З проб і нельга пачынаць. Урач павінен спачатку разабрацца з анамнезам. Калі спатрэбіцца, накіруе на кансультацыю да алерголага.

***— А ў Магілёве ён ёсць?***

— Безумоўна. Галоўны алерголаг Магілёва і Магілёўскай вобласці — Касперскі Дзмітрый Уладзіміравіч.

☎ ***— Ала Уладзіміраўна, Стаўбцоўскі раён. У 8-гадовага дзіцяці — алергія на прадукты харчавання. Праўда, бывае абвастрэнне змяняецца заціш шам. Скажыце, калі ласка, якія эфектыўныя мазі і лекі для барацьбы з алергіяй існуюць? Чула, што пры такіх станах прымяняюцца нейкія вугальныя таблеткі. Што за яны?***

— Па-першае, трэба весці харчовы дзённік, і абавязкова выдаліць з рацыёну тыя прадукты, якія выклікаюць праблему. У перыяд абвастрэння неабходна прымяняць антыгістамінныя прэпараты накшталт эрыўсу, зіртэку, тылфасту, гарманальныя мазі — элакома, лакойда. Што датычыць вугалю, то, мяркую, вы чулі пра звычайны актываваны вугаль, які сапраўды можна прымаць пры алергіі. Іншае пытанне, ці алергія гэта ў дзіцяці? Мяркую, справа зусім не ў ёй. Неабходна абследавацца. Здаць агульны аналіз крыві, аналіз на гельмінты, высветліць, як працуе страўнікава-кішачны тракт, паколькі праблемы могуць хавацца менавіта тут.

**«Прамую лінію» правялі Святлана БАРЫСЕНКА і Вольга ШАЎКО.**

**(Працяг будзе.)**

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.25 | 16.21 | 8.56 |
| Віцебск — | 7.19 | 16.06 | 8.47 |
| Магілёў — | 7.15 | 16.11 | 8.56 |
| Гомель — | 7.06 | 16.13 | 9.07 |
| Гродна — | 7.39 | 16.37 | 8.58 |
| Брэст — | 7.34 | 16.43 | 9.09 |

**Месяц**

*Маладзік 10 лістапада. Месяц у сузор'і Скарпіёна.*

**Імяніны**

***Пр.*** *Аляксандры, Елізаветы, Капіталіны, Андрэя, Марка, Несцера;* ***К.*** *Аляксандра, Анатоля, Тодара, Урсына.*

## НАДВОР'Е на заўтра




— няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў

**Геамагнітныя ўзрушэнні**

| 2 гадз. | 5 гадз. | 8 гадз. | 11 гадз. | 14 гадз. | 17 гадз. | 20 гадз. | 23 гадз. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|

## ...у суседзяў

| | | |
|---|---|---|
| ВАРШАВА +1..+3°С | КІЕЎ +1..+3°С | РЫГА +2..+4°С |
| ВІЛЬНЮС 0..+2°С | МАСКВА -2..0°С | С.-ПЕЦЯРБУРГ -2..0°С |

Простыя рэчы

З народнага:
*Ані лыжкі, ані міскі —*
*Павесілі тры калыскі...*

Тут маладую сям'ю крыху і ўпікаюць: яшчэ і гаспадаркай сваёй не абзавяліся, на ногі як след не ўсталі, а ўжо дзяцей шмат. Але большасць тагачасных вясковых сем'яў мела шмат дзяцей. Найперш гаспадарцы патрабаваліся работнікі, ды і смяротнасць дзіцячая яшчэ ў пачатку мінулага стагоддзя заставалася высокай. Сёння дзяржава падтрымлівае нараджэнне ў сям'і другога, трэцяга дзіцяці, але і гэтыя прэферэнцыі не надта заахвочваюць маладых.

*Чуць міска ткнулася сюды,*
*Дык у яе, як па прыказу,*
*Відэльцаў з восем лезе зразу.*
*Гаворка моўкне, смех сціхае:*
*Цяпер мінуціна другая,*
*Бо ўсіх займае міска стравы;*
*Другія моманты, праявы, —*
*Усе пафукваюць ды студзяць*
*І верашчаку тую вудзяць...*

Так, елі з адной міскі. Але ж у згодзе, з павагай да старэйшых, работніку, які сама цяжка працаваў, аддаваўся тлусцейшы кавалак, не было ні сваркі, ні кпінаў, нават дзеці за сталом станавіліся сур'ёзнымі. У сялянскай хаце яда, сняданак ці полудзень, вячэра — не проста неабходная штодзённая справа, а ў некага сённяшняга і рытуал, які падкрэсліваецца ззяннем крышталю, цьмяным бляскам дарагога посуду. Тады — гэта была жыццёвая неабходнасць для паўсядзённай нялёгкай працы. За сталом трэба набрацца сілы (у «Макдольнадсе» не перахопіш).

*І бацька кідае відэльцы,*
*Рукою гладзіць па камзэльцы,*
*На абразы ўскідае вокам*
*І шэптам хрысціцца набожна.*
*Тым часам міска і парожна,*
*І маці стол ужо прыбрала,*
*Пасуду, лыжкі паласкала.*




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Не з адной міскі сёрбаюць за сталом дарослыя і дзеці. Толькі шматдзетных сем'яў няшмат.

Для мяне ж сама назва міска асацыюецца з мінулым вясковай хаты, з той беднатой, якая там панавала. І сапраўды, не падыдзе гэта слова да сучаснага стала, які накрыты ў рэстаране з нагоды вяселля, іншай урачыстасці, нават да простага абедзеннага стала ў звычайнай, як кажуць, сярэднестатыстычнай сям'і. Не з міскі сёрбаюць стравы і на фуршэтах.

Успомнім класічнае, Змітрака Бядулю, яго «Пяць лыжак заціркі»:

*« — Гатова! Гатова! — запішчалі дзеткі і скакалі, як зайчыкі, да стала, дзе ўжо стаяла вялікая паліўная міска, у якую Агата пераліла зацірку з гаршка. Густы пахучы пар клубіўся над міскай і павялічваў галодны апетыт шчаслівай у гэты момант сям'і».*

А, відаць, патрэбны тут тлумачэнні. Паліўная міска — у гэтым выпадку гліняная пасудзіна, якая пакрытая палівай, шклопадобнай масай. Ну, а зацірка — гэта рэдкая страва з дробных мучных камячкоў, якую гатуюць на вадзе ці малацэ. Ці малаком потым забельваюць. У Агаты зацірка на вадзе, пра якое там малако гаварыць — веснавы голад у хаце. Між іншым, зацірак з паліваных місак і наша пакаленне ў дзяцінстве паядала ўволю. Вядома ж, на малацэ, ды і прысалоджаных ужо. Смачна было. Цяпер такая простая страва выйшла з ужытку. Магчыма, нехта і згатуе, каб успомніць мінулае. Але ж гасцям на стол такую міску не паставіш. Так, галаднавата жылі нашы бацькі і дзяды, міска заціркі была некаму ў радасць. Але ж умелі радавацца і простаму. Адзін з любімых маіх раздзелаў у паэме «Новая зямля» Якуба Коласа — «Раніца ў нядзельку».

Што прапаноўвала гаспадыня простай лесніковай хаты сямейнікам на сняданак? Дзежка цеста, з якога выпякаліся блінцы на ўсю немалую сям'ю. Да блінцоў верашчака, ды не тая, што прапануюць сёння ў рэстаранах, уладкаваных пад даўніну — з каўбасой, мясам — простая:

*Стаяў асобна ў місцы скорам*
*Сяго-таго для верашчакі.*
*Хоць невялікія прысмакі —*
*Цыбуля, перчык, ліст бабкоў*
*Ды сальца некалькі брускоў,*
*Мука і квас — і ўся прыправа...*

А на другое ганарова выносіла гаспадыня міску тварагу, прыпраўленага смятанай. Сапраўды, па-святочнаму сядалі за такі стол.

Як сцвярджаюць археолагі, посуд з дрэва і кары з'явіўся на нашай тэрыторыі яшчэ ў перыяд верхняга палеаліту — 26—22 тысячы гадоў таму. У перыяд неаліту (V—IV тысячагоддзі да н.э.) гліняны посуд ляпілі ўручную і абпальвалі на вогнішчы. Дзіўна, але факт: праз тысячагоддзі нашы папярэднікі выраблялі посуд, у тым ліку і міскі, якія займалі важкае месца сярод яго, з гліны. Мянялася тэхналогія, крыху ўдасканальваліся формы, аддзелка ў розныя перыяды, але сутнасць заставалася той жа, якую чалавек прыдумаў на зары свайго існавання. Былі і драўляныя вырабы, былі потым металічныя, шкляныя. Але ўсё-такі ў нашых продкаў аснову складала гліна. Асабліва пасля таго, як стаў здабыткам чалавека ганчарны круг. І фарфор (у персідскай мове фегфур), і фаянс (ад назвы італьянскага горада Фаэнца) — усё гэта гліна, розная па сваіх уласцівасцях і рознага спосабу апрацоўкі. Помніце, у камедыі «Каўказская палонніца» таварыш Саахаў слухае пад дзвярыма, як гэта самая палонніца разбівае яго шыкоўны сервіз на дванаццаць ці болей там персон. Шкада — каштоўная рэч. Але калі ў маёй бабулі выслізнула з рук і разбілася звычайная паліваная і ўжо дзе-нідзе шчарбатая міска — ёй было таксама шкада да слёз. Гэта міска служыла ёй яшчэ ў дзявоцтве, захавалася ў час пажару ваеннай пары, з гэтай міскі яна выкарміла дзяцей, ды і нас, унукаў, частавала смачнай поліўкай, камамі.

Вялікую талерку называюць яшчэ місай. У такім посудзе гатуюць да стала ежу для вялікай колькасці людзей, прыкладам, вінегрэт ці яшчэ які салат, як кажа адзін знаёмы мой дзядзька — «вотруб'е чалавечае». А вось у Янкі Брыля. Ён перадае расказ старога дзядзькі аб тым, як у 1905 годзе князь Мірскі ў Міры сабраў усіх міран каля замка, частаваў гарэлкай, былі розныя забаўкі.

*«У вялікія місы, — яны ў горадзе называюцца таз, — наліта поўнень-ка вады і на дно насыпана грошай. Па капейцы, па пяць і па грыўні. І трэба, рукі назад залажыўшы, губамі грошы тыя даставаць. Колькі дастанеш — твае. Я не палез, я толькі пазіраў. Балбочуць людзі, мызаю ў вадзе, аж да вушэй у тых тазах. Тут і ўдушыцца можна, захлынуцца самахоць!..»*

А ў старой беларускай мове рускаму «тазу» былі наскія адпаведнікі — лаганка, лажка. У ім можна было не толькі гатаваць, але і немаўляці памыць, дробныя рэчы праць. А рускаму «падносу» адпавядала наша «талерніца».

Талерка — меншая за міску ёмістасць, больш далікатная. Паходзіць ад нямецкага Teller. Сёння, сядаючы за стол, мы проста не можам абысціся без талеркі ці талерачкі. Але ёсць жа яшчэ і Taler — старажытная нямецкая манета. Аднакаранёвыя словы. А талеркі яшчэ і ўдарны музычны інструмент. Талерачкі — мішэні ў ціры. Можна і апынуцца не ў сваёй талерцы, страціць душэўны спакой, раўнавагу.

Сподак яшчэ меншы за міску памерамі. Са сподкаў любілі піць раней чай расіяне. У нашых мясцінах такой завядзёнкі не было. Ды і чай лічыўся не вясковым, панскім напоем. Нашы бацькі аддавалі перавагу раўгені, малаку, квасу, бярозавіку ці кляновіку.

І ў місцы, і ў чыгунку, і ў салдацкім кацялку ёсць спод, па якім так рашуча скрабуць лыжкі, дастаючы рэшткі стравы. У нашым юнацтве за сталом не елі з адной міскі, былі ўжо кожнаму талеркі. Але калі старшакласнікамі хадзілі мы ў паходы, то не бралі з сабою персанальнага посуду. Бралі вялікія міскі на некалькі чалавек (навошта цягаць з сабою лішняе). І суп, кашу, калі ўдасца і юху сёрбалі дружна па некалькі чалавек з аднаго посуду. Так і смачней атрымлівалася, ды і гідлівасці ні ў кога не праяўлялася. Спатрэбілася гэта ў час службы ў войску. Там на палігон суп ды кашу прывозілі ў вялікіх паходных кухнях. А вось салдацкіх кацялкоў катастрафічна не хапала, асабліва маладым пехацінцам, першагодкам. Да аднаго кацялка прысуседжвалася па чатыры-пяць чалавек. Бывала, што з гэтых пяці нехта дома прызвычаіўся есці плоў увогуле рукамі, а некаму ў сталічнай кватэры маці накладала страву на талерку з сямейнага фарфору. Ды і памыцца перад абедам не было дзе. Але абвыкаліся. Дзе-дзе, але ў час абеду — прыняцця ежы па-вайсковаму — спрэчак і канфліктаў не ўзнікала. Тут таксама было разуменне жыццёвай неабходнасці падсілкавацца, у любых умовах і тым, што даюць, інакш кулямёт па палігоне не пацягнеш.

Зрэдчас, але і сёння выязджаем мы на прыроду, наладжваем застоллі ля дач і вясковых хат, пераробленых у дачы. Жанчыны практычныя і крыху ленаватыя. Каб не займацца потым мыццём посуду, купляюць аднаразовы, з пластмасы. Безумоўна, выгадна: ён лёгкі, а, галоўнае, паеўшы, сабраў ды выкінуў у сметнік. Але не той, не той смак у такой ядзе. Я па-ранейшаму прыхільнік гліянай міскі.

**Алесь КАСЦЕНЬ.**

Глядзіце!

# СМЯЯЦЦА НЕ ВАРТА КРЫТЫКАВАЦЬ

**Больш як год таму ў Беларусі ўтварылася сваё падраздзяленне артыстаў сатырычнага жанру новага пакалення — «Камедзі Клаб». А спрэчкі, ці смешныя жарты і сцэнкі гэтых маладых людзей, або проста пошлыя, дагэтуль не сціхаюць. Падобна на тое, што ў бліжэйшы час нават разгарацца з новай сілай — пры актыўным удзеле мінскіх рэзідэнтаў «Камедзі» ўбачыў свет незвычайны праект — арт-вадэвіль «У рэжыме онлайн». Яго закрытая прэм'ера адбылася днямі ў Малой зале Палаца Рэспублікі.**

Паказ абяцаўся інтэрактыўным, поўным сюрпрызаў для гледачоў і кантактавання з імі ж, гледачамі. Улічваючы, што на прэм'еры выпадковай публікі амаль і не было — ці то сябры і знаёмыя акцёраў, ці самі рэзідэнты, не занятыя ў пастаноўцы, ці беларускія «зоркі» кшталту прадзюсара Максіма Алейнікава і спявачкі Галіны Шышковай — да спецыфічнага гумару «Камедзі» гэтыя людзі прызвычаіліся. А вось журналісты доўга спрабавалі зразумець, навошта іх сюды паклікалі — бо прэс-канферэнцыя праходзіла ў самым што ні ёсць оф-лайне. Дзве трэція адведзенага часу гурт «Лепрыконсы» адстройваў інструменты, надалей удзельнікі прэс-канферэнцыі настроіліся на нейкую сваю хвалю, куды пытанні прэсы проста не даходзілі.

— Навошта ўвогуле быў прыдуманы падобны праект, хіба рэзідэнтам «Камедзі Клаб» не хапае сваёй пляцоўкі і прасторы? — пацікавіліся мы ў Віктара Лабковіча, генеральнага прадзюсара «Comedy Club Minsk Style».

